Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і Мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ПЯТНІЦА, 7 жніўня 1981 г. ⊙ № 32 (3078) ⊙ Выходзіць з 1932 г. ⊙ Цана 8 кап.



Кандыдат у члены Мінскага гаркома КПБ, друкар Мінскага паліграфічнага камбіната імя Якуба Коласа Міхаіл Стаін.

Рытмы працоўнага дня.

Фота Ул. КРУКА.

СКАРЫНІНСКІХ СПРАЎ ПРАДАЎЖАЛЬНІКІ

25 гадоў назад першую прадукцыю выпусціў Мінскі паліграфічны камбінат імя Якуба КОЛАСА

Кніга... Яе вартасць і вага, цікавасць і значэнне для чытача вызначаюцца найперш, бадай, прозвішчам аўтара. Ну, яшчэ мо яе мастацкім афармленнем.

Аднак аўтары — аўтарамі, мастакі — мастакамі, але ж рукапіс, адрэдагаваны і праілюстраваны, адразу кнігай не стане. Патрэбна яшчэ праца наборшчыкаў, друкароў, брашуроўшчыкаў — людзей многіх і многіх спецыяльнасцей, дзякуючы якім кніга выходзіць у свет. Людзі гэтыя працуюць на паліграфічных камбінатах.

Прадчуваю ўсмешку некаторых чытачоў. Вядома ж, кніга друкуецца не ў пякарні ці на аўтамабільным заводзе! Але прызнаемся шчыра: ці многія з нас, набыўшы кнігу, звярталі ўвагу на тое, дзе яна надрукавана? Вельмі і вельмі нямногія. А шкада, бо прадукцыя пэўных камбінатаў гаворыць, як кажуць, сама за сябе. Адны могуць «дазволіць» выпусціць кнігу з пакамячанымі старонкамі, іншыя — з вокладкай, якая ледзь трымаецца. А ёсць такія, дзе кожнае выданне — бездакорнае, прыгожае, маляўнічае, не кніга, а падарунак. Да такіх камбінатаў належыць і наш паліграфічны імя Я. Коласа.

Пашанцавала беларускім пісьменнікам, што на ўсіх іхніх кніжках, выпушчаных выдавецтвамі «Мастацкая літаратура» і «Юнацтва», пасля ўсіх выхадных дадзеных у самым канцы стаіць: «Паліграфічны камбінат імя Я. Коласа» і яго адрас: «220005, Мінск, Чырвоная, 23». Адсюль, з камбіната, і выпраўляюцца ў вялікую дарогу да чытачоў беларускія кнігі. Выпраўляюцца ўжо дваццаць пяць гадоў!

Пачыналася ўсё ў 1956 годзе, калі непадалёк ад былой Камароўкі ў беларускай сталіцы закончылася ўзвядзенне будынкаў камбіната, якому неўзабаве было прысвоена імя народнага песняра Якуба Коласа. Пачыналася, як звычайна бывае ў падобных выпадках, з таго, што вядучыя паліграфічныя прадпрыемствы краіны аказалі мінчанам дапамогу. У першую чаргу адгукнуліся ленінградскія друкарні — імя Івана Фёдарава, «Друкарскі двор», а таксама фабрыка афсетнага друку № 1 і іншыя. Дапамагалі кадрамі, абсталяваннем, камандзіравалі вопытных спецыялістаў. І неўзабаве ў свет выйшла першая кніга, пазначаная зноскай: «Мінскі паліграфічны камбінат». Гэта быў дапаможнік для настаўнікаў — «Практычныя задачы па матэматыцы». Як адрозніваецца ён ад сённяшніх кніг! Мяккая вокладка, шараватая папера, не сказаць каб дужа выразны шрыфт. Што ж, то быў пачатак.

Ужо тады было вядома, што паліграфічны камбінат у асноўным будзе выпускаць мастацкую літаратуру. Неўзабаве і з'явілася тут навінка — зборнік апавяданняў Я. Коласа, пісьменніка, імя якога было прысвоена прадпрыемству...

На камбінаце з гонарам паказваюць дзве кнігі, асабліва дарагія тут кожнаму. Тую першую, якая адрасавалася настаўнікам, і першы том Кароткай Беларускай Савецкай Энцыклапедыі. Паміж імі — шлях у дваццаць тры гады. Але гэтая дата — «не круглая». Куды больш значная другая. Том энцыклапедыі стаў мільярдным экземплярам, які быў выпушчаны прадпрыемствам. Цяпер лічба гэтая пабольшала яшчэ на 50 мільёнаў. Ды і як не пабольшаць ёй, калі штодзённа з шасці паточна-механізаваных ліній камбіната сыходзіць 200 тысяч экземпляраў кніг і брашур?!

Дзякуючы мінскім паліграфістам, беларуская кніга на розных конкурсах, аглядах, выстаўках, кірмашах смела спаборнічае з іншымі выданнямі. Так, у свой час паэма «Новая зямля» Я. Коласа на сусветнай выстаўцы ў Лейпцыгу была ўдастоена сярэбранага медаля і Ганаровага дыплома. Усяго ж за дваццаць пяць гадоў рознымі дыпломамі, граматамі адзначана больш як сто выданняў, а само прадпрыемства за высокае паліграфічнае афармленне і мастацкае выкананне кніг прадстаўлялася на ВДНГ СССР, дзе атрымала сярэбраны медаль.

Поспехі гэтыя — заслуга людзей, якія па-сапраўднаму любяць сваю справу. І тых, што аддалі абранай спецыяльнасці не адзін год жыцця, і моладзі, што прыходзіць на камбінат пасля заканчэння паліграфічнага вучылішча. Працаўнікі камбіната ўсе любяць кнігу, таму і імкнуцца працаваць так, каб не сорамна было за сваю работу, каб пры выпадку, убачыўшы ў руках знаёмага раман ці зборнік вершаў, можна было з гонарам сказаць: «На нашым камбінаце надрукавана».

Гаварыць так даўно маюць права члены брыгады бясшвейнага мацавання, якую ўзначальваюць Віктар Шпак і Яўгенія Стасілевіч. Працуюць яны паўдарнаму, мінулую пяцігодку выканалі за чатыры гады і пяць месяцаў, і цяпер узялі ўпэўненыя тэмпы. Якасць работы выдатная, выкананне вытворчых заданняў — на 120 працэнтаў. Толькі добрае можна сказаць і пра ўчастак, дзе працуе калектыў пад кіраўніцтвам Калісіі Памазанавай: 115 і больш працэнтаў дзённай выпрацоўкі.

Гонар камбіната — швачка Р. Квяткоўская. Ударнік камуністычнай працы, яна асабістую пяцігодку выканала за чатыры гады, неаднаразова выходзіла пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва. Моладзь прадпрыемства раўняецца таксама на кавалера ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкара М. Піскуна, наборшчыцу Л. Касцевіч, якая ўзнагароджана ордэнам «Знак Пашаны», кавалера ордэна Працоўнай Славы III ступені, кандыдата ў члены Мінскага гаркома КПБ друкара М. Стаіна.

Біяграфія гэтага чалавека, па сутнасці, і біяграфія прадпрыемства. Міхаіл Цімафеевіч прыйшоў сюды, калі паліграфкамбінат толькі пачынаў працаваць.

— Люблю сваю работу,— прызнаецца М. Стаін,— люблю кнігі. Нейкае асаблівае задавальненне атрымліваеш ад таго, што далучаны да іх нараджэння, сам становішся адным з першых чытачоў. Так і хочацца часам узяць у рукі свежы адбітак, прабегчы па ім вачамі...

(Працяг на стар. 2).

АД ПЯТНІЦЫ ДА ПЯТНІЦЫ

ВЫСОКАЕ ДАВЕР'Е

Як паведамлялася ўжо, на 30 жніўня назначаны выбары дэпутата ў Вярхоўны Савет БССР па Белавушскай выбарчай акрузе № 208.

У калгасе «Перамога» Столінскага раёна 4 жніўня адбыўся перадвыбарны сход.

Старшыня калгаса М. М. Гарошка, які выступіў на сходзе, прапанаваў вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР па Белавушскай выбарчай акрузе кандыдата ў члены Палітбюро ЦК КПСС, першага сакратара ЦК Кампартыі Беларусі Ціхана Якаўлевіча Кісялёва.

Гэту прапанову аднадушна падтрымалі даярка М. М. Новік, галоўны інжынер В. А. Луцкі, трактарыст В. Р. Сенькавец і іншыя. Удзельнікі сходу аднагалосна пастанавілі вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР па Белавушскай выбарчай акрузе кандыдата ў члены Палітбюро ЦК КПСС, першага сакратара ЦК КПБ Ц. Я. Кісялёва.

Перадвыбарны сход адбыўся таксама ў калгасе імя Чапаева Столінскага раёна. Яго ўдзельнікі аднадушна вырашылі вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР па Белавушскай выбарчай акрузе Ц. Я. Кісялёва.

Вылучэнне Ц. Я. Кісялёва кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР падтрымалі калектывы калгасаў «Рассвет» і «Сцяг камунізму».

БЕЛТА.

АБМЕН ВЫСТАЎКАМІ

Творчую справаздачу перад гамяльчанамі трымаюць мастакі Чарнігаўшчыны. Адкрытая тут выстаўка вядучых майстроў пэндзля суседняй спаборнічаючай вобласці Украіны ўключае каля 70 работ розных жанраў.

Адна з вядучых тэм экспазіцыі — людзі працы. Ёй прысвечаны лепшыя работы Э. Крыпа — партрэт В. Каржа, «Ляакна», В. Трубнікава — «Арнітолаг», палотны В. Ямца, Е. Паўлава і іншых жывапісцаў. Шырока прадстаўлены пейзаж.

У гэтыя ж дні ў Чарнігаве выстаўлены работы мастакоў Гомеля. Творчыя справаздачы, абмен выстаўкамі сталі ўжо традыцыяй.

БЕЛТА.

ТВОРЧАСЦЬ ЮНЫХ

«36 гадоў без вайны», «Ружовы сон», «Планета кентаўраў» і іншыя жывапісныя работы юных мастакоў можна ўбачыць на выстаўцы, якая адкрылася ў Віцебску. У экспазіцыі прадстаўлены таксама акварэлі, графіка, габелены, кераміка. Цікавы раздзел дызайна. З захапленнем разглядаюць наведвальнікі прыгожых робатаў, машыны, самалеты, іншыя мадэлі.

Аўтары гэтых твораў — навучэнцы Віцебскай мастацкай школы № 1.

ПЕРШЫ КАНЦЭРТ

Ансамбль народных інструментаў, створаны ў Запрудскім сельскім клубе Глыбоцкага раёна, выступіў з першым канцэртам. У ім прагучалі народныя мелодыі, песні сучасных беларускіх кампазітараў.

Калектыў выступае па вечарах у суседніх вёсках і на палявых станах у час абедзеннага перапынку. Самадзейныя музыканты рыхтуюць новую праграму, прэм'ера якой прымяркоўваецца да свята дажынак.

Фота А. ПЕРАХОДА. (БЕЛТА).

Іван ЛЕТКА

БЕРАСТАВІЦКІ БАЛЬШАК

М. М. РЫБАКУ,
сакратару РК КПБ.

Спяшае «Волга»
па шашы.
Мігцяць зялёныя тунелі.
Камбайнаў гул
і посвіст шын
вяшчаюць нам —
жыты паспелі.
Са мной райкома
сакратар,
ён заклапочана шчасліва,
мажны,
руплівы гаспадар,
у моры спелага разліву.
Усё заўважыць
востры зрок
працаўніка і хлебароба,
дзе зерне ўпала на пясок,
а дзе з ляноты недаробак.
Камусьці будзе наганяй,
другому — шчырая
пашана.
А ну, шафёр,
давай!
Давай!
За паваротам Масаляны.
А там вядзе
«па праўдзе» бой
работны люд
ад золку дбайна.
На цёплых пожнях
за сабой
стагуюць воблакі
камбайны.
Сабралася пагаварыць
гарачая братва
у робах.
Дзе добры лад,
дзе план гарыць,
пра намалот
і пра заробак.
І зноў гудзе,
і зноў гурчыць!
Заходзіцца
ад шчасця сэрца!..
І будзе сніцца уначы,
як жыта
ў бункеры ліецца.

ЁСЦЬ АНСАМБЛЬ — «ЗОРКА»

Народны харэаграфічны ансамбль «Зорка» мінскіх тэкстыльшчыкаў названы так у гонар вядомага беларускага паэта Максіма Багдановіча. Назва яго была падказана вершам «Зорка Венера», што даўно ўжо стаў песняй, якую любяць у народзе. Удзельнікі ансамбля пад яе мелодыю выконваюць і аднайменны танец.

Ансамбль «Зорка» выступіў нядаўна ў Мінску на летняй эстрадзе ў парку імя Чалюскінцаў.

Я. САДОУСКІ.

КУПАЛАЎЦЫ НА РАДЗІМЕ ТАЛАША

Летась упершыню група артыстаў Беларускага тэатра імя Я. Купалы прыняла ўдзел у культурным абслугоўванні працаўнікоў Петрыкаўскага раёна, паказаўшы ім спектакль па трагікамедыі А. Макаёнка «Трыбунал». І вось купалаўцы зноў прыехалі на радзіму дзеда Талаша, прывёзшы з сабой славутую «Паўлінку». Гарачымі апладысментамі сустракалі народную артыстку СССР Г. Макараву, народных артыстаў рэспублікі Г. Аўсянікава, А. Памазана, А. Дзянісава і іншых хлебаробы калгасаў імя Жданава і «Бальшавік», саўгасаў «Навасёлкі», «Галубіцкі», «Петрыкаўскі» і іншых гаспадарак раёна.

А. ЛІСІЦКІ.

«КЛУБ І МОЛАДЗЬ»

Навукова - практычная канферэнцыя «Клуб і моладзь», арганізаваная ўпраўленнем культуры Брэсцкага аблвыканкома і абкомам камсамола, два дні працягвала сваю работу ў Палацы культуры Баранавіцкага баваўнянага аб'яднання імя ЛКСМБ. Яе ўдзельнікі, сакратары гарадскіх і раённых камітэтаў камсамола, дырэктары і метадысты гарадскіх і раённых дамоў культуры абмеркавалі праблемы, звязаныя з павышэннем эфектыўнасці работы клубных устаноў як дзейсных цэнтраў камуністычнага выхавання моладзі, азнаёміліся з практыкай работы баранавіцкіх культработнікаў. Сваю праграму паказалі ўдзельнікі дыскатэкі Брэсцкага домабудаўнічага камбіната.

М. МІКАЛАЕУ.

МУЗЫ... ЗА ПАРТАМІ

Па рашэнні выканкома Брэсцкага абласнога Савета народных дэпутатаў у Століне з першага верасня адкрываецца школа мастацтваў. На двух аддзяленнях — музычным і мастацкім — каля 150 дзяцей рабочых і служачых будуць авалодваць майстэрствам ігры на разнастайных народных і духавых інструментах, вывучаць тэхніку малюнка, жывапісу, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, законы мастацкай перспектывы.

Першая такая школа ўжо працуе ў вёсцы Моталь Іванаўскага раёна.

М. КАЗЛОВІЧ.

НА СЦЭНЕ — «НА РОСТАНЯХ»

Слонімскі народны тэатр паставіў спектакль па п'есе «Навальніца будзе» Алеся Звонака, якая напісана па матывах трылогіі Якуба Коласа «На ростанях».

Рэжысёр спектакля — заслужаны работнік культуры БССР М. Варвашэвіч. Вобраз Андрэя Лабановіча стварыў Анатоль Цярэнін, у ролі Аксёна Каля выступіў Уладзімір Гардзіеўскі. Тацяна Натарава выканала ролю Ядвісі.

С. ЧЫГРЫН.

НА ПРЫКЛАДАХ ГЕРАІЧНАГА

Музей баявой славы сярэдняй школы № 3, што знаходзіцца ў Горках Магілёўскай вобласці, расказвае аб гераічных справах народных мсціўцаў і воінаў 42-й Смаленскай і 70-й дывізій, якія вызвалялі раён ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Пад кіраўніцтвам былой партызанкі брыгады «Звязда» В. Гулевіч юнымі следапытамі сабраны багаты і цікавы матэрыял.

Школьнікі пабывалі на месцы дыслакацыі брыгады, даведаліся аб расстрэле 50 мірных жыхароў вёскі Ракоткі, аб гераічнай гібелі піянера Жэні Вераб'ёва. З хваляваннем слухалі яны расказы былых народных мсціўцаў Д. Войстрава, А. Васільева і іншых удзельнікаў партызанскага руху аб змаганні з ворагам. Усё гэта знайшло адлюстраванне на стэндах музея, які дапамагае педагогам на прыкладах гераічнага выхоўваць падрастаючае пакаленне.

В. ГАЛАВАЧОУ.

ВЕЧАРАМ У ГАСЦІНАЙ...

Музычна-мастацкая гасціная адкрылася ў Дабрасялецкім сельскім Доме культуры Зэльвенскага раёна. Першы вечар у ёй быў прысвечаны народнаму прыкладному мастацтву і паэзіі. Такая ж гасціная нядаўна пачала працаваць у Бародзіцкім цэнтральным Доме культуры.

Іх саветы прапануюць вяскоўцам сустрэчы з пісьменнікамі, артыстамі, мастакамі, вечары музыкі, тэатра, дыскапраграмы.

Рыхтуюцца да адкрыцця гасціныя ў Снежненскім і Хостаўскім сельскіх клубах, у Востраўскім Доме культуры.

СКАРЫНІНСКІХ СПРАЎ ПРАДАЎЖАЛЬНІКІ

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

З кожным годам павышаецца на камбінаце культура вытворчасці, павялічваюцца яго магутнасці. І ўсё больш увагі ўдзяляецца задавальненню культурных запатрабаванняў працаўнікоў. Многія рабочыя з задавальненнем наведваюць бібліятэку, у якой багаты выбар літаратуры, ажыўлена бывае і ў клубе камбіната, калі там наладжваюцца лекцыі ці даклады, адбываюцца канцэрты мастацкай самадзейнасці. Асабліва шматлюдна тады, калі выступаюць «свае артысты» — удзельнікі вакальнага ці танцавальнага гурткоў, члены агітацыйна-мастацкай брыгады «Пераплётка», калектыў якой добра ведаюць і сельскія працаўнікі, у першую чаргу ў калгасе «17 верасня» Мядзельскага раёна, у гаспадарцы, з якой паліграфкамбінат падтрымлівае цесныя шэфскія сувязі.

...Калі мы наведалі камбінат, быў звычайны рабочы дзень. Шуму, так характэрнага для большасці такіх прадпрыемстваў, тут не чуваць, ды і канвеера, на якім можна прасачыць увесь вытворчы працэс ад пачатку набору рукапісу да выхаду новай кнігі, няма. Але, пахадзіўшы па цэхах, наведаўшы ўчастак за ўчасткам, прыемна было бачыць, як звычайныя лісты паперы паступова ператвараюцца ў аркушы, як іх потым разразаюць, брашуруюць. На вачах станавіліся кнігай «Вокны без фіранак», апавяданні маладога пісьменніка Уладзіслава Рубанава, на чарзе быў зборнік прозы Міхася Клебановіча «Ранішняе сонца» — яны выходзяць у серыі «Першая кніга празаіка», якую выпускае выдавецтва «Мастацкая літаратура». Рабочы дзень толькі пачынаўся, і абяцаў ён быць шчаслівым і для іншых аўтараў, чые кнігі павінны былі ўбачыць свет сёння.

Швачка Р. КВЯТКОУСКАЯ. Фота Ул. КРУКА.

А яшчэ ўспомнілася — ёсць жа дзіўныя супадзенні! Дваццаць пяць гадоў прайшло з таго часу, калі на Мінскім паліграфічным камбінаце была аддрукавана першая кніга. Кінем жа позірк назад на 464 гады, і прыгадаем, што амаль у гэтыя ж дні, 6 жніўня 1517 года, у Празе пабачыла свет першая беларуская кніга — вядомы «Псалтыр» Францыска Скарыны. Справа, пачатая легендарным першадрукаром, у надзейных руках.

А. ВІШНЕУСКІ.

НАД ІРТЫШОМ—БЕЛАРУСКАЯ ПЕСНЯ

Студэнцкая агітацыйна-мастацкая брыгада Мінскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута накіравана для культурнага абслугоўвання працаўнікоў ударных будоўляў Сібіры. Маршрут калектыву праляжа праз басейн ракі Іртыш: прыбярэжныя прадпрыемствы і гаспадаркі, гарады Табольск, Ханты-Мансійск, Сургут, Ніжневартаўск, Надым і іншыя. Гастролі працягнуцца трыццаць дзён. У саставе брыгады, якой кіруе кандыдат медыцынскіх навук М. Кеўра, 12 чалавек.

Агітбрыгада «Панацэя» створана сем гадоў назад. За гэты час адбыліся сотні выступленняў перад хлебаробамі Міншчыны, рабочымі сталічных прадпрыемстваў, студэнтамі.

Сёлета брыгадзе прысвоена званне «народная».

У. КОБРЫН.

У ФАЕ КІНАТЭАТРА

«Купалаўскім мясцінам прысвячаецца» — так называецца арганізаваная Міністэрствам культуры БССР і літаратурным музеем Я. Купалы выстаўка ў фае кінатэатра «Партызан» беларускай сталіцы.

Экспазіцыя да 100-годдзя з дня нараджэння народнага паэта Беларусі змяшчае каля 50 мастацкіх фотаздымкаў і карцін, тэматычную інфармацыю, вершы і выказванні літаратараў пра Я. Купалу.

Адначасова тут прадаўжае дэманстравацца фотавыстаўка «Насустрач 100-годдзю з дня нараджэння Я. Коласа».

В. АСТРЫНСКІ.

У АРКЕСТРЫ—КУРСАНТЫ

Пяць гадоў назад у Мінскай вышэйшай школе міліцыі з'явілася аб'ява, якая запрашала на першую рэпетыцыю эстраднага аркестра. Жадаючых займацца аказалася шмат. За гэты час дадзена звыш трохсот канцэртаў. Курсанты выступаюць на прадпрыемствах, у арганізацыях, навучальных установах горада-героя Мінска, у калгасах і саўгасах вобласці.

Актыўны ўдзел аркестр прымаў у культурнай праграме «Алімпіяда-80». У красавіку сёлетняга года ён удастоены звання лаўрэата Рэспубліканскага агляду-конкурсу студэнцкіх вакальна-інструментальных і эстрадных аркестраў, які прысвячаўся XXVI з'езду КПСС. Яму ўручаны дыплом першай ступені.

У рэпертуары калектыву — класіка, беларускія народныя песні і п'есы на тэмы Вялікай Айчыннай вайны, музыка савецкіх кампазітараў. Кіруе аркестрам выпускнік Мінскага музычнага вучылішча А. Ларыёнаў.

За актыўную дзейнасць па камуністычным выхаванні і культурнае абслугоўванне насельніцтва, высокі ідэйна-мастацкі ўзровень і выканаўчае майстэрства калектыў прадстаўлены да прысвоєння звання «народны».

У. ВЕРАСКОЎ.

«ПЕЎНІКІ» АДПАЧЫВАЮЦЬ

З песняй не толькі працаваць, але і адпачываць карысна. Гэта пацвердзяць маленькія спевакі ўзорнага хору хлопчыкаў «Пеўнікі» Брэсцкай музычнай школы. Яны праводзяць летнія канікулы ў спецыялізаваным харавым лагеры, створаным Брэсцкім аблсаўпрофам у Кобрынскім раёне. Разам з мастацкім кіраўніком калектыву Л. Карабейнікавай дзеці ўдзельнічаюць у міжлагерных мерапрыемствах, купаюцца ў Мухаўцы і, вядома, рэпеціруюць, каб вярнуцца ў горад з новай праграмай.

А недалёка чуваць танцавальныя рытмы. Гэта рэпеціруюць хлопчыкі і дзяўчынкі з узорнага танцавальнага калектыву «Расінка» Брэсцкага электрамеханічнага завода, якія таксама ўсім калектывам прыехалі ў лагер, каб набрацца сіл для вучобы і будучых канцэртаў.

К. МАЛЕЦ.

«ТРЫ МЯДЗВЕДЗІ» Ў ДАРОЗЕ

Прэм'ерай адразу двух спектакляў — «Дванаццаць месяцаў» і «Тры мядзведзі» — заявіў аб сваім нараджэнні дзіцячы тэатральны калектыў, створаны пры Жабінкаўскім раённым Доме культуры. Першымі гледачамі былі школьнікі райцэнтра.

Юныя артысты выступаюць у піянерскіх лагерах, дзіцячых садах і рыхтуюць чарговую прэм'еру — спектакль «Беласнежка і сем гномаў».

НА СЛУЦКАЙ ЗЯМЛІ

Сярод часцей і злучэнняў, якія былі ўдастоены ганаровых званняў на беларускай зямлі, і 91-ы асобны Слуцкі Чырванасцяжны інжынерна-сапёрны батальён. Пра баявы шлях яго, пра лепшых сапёраў, дзесяць сярод якіх (у тым ліку і камандзір батальёна Віктар Лявонавіч Гогалеў) былі ўдастоены ганаровага звання Героя Савецкага Саюза, расказвае ў дакументальнай аповесці «Дзесятая зорка батальёна» ваенны журналіст Яфрэм Соркін.

Кніга гэтая, што выйшла ў выдавецтве ДТСААФ СССР, узнаўляе найбольш яркія старонкі «біяграфіі» падраздзялення, сярод якіх баі за вызваленне беларускай зямлі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.«На галоўным кірунку» — так называецца раздзел, у якім гаворыцца аб справах сапёраў у Беларусі, аб вызваленні Слуцка, пасля якога батальён і стаў называцца «Слуцкім».

Прадмову да кнігі напісаў Герой Савецкага Саюза Маршал Савецкага Саюза П. Баціцкі.

АД КАМІСІІ ПА ЛІТАРАТУРНАЙ СПАДЧЫНЕ П. БРОЎКІ

Камісія звяртаецца да пісьменнікаў, журналістаў, прадстаўнікоў грамадскасці, да ўсіх тых, хто сябраваў з Петрусём Усцінавічам Броўкам ці меў магчымасць працаваць з ім альбо сустракацца, з просьбай: матэрыялы, звязаныя з жыццём паэта і яго творчасцю—здымкі розных гадоў, пісьмы, рукапісы, кнігі з аўтографамі.—дасылаць на адрас: Мінск, вул. Карла Маркса, 30, кв. 4. Літаратурны музей Петруся Броўкі.

ВЕЧАР Івана ШАМЯКІНА Ў ДОБРУШЫ

Бадай, ніхто так не цікавіцца творчасцю народнага пісьменніка Беларусі, Героя Сацыялістычнай Працы Івана Шамякіна, як жыхары ардэнаноснай Гомельшчыны. І гэта зразумела. На зямлі, дзе пісьменнік нарадзіўся і вырас, жывуць прататыпы герояў многіх яго апавяданняў, аповесцей і раманаў, сюды часта прыязджае ён, каб набрацца новых уражанняў, сустрэцца з тымі, хто мужна змагаўся з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, а цяпер паказвае прыклады працоўнага гераізму, уносячы ўклад у пабудову камуністычнага грамадства.

Днямі Іван Пятровіч гасцяваў у Добрушскім раёне, на зямлі свайго маленства. Пісьменнік прыехаў сюды, каб сустрэцца з чытачамі: і даўнімі, хто ведае яго яшчэ па першых кнігах, і тымі, хто палюбіў яго нядаўнія раманы «Атланты і карыятыды», «Вазьму твой боль», першую кнігу эпічнага палатна «Петраград — Брэст», што друкавалася сёлета ў часопісе «Полымя».

У Палацы культуры Добрушскай папяровай фабрыкі адбыўся творчы вечар. Адкрыў яго першы сакратар райкома партыі С. Геркусаў. Ён расказаў пра жыццё І. Шамякіна, пра яго творчасць, якая карыстаецца папулярнасцю не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі.

— Асабліва ж,— гаварыў Сяргей Андрэевіч,— уважліва сочым за яго творчасцю мы, землякі пісьменніка. Яго творы блізкія нам, у іх мы знаходзім адказы на пытанні, якія нас хвалююць і непакояць, яны вучаць нас жыць, любіць Радзіму, быць адданымі справе партыі, справе Леніна, справе камунізму.

Пад апладысменты дарагому госцю ўручаецца хлеб-соль, спечаны з зерня новага ўраджаю, вырашчанага землякамі ў першы год адзінаццатай пяцігодкі.

Пасля да мікрафона падыходзяць настаўніцы Э. Махначова і М. Соцкая, старшы інжынер папяровай фабрыкі Е. Шымковіч, дырэктар Цэнтральнай гарадской бібліятэкі Н. Шаблоўская... Яны ўспамінаюць любімыя творы пісьменніка, прыгадваюць яго герояў, расказваюць, як кнігі І. Шамякіна ўплываюць на выхаванне савецкіх людзей, дапамагаюць ім выпрацоўваць актыўную жыццёвую пазіцыю, выказваюць падзяку земляку за яго чуйнасць да праблем сучаснасці, за ўвагу да ўнутранага свету савецкага чалавека, за ўменне ў кожным творы ўзнімаць надзённыя пытанні нашага паўсядзённага жыцця.

На вечар І. Шамякіна прыехалі госці з суседніх абласцей — Бранскай і Чарнігаўскай. Сакратары Клімаўскага РК КПСС А. Філатава, Гараднянскага РК КПУ Г. Лабада і супрацоўнік Гараднянскай раённай газеты І. Дудко таксама падзяліліся думкамі пра творчасць пісьменніка, гаварылі аб папулярнасці, якой карыстаюцца кнігі І. Шамякіна ў чытачоў Расійскай Федэрацыі і Украіны.

З радасцю сустрэлі прысутныя выступленне самога Івана Пятровіча. Ён расказаў аб жыццёвым і творчым шляху, падзяліўся задумамі на бліжэйшы час, адказаў на шматлікія пытанні...

У заключэнне вечара яго ўдзельнікі паглядзелі мастацкі фільм «Гандлярка і паэт», а таксама дакументальную стужку пра самога І. Шамякіна.

А. МЯЛЬНІЦКІ.

ВЫЯЗНЫЯ СПЕКТАКЛІ

Дзесяць дзён гастралявалі купалаўцы ў Лідзе і раёне. Яны паказалі спектаклі сельскім гледачам і працаўнікам торфабрыкетнага завода «Дзітва».

П. ЛІДЗІН.

ІНТЭРВ'Ю Ў НУМАР

ПЕРАД НОВЫМ СЕЗОНАМ

Гэты будынак, што знаходзіцца ў самым цэнтры беларускай сталіцы, па Ленінскім праспекце, добра ведаюць многія. І не толькі акцёры, спевакі, танцоры, студэнты вышэйшых навучальных устаноў. Хоць ён афіцыйна і называецца рэспубліканскі Дом работнікаў мастацтваў, сюды ахвотна заходзяць пісьменнікі, журналісты, часта бываюць рабочыя мінскіх прадпрыемстваў, прыязджаюць сельскія працаўнікі, з якімі падтрымліваюцца цесныя , шэфскія, сяброўскія сувязі.

Пройдзе яшчэ некалькі тыдняў, і ў тэатрах, філармоніях, іншых культасветных установах пачнецца чарговы сезон. Для Дома работнікаў мастацтваў ён будзе шаснаццатым. Мы сустрэліся з яго дырэктарам, заслужаным работнікам культуры БССР Я. І. Гардзеем.

Яўген Іосіфавіч, праўленне Дома работнікаў мастацтва на чале з старшынёй яго, заслужаным артыстам Беларускай ССР П. Дубашынскім, прынялі ўсе захады, каб чарговы сезон быў менавіта творчым, а не зводзіўся толькі да правядзення асобных мерапрыемстваў, каб усе яны былі часцінкай агульнай работы калектыву. Мэтанакіраванай. Змястоўнай. Паслядоўнай.

— Новы сезон,— расказвае Я. Гардзей,— адметны тым, што галоўны накірунак ва ўсёй нашай рабоце — гэта прапаганда гістарычных рашэнняў XXVI з'езда КПСС, а таксама рашэнняў XXIX з'езда Кампартыі Беларусі, якія адкрылі новыя творчыя далягляды перад усімі работнікамі мастацтва і культуры. Вывады, зробленыя ў дакладзе таварыша Леаніда Ільіча Брэжнева, абагульненні, дадзеныя ў важнейшых партыйных дакументах, дапамогуць нам больш глыбока і ўсебакова асэнсоўваць задачы дня, абагульняць поспехі, засяроджваць увагу на надзённых праблемах развіцця мастацтва рэспублікі. Гэта асабліва важна, бо напярэдадні VII з'езда Беларускага тэатральнага аб'яднання, падрыхтоўка да якога надае актыўнасці ў працы.

— І, вядома ж, Яўген Іосіфавіч, шмат планаў звязана з падрыхтоўкай да 60-годдзя ўтварэння СССР, якое спаўняецца ў канцы мінулага года?

— Гэта, безумоўна, адна з самых важнейшых дат у жыцці краіны, усяго савецкага народа. І, канечне, у жыцці творчых работнікаў. Рэпертуар нашых тэатраў уключае ў сябе шмат якія творы драматургаў, прадстаўнікоў многіх літаратур народаў СССР. У той жа час у іншых саюзных рэспубліках з поспехам ідуць спектаклі, пастаўленыя па п'есах беларускіх аўтараў. Ды і творчыя кантакты з кожным годам пашыраюцца. Мяркуем правесці некалькі творчых вечароў, сустрэч пад назвай «Садружнасць мастацтваў нацыянальных рэспублік», на якія будуць запрошаны прадстаўнікі братніх рэспублік.

У маі месяцы наш Дом трымаў творчую справаздачу ў Маскве, якая прайшла з поспехам. У бліжэйшы час плануем такія сустрэчы ў Ленінградзе, Кіеве, Кішынёве. Прадоўжым таксама творчыя справаздачы асобных тэатраў рэспублікі, якія ўжо праходзілі напярэдадні партыйных форумаў і былі цёпла сустрэты, як творчай грамадскасцю, так і гледачамі.

Новае ў нашай рабоце — адкрыццё дзіцячай тэатральнай студыі. Бадай, няма патрэбы шмат гаварыць, наколькі гэта важна з ранніх гадоў далучаць школьнікаў да мастацтва, выхоўваць у іх правільныя густы, любоў да прыгожага.

Будуць працягваць працаваць «Клуб творчай і навуковай моладзі», «Лекторый для творчых работнікаў». Па-ранейшаму адбудзецца шмат юбілейных вечароў, як напрыклад, прысвечаных творчасці народнай артысткі СССР А. Клімавай, народнай артысткі рэспублікі Г. Маркінай і іншых. Пад рубрыкай «Мы іх добра ведалі» правядзём вечар, на якім гаворка пойдзе пра Ігната Буйніцкага, 120 гадоў з дня нараджэння якога спаўняецца сёлета.

...Я. Гардзей расказвае таксама аб выязных канцэртах, аб сустрэчах з працаўнікамі вёскі і рабочымі, аб тэатральных выстаўках, абмеркаваннях спектакляў, творчых дыскусіях. Усё гэта таксама знойдзе належнае месца ў плане работы Дома ў новым сезоне. За яго словамі адчуваецца неспакой, няўрымслівасць па-сапраўднаму ўлюбёнага ў мастацтва чалавека. Карыстаючыся выпадкам, мы шчыра павіншавалі Яўгена Іосіфавіча з шасцідзесяцігоддзем, якое ён адзначыць у гэтыя жнівеньскія дні, і пажадалі новых творчых поспехаў.

М. АНДРЭЕЎ.

ПРАЦУЕ СЕКЦЫЯ

Адбылося пашыранае пасяджэнне бюро секцыі дзіцячай і юнацкай літаратуры СП БССР, на якім былі абмеркаваны рукапісы новых кніг для дзяцей. На пасяджэнне прыйшлі загадчыкі рэдакцый і рэдактары выдавецтва «Юнацтва».

З разглядам рукапісу А. Емяльянава «Лісняты-неслухі», у які, акрамя аднайменнай казкі, увайшлі і загадкі, выступіў С. Шушкевіч. Аповесць А. Галузы «Трафейная сякерка» падрабязна прааналізавала Г. Васілеўская.

У абмеркаванні прынялі ўдзел Э. Агняцвет, А. Васілевіч, М. Гамолка, У. Ліпскі, А. Дзеружынскі, В. Жуковіч, П. Кавалёў, М. Казбярук, Я. Каршукоў.

Гаворка была шчырая і прынцыповая. Аўтарам прапанавана сур'ёзна папрацаваць над рукапісамі.

Сакратар праўлення СП БССР Б. Сачанка зрабіў інфармацыю пра работу Камісіі па дзіцячай і юнацкай літаратуры на VII усесаюзным з'ездзе пісьменнікаў у Маскве.

У рабоце бюро секцыі прыняў удзел старшыня праўлення СП БССР Максім Танк.

АКЦЁР РАСКАЗВАЕ...

Працаўнікі завода электравырабаў і жыхары Ліды сустрэліся з папулярным акцёрам тэатра і кіно Аляксандрам Міхайлавым, які расказаў пра свой жыццёвы і творчы шлях, падзяліўся планамі работы на будучае. Асабліва падрабязна гаварыў ён пра стварэнне вобраза Аляксандра Алёхіна ў фільме «Белы снег Расіі», які затым быў паказаны.

П. МАКАРЭВІЧ.

ДЫПЛОМ ДА МЕДАЛЯ

Дыпломам за высокае майстэрства на міжнародным Прыдунайскім фальклорным фестывалі, які праходзіў у Венгрыі, узнагароджаны ансамбль песні і танца «Спадчына» Маладзечанскага Дома культуры.

Гэта не першая перамога самадзейных артыстаў. На міжнародным фестывалі фальклору ў Бургасе яны ўдастоены вялікага залатога медаля.

На цяперашнім аглядзе, у якім прынялі ўдзел вядомыя калектывы з Балгарыі, Чэхаславакіі, Польшчы, Югаславіі, Турцыі і іншых краін, ансамбль паказаў вакальна - харэаграфічную кампазіцыю «Маладзечанскія вячоркі».

У ходзе фестывалю ўдзельнікі «Спадчыны» пазнаёмілі жыхароў гарадоў Бая, Пакш з беларускімі народнымі песнямі і танцамі.

БЕЛТА.

Гасцямі Мінска быў вакальна-інструментальны ансамбль «Колеры» Херсонскай абласной філармоніі. Сябры з Украіны прывезлі цікавую і разнастайную праграму, у якую ўвайшлі песні савецкіх і замежных кампазітараў, а таксама гумар, канферанс, фельетоны.

На здымку: у час канцэрта. Салістка — лаўрэат рэспубліканскага конкурсу савецкай песні Святлана Гулькевіч.

Фота Ул. КРУКА.

НАВУКА І ЖЫЦЦЁ

НАВУКОВАЯ ТВОРЧАСЦЬ — МАСАВАЯ ПРАФЕСІЯ

ГРЫБКОУСКІ Віктар Паўлавіч, член-карэспандэнт АН БССР, доктар фізіка-матэматычных навук прафесар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР.

В. П. ГРЫБКОЎСКІ,
намеснік старшыні Савета па каардынацыі навуковай дзейнасці АН БССР,
загадчык лабараторыі Інстытута фізікі АН БССР

АНКЕТА «ЛіМа»

Працягваем чарговую публікацыю адказаў на пытанні анкеты «ЛіМа», з якой рэдакцыя звярнулася да вядомых навукоўцаў рэспублікі. Нагадаем пытанні анкеты:

1. Якія буйныя змены адбыліся ў вашай галіне, што наблізілі акадэмічную навуку да патрэб народнай гаспадаркі? Якія перашкоды былі на гэтым шляху?

2. Якую ролю, на вашу думку, адыгрывае навукова-тэхнічная рэвалюцыя ў павышэнні ўзроўню навуковых даследаванняў?

3. Што вы можаце сказаць пра інтэграцыю і дыферэнцыяцыю ў галіне фундаментальных навук?

4. Што такое калектыўная праца ў навуцы?

5. Як уплывае прафесія вучонага на фарміраванне яго духоўнага аблічча?

6. Якую ролю ў жыцці сучаснага вучонага-прыродазнаўца адыгрываюць літаратура і мастацтва? Ці задавальняюць яны толькі патрэбу ў прыгожым, ці да таго ж яшчэ з'яўляюцца арганічнай часткай любога творчага працэсу?

1. Дзесяць гадоў назад, пасля XXIV з'езда КПСС, пачаўся якасна новы этап развіцця савецкай навукі і тэхнікі. Хоць паскарэнню навукова-тэхнічнага прагрэсу ў нашай краіне заўсёды ўдзялялася шмат увагі, на гэтым з'ездзе найбольш востра было пастаўлена пытанне аб неабходнасці значнага павышэння эфектыўнасці даследаванняў і ўмацавання сувязі навукі з вытворчасцю. З'езду папярэднічала прынятая ў верасні 1968 г. пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерапрыемствах па павышэнні эфектыўнасці работы навуковых арганізацый і паскарэнні выкарыстання ў народнай гаспадарцы дасягненняў навукі і тэхнікі».

Ажыццяўленне мерапрыемстваў, прадугледжаных пастановай, прывяло да карэннай рэарганізацыі дзейнасці навуковых устаноў. Значны ўклад у пошукі шляхоў павышэння эфектыўнасці навукі і ўмацавання яе сувязі з вытворчасцю ўнесла Акадэмія навук БССР. Абраны ў 1969 г. новы склад Прэзідыума АН БССР на чале з прэзідэнтам М. А. Барысевічам распрацаваў і здзейсніў шырокую праграму развіцця і перабудовы акадэміі.

З мэтай аснашчэння навуковых устаноў новымі прыборамі і ўстаноўкамі і вырабу эксперыментальных узораў абсталявання, адпрацоўкі новых тэхналагічных працэсаў у АН БССР створана 8 вопытна-канструктарскіх арганізацый, у якіх працуе больш за 5 тысяч чалавек.

Арганізаваны цэнтры калектыўнага выкарыстання унікальных і дарагіх спектральных, трыагенных і рэнтгенаўскіх прыбораў, а таксама электронных мікраскопаў. Доступ у гэтыя цэнтры адкрыты для многіх спецыялістаў рэспублікі. У іх праводзяць вымярэнні і вучоныя іншых саюзных рэспублік.

Пашырана геаграфія акадэмічнай навукі. Ва ўсіх абласных цэнтрах, акрамя Брэста, маюцца інстытуты або аддзяленні інстытутаў АН БССР. Гэта дало магчымасць наблізіць навуку да вытворчасці, палепшыць каардынацыю даследаванняў, якія праводзяцца ў акадэміі, галіновых НДІ і ВНУ, павысіць узровень падрыхтоўкі студэнтаў у перыферыйных ВНУ, прыцягнуць да навуковай дзейнасці новыя кадры з ліку мясцовых спецыялістаў.

Рэзка актывізавалася вынаходніцкая дзейнасць. У апошні час супрацоўнікі акадэміі атрымліваюць каля тысячы аўтарскіх пасведчанняў на вынаходніцтва штогод. Пачаўся продаж ліцэнзій у замежныя краіны.

Удасканалены парадак планавання і каардынацыі даследаванняў, ажыццёўлены пераход на праграмна-мэтавы метад планавання.

Шырокае распаўсюджанне атрымалі такія формы сувязі навукі і вытворчасці, як гаспадарчыя дагаворы, комплексныя планы сумесных работ з прадпрыемствамі і міністэрствамі, навукова-вытворчыя аб'яднанні інстытутаў акадэміі, галіновых НДІ і вытворчых аб'яднанняў, падраздзяленні двайнога падпарадкавання. За дзесяць гадоў у народнай гаспадарцы ўкаранёна больш за тысячу распрацовак з эканамічным эфектам у 320 мільёнаў рублёў або ў тры разы больш, чым за гады дзевятай пяцігодкі.

Для павышэння эфектыўнасці працы вучоных у АН БССР ажыццяўляецца праграма аўтаматызацыі даследаванняў, створаны Вылічальны цэнтр калектыўнага карыстання з разгалінаванай сістэмай перыферыйных канструкцый.

Многае зроблена для паляпшэння падрыхтоўкі навуковых кадраў. У адпаведнасці з прыгаданай пастановай у АН БССР рэгулярна праводзіцца атэстацыя навуковых устаноў і навуковых работнікаў.

Пра высокі ўзровень развіцця навукі ў рэспубліцы можна меркаваць па тым, што ў дзесятай пяцігодцы вучонымі акадэміі і Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна было зарэгістравана тры навуковыя адкрыцці.

Працэс глыбокіх пераўтварэнняў савецкай навукі ў той або іншай ступені адбіваецца на рабоце любога навуковага падраздзялення ў нашай краіне, у тым ліку і лабараторыі оптыкі паўправаднікоў Інстытута фізікі АН БССР, якую я ўзначальваю. Лабараторыя ўдзельнічае ў распрацоўцы важнейшых комплексных праблем, выконвае гаспадарча-дагаворныя работы, актыўна займаецца вынаходніцкай дзейнасцю, укараняе свае распрацоўкі ў вытворчасць. Да найбольш важных дасягненняў за апошнія гады трэба аднесці выяўленне з'явы тушэння і стымуляцыі стрымерных разрадаў у паўправадніках лазерным выпраменьваннем. У Дзяржаўны камітэт па справах вынаходніцтваў і адкрыццяў цяпер рыхтуем заяўку на новае адкрыццё.

Галоўнай перашкодай на шляху навукова-тэхнічнага прагрэсу лічу недасканалую сістэму ацэнкі дзейнасці прадпрыемстваў, якая не падштурхоўвае іх, паводле слоў тав. Л. І. Брэжнева, сказаных на XXIV з'ездзе КПСС, «ганяцца за навукова-тэхнічнымі навінкамі».

2. У эпоху навукова-тэхнічнай рэвалюцыі развіццё некаторых галін навукі і тэхнікі злілося ў адзіны працэс раскрыцця тайн і авалодання сіламі прыроды. Да гэтых галін адносяцца перш за ўсё фізіка ядра і элементарных часцінак, астрафізіка, квантавая і мікраэлектроніка, касмічныя даследаванні. Такія унікальныя прыборы і абсталяванне, як ядзерныя рэактары, паскаральнікі элементарных часцінак, магутныя аптычныя і радыётэлескопы, электронныя мікраскопы, касмічныя караблі, якія аказаліся ў распараджэнні вучоных, самі з'яўляюцца ўвасабленнем дасягненняў навукова-тэхнічнай рэвалюцыі і ў той жа час дазваляюць ставіць такія складаныя эксперыменты, якія немагчыма было рэалізаваць даследчыкам мінулых стагоддзяў. Па меры павышэння хуткадзеяння электронных вылічальных машын робяцца даступнымі для разліку ўсё больш цяжкія тэарэтычныя задачы. Разам з гэтым, цяпер, як і раней, навуковыя адкрыцці могуць нараджацца так сказаць, на вастрыі пяра або з дапамогай элементарных сасудаў, якімі карысталіся яшчэ сярэдневяковыя алхімікі. Ніякага асаблівага абсталявання не патрабавалася англійскаму вучонаму А. Флемінгу, які вынайшоў пеніцылін і стаў пачынальнікам новага накірунку ў бактэрыялогіі. І так будзе заўсёды, таму што галоўным інструментам спазнання свету быў і застаецца мозг чалавека.

3. Дыферэнцыяцыя навукі абумоўлена складанасцю і шматграннасцю вывучаемых з'яў, з аднаго боку, і абмежаванымі магчымасцямі аднаго чалавека ўспрыняць, перапрацаваць і запомніць інфармацыю пра гэтыя з'явы, з другога боку. Таму па меры росту агульнага аб'ёму ведаў усё больш узнікае розных навуковых напрамкаў і ўсё вузейшай становіцца спецыялізацыя аднаго вучонага.

Аб'ектыўныя перадумовы для інтэграцыі навукі ствараюцца адзінствам матэрыяльнага свету і комплексным характарам навуковых, навукова-тэхнічных і сацыяльна-эканамічных праблем, вырашэнне якіх магчыма толькі аб'яднанымі намаганнямі прадстаўнікоў розных навуковых накірункаў.

Чым больш узнікае навуковых накірункаў і чым шырэйшай становіцца сетка навукова-даследчых арганізацый, тым усё больш актуальнай робіцца праблема ўдасканалення арганізацыі навуковай дзейнасці і, у прыватнасці, пераадолення міжведамасных бар'ераў.

Каардынацыйныя планы навукова-даследчых работ, якія складаліся ў нашай краіне на працягу многіх дзесяцігоддзяў, у значнай ступені вычарпалі свае магчымасці і не адпавядаюць сённяшнім патрабаванням. Больш эфектыўнай формай арганізацыі навукі з'яўляецца саістаўленне і распрацоўка комплексных мэтавых праграм.

Праграмна-мэтавы метад планавання нарадзіўся ў нашай краіне яшчэ ў першыя гады Савецкай улады. Ленінскі план электрыфікацыі Расіі (ГАЭЛРО) па сутнасці і быў першай комплекснай мэтавай праграмай. Вядома, што вялікія поспехі ў асваенні атамнай энергіі і вывучэнні касмічнай прасторы, дасягнутыя ў кароткія гістарычныя тэрміны, у значнай ступені абумоўлены старанна распрацаванымі комплекснымі праграмамі.

Ва ўмовах растучай дыферэнцыяцыі навукі праграмна-мэтавы метад планавання з'яўляецца найбольш эфектыўнай формай аб'яднання намаганняў вучоных і спецыялістаў на вырашэнні буйных навуковых і народнагаспадарчых праблем.

4. Вядомы рускі матэматык М. І. Лабачэўскі адзін распрацаваў неэўклідаву геаметрыю. К. Э. Цыялкоўскі вырашыў многія пытанні касмічных палётаў. Французскі матэматык Э. Галуа, які загінуў на дуэлі ў 21 год, пабудаваў тэорыю канечных палёў і стаў пачынальнікам новага навуковага накірунку ў матэматыцы. Такіх прыкладаў узлёту чалавечага генія можна прывесці мноства. Тым не менш, творчая праца не толькі ў навуцы, але і ў літаратуры, жывапісе, музыцы і г. д. заўсёды з'яўляецца дыялектычным адзінствам індывідуальнай і калектыўнай дзейнасці.

Нават калі навуковую працу пісаць у турэмнай камеры з голымі сценамі, як гэта рабіў Э. Галуа напярэдадні дуэлі, то і тады нябачнымі саўтарамі будуць многія іншыя вучоныя, вынікі работы якіх зафіксаваны ў нашай памяці.

Улічваючы глыбокія карані і сувязі з'яў, можна сказаць, што ўсе дасягненні матэрыяльнай і духоўнай культуры ў канечным выніку з'яўляюцца плёнам развіцця ўсяго чалавечага грамадства нашай планеты.

Калі ж падыходзіць да гэтага пытання чыста фармальна, то можна сцвярджаць, што ў агульным аб'ёме ведаў няспынна расце ўдзельная вага вынікаў, атрыманых аб'яднанымі намаганнямі вучоных і работнікаў многіх іншых спецыяльнасцей. Гэта не выключае, вядома, і індывідуальную творчасць. Асабліва ўзрастае роля лідэраў у навуцы, «генератараў ідэй», буйных арганізатараў і кіраўнікоў навуковых калектываў.

5. Навукова-даследчая работа, асабліва калі ёй прысвечаны многія гады жыцця, накладае пэўны адбітак на ўнутраны свет чалавека. Аднак гэты адбітак, як правіла, носіць другарадны, а не вызначальны характар.

Пачаць з таго, што ў навуку чалавек прыходзіць пасля атрымання вышэйшай адукацыі, калі яго арганізаванае навучанне і выхаванне ўжо закончана, характар, маральныя крытэрыі, захапленні і звычкі сфарміраваны, а ў некаторых відах спорту ў такім узросце ўжо адпраўляюць на «пенсію».

Далей. Навуковыя супрацоўнікі не ізаляваны ад астатніх пластоў грамадства, нават у сваіх установах яны няспынна ўзаемадзейнічаюць з рабочымі, тэхнікамі, інжынерамі, людзьмі многіх іншых прафесій.

А галоўнае, ва ўсіх савецкіх людзей агульныя радасці і клопаты. Усе мы чытаем адны і тыя ж газеты і часопісы, глядзім кіно, спектаклі і тэлеперадачы. Савецкі народ — гэта сапраўды грамадства людзей, якое склалася гістарычна.

Што датычыць захаплення спортам, музыкай, літаратурай, то ўсё гэта, па-мойму, вызначаецца не столькі прафесіяй, колькі асобай самога чалавека, яго прыроднымі здольнасцямі, сямейнымі традыцыямі і матэрыяльнымі магчымасцямі.

Вялікі Кастрычнік разняволіў духоўныя сілы ўсіх народаў нашай краіны. Навуковая творчасць стала масавай прафесіяй. І я, як сялянскі сын, адчуваю сябе тонкім каласком сярод багатага ўраджаю, вырашчанага нашай роднай Савецкай уладай.

6. Некалі даўно я прачытаў, здаецца, у Льва Талстога і назаўсёды запомніў такія словы: часта мы любім чалавека не за тое дабро, якое ён зрабіў нам, а за тое дабро, якое мы зрабілі яму.

Літаратура — гэта таксама навука, якая даследуе, калі можна так сказаць, чалавечы дух і наогул — чалавецтва. І адкрыцці ў гэтай галіне карыфеяў сусветнай літаратуры не саступаюць самым вялікім адкрыццям у прыродазнаўстве. Кажуць, арол бачыць далей за чалавека, але чалавек бачыць больш за арла. Бачыць больш, таму што глыбока пранікае ў сутнасць рэчаў. Без мастацкай літаратуры не было б той глыбіні, вобразнасці і адухоўленасці, якія характэрны для нашага ўспрыняцця з'яў грамадскага жыцця, прыроды, душы чалавека, гістарычных падзей і шмат-шмат іншага.

Таму мастацкая літаратура, даючы нам эстэтычную асалоду, у той жа час з'яўляецца неад'емнай часткай агульнага працэсу спазнання заканамернасцей прыроды, грамадства і самой свядомасці. Фарміруючы высокія маральныя якасці чалавека, літаратура і мастацтва ствараюць перадумовы для высокаэфектыўнай калектыўнай працы, і ў гэтым сэнсе з'яўляюцца апасродкаванай вытворчай сілай грамадства.

Беларускія паэты і празаікі стварылі шмат выдатных твораў, якія атрымалі шырокае прызнанне. Але мне хацелася б звярнуць увагу на два ўчасткі літаратурнай цаліны, якія патрабуюць тэрміновай распрацоўкі. Па-першае, гэта гісторыя беларускага народа, асабліва за апошнія 5—6 стагоддзяў. Патрэбны гістарычныя раманы, аповесці і апавяданні, патрэбны кнігі пра жыццё выдатных людзей. Варта зазірнуць у пяцітомную «Гісторыю БССР», пагартаць Беларускую Савецкую Энцыклапедыю і стане ясна, як многа трэба зрабіць беларускай савецкай літаратуры ў мастацкай інтэрпрэтацыі славутых гістарычных падзей, выкарыстаць гэта для выхавання грамадзянскіх і патрыятычных пачуццяў.

Другая цаліна звязана з навукай, як са сферай чалавечай дзейнасці, што хутка пашыраецца і відазмяняецца. Колькасць людзей, занятых у сферы навукі ў рэспубліцы, набліжаецца зараз да двухсот тысяч. У навуковых калектывах шмат спецыфічных чыста чалавечых праблем і, канечне, яны павінны быць у полі зроку «інжынераў чалавечых душ».

КРЫТЫКА, БІБЛІЯГРАФІЯ

КНІГАПІС

А. ТОЗІК. У дні суровых выпрабаванняў. Умацаванне радоў КП(б)Б ва ўмовах падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны (1941—1944). На рускай мове. Мінск, выдавецтва БДУ, 1981.

Манаграфія з'яўляецца першай навуковай работай, прысвечанай пытанням партыйнага будаўніцтва на часова акупіраванай гітлераўцамі тэрыторыі рэспублікі. У ёй асвятляюцца асаблівасці і працэс фарміравання разгалінаванай сеткі падпольных партыйных органаў і арганізацый, формы і метады ўнутрыпартыйнай работы ва ўмовах падполля. Значнае месца ў кнізе адведзена паказу дзейнасці Кампартыі Беларусі па ідэйна-палітычным выхаванні камуністаў, забеспячэнні іх авангарднай ролі ў барацьбе з ворагам.

І. БАРЫСАЎ.

М. МІНЧАНКА. Давер. Вершы, гумар. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1980.

Мікола Мінчанка належыць да ліку паэтаў, якіх па звычцы яшчэ называюць маладымі, хоць яны паспелі размяняць чацвёрты дзесятак і ў літаратуры даўно не навічкі.

«Давер» — другая кніжка М. Мінчанкі. Тэматыка вершаў — любоў да Радзімы, родная прырода, штодзённыя справы чалавека-стваральніка.

Жыве М. Мінчанка ў глыбінцы (ён супрацоўнік клімавіцкай раённай газеты «Новае жыццё»), не растаецца з тымі мясцінамі, якія сталі яго вытокам, якія ўзбагацілі душу і сэрца. Там ён заўсёды свой чалавек. «На вёсцы я зусім не лішні» — шчыра прызнаецца паэт у адным са сваіх вершаў.

Аб чым бы паэт ні пісаў — роднай прыродзе, маладосці, каханні, — цэнтральнай тэмай яго кнігі з'яўляецца тэма Радзімы. З ёй, Радзімай, у М. Мінчанкі ўзаемнае давер'е. І назва гэтай кніжкі ў паэта не выпадковая. Яна арганічна зліласся з яе зместам. «Я табе ўсе сілы маладыя ў кіпенні будняў перадам», — усхвалявана гаворыць аўтар і тут жа звяртаецца з заклікам да сучасніка:

І калі паклікала дарога,
Сэрцам зведай і любі свой
край.
Каб аб ім жыла твая
трывога,
Ты яе і сыну перадай.

Гаворачы пра сённяшні дзень, апяваючы маладосць, прыгажосць роднай прыроды і працоўныя будні краіны, аўтар «Давера» не забывае і суровых дзён, якія прынеслі нашаму народу столькі гора і пакут. Асабіста ў яго вайна забрала бацьку. Таму выгляд абеліска ў полі трывожыць душу лірычнага героя, і яна «баліць, як рана свежая, баліць».

Павел ПРУДНІКАЎ.

„Толькі б мне спявалася аб родным...“

ЧЫТАЮЧЫ ТАВАРЫША

Абсягі паэзіі — неабдымныя. І колькі б мы ні шукалі яе вытокі, думка будзе імкнуцца ўсё далей углыб гісторыі, усё далей углыб чалавечай душы. Мяняліся шматлікія літаратурныя плыні, незлічоную колькасць раз аб'яўляліся і потым абвяргаліся паэтычныя «адкрыцці», «знаходкі», «новаўвядзенні». Вечным заставалася слова.

Слова, якое знаходзіць водгук у сэрцах іншых людзей, хвалюе. А хвалюе яно тады, калі за ім—лёс. Паэты сцвярджаюць сябе—здаўна перакакана ў гэтым!—сваім лёсам, і толькі гэта азначае — сваім словам.

Не, я зусім не адмаўляю значэння вобраза, вобразнасці, музыкі гучання—у кожным выпадку неабходна адметных, пасвойму непаўторных. Але хіба паўтараецца хоць адзін лёс? Не так многа з таго часу, як існуе белы свет, з'явілася новых святыняў: Зямля, Радзіма, маці, каханая, дзіця... Але гэта тыя святыні, на адносінах да якіх выпрабоўваецца на чалавечнасць чалавек. Мяняюцца пакаленні, нязменнымі застаюцца нашы найвялікшыя каштоўнасці: дзіця, каханая, маці, Радзіма!

Тут гэтак многа застаецца
нам.
І я заўсёды думаю
пра тое—
а што, нашчадкі,
я пакіну вам,
каб назаўсёды,
вечнае,
святое...

Гэта словы Генадзя Пашкова, сказаныя ў адным з лепшых вершаў апошняга, трэцяга зборніка «Гравюры дарог» — «Хата». У вершы гучыць пытанне, якое звернута не толькі да самога сябе,—гучыць трывога, агульначалавечая трывога.

Думаецца, ёсць першыя падставы парадавацца за сваё, пасляваеннае пакаленне. Яно, нягледзячы на недаўменне крытыкаў, якія так доўга шукалі і не знаходзілі яго, усё-такі склалася, працуе. Працуе з пэўным плёнам, усё бліжэй і бліжэй падступаючыся да сталасці.

Ёсць своеасаблівая цяжкасць станаўлення паэта сёння. Часам здаецца, што зусім не засталося неабжытых тэм, не сцёртых ад доўгага ўжывання слоў. Але гэта толькі здаецца. І тэмы і словы спрадвек былі адны і тыя ж. І пакутай і болем — відаць, можна і пашкадаваць аб гэтым — нікога не абыходзіць час. Справа адно ў тым, ці знойдзецца ў душы сіла, якая будзе гэтая сіла, на што скіравана. Гавару пра сілу — у першую чаргу пра сілу таленту. Таленту, які ў розных паэтах праяўляецца па-рознаму, па-свойму. Што ж да нашага пакалення...

Калі ў паэзіі Яўгеніі Янішчыц мяккі лірызм, узяты ад фальклору, ад народнай песні, і вечную прагу паўнаты жыцця спалучае вострая, часам проста колкая ў сваёй незаспакоенасці думка, то Раісу Баравікову вылучае абвостранае пачуццё непаўторнасці кожнага імгнення жыцця, трывожны пошук сваёй дарогі, трывога за сваё прызначэнне на зямлі. Уладзімір Някляеў заўсёды ўражвае напорыстасцю, энергіяй слова, пастаўленага на службу сэрцу і розуму. Калі кожны раз па-іншаму здзіўляе своеасаблівая, часам нязвыклая асацыятыўнасць паэтычнага мыслення Валянціны Коўтун, то, сочачы за падборкамі вершаў, якія друкуе Генадзь Пашкоў, не перастаеш любавацца сакавітымі, вельмі маляўнічымі краявідамі роднай зямлі, што нібыта ўпершыню адкрывае для цябе паэт.

Так, голас Генадзя Пашкова не губляецца ў хоры маладых галасоў. Не губляўся з самага пачатку. Думаю, многім запомніліся яго радкі:

Бы адкрыццё,
у белым свеце
кладзецца першы-першы
след,
дзе столькі зім
і столькі лет
перапляло трывогай вецце.

А гэта ж радкі з першай кнігі «Кляновік», якая выйшла ў 1975 годзе. А вось яшчэ радкі, з той жа кнігі:

Глыбокі след—
два раўчукі
ляцяць, шалёныя, з узлобка,
дзе рыбінай
чарнее лодка
зеленалёдае ракі.

Маляваць словам—зайздроснае ўменне.

Праўда, часам узнікае адчуванне, што яно нават перашкаджае паэту: гукі, фарбы нярэдка захлістваюць сам верш, яго думку. Занадта шчодра выплёсквае іх паэт з душы, не баючыся ні перабольшванняў, ні паўтораў. Сказаў жа ён:

Не баюся стацца
старамодным,
не баюся стаць
архісучасным.
Толькі б мне спявалася
аб родным,
любым сэрцу,
маладым і шчасным.

Тут многае ад маладосці, ад маладога запалу.

Уменне маляваць словам — гэта многа. І ўсё-такі—мала, занадта мала, калі на зямлі ёсць не толькі прыгожыя ўсходы і заходы сонца, а і пажары пасля бамбёжак, і кроў, і слёзы абяздоленых, галодных дзяцей. Паэт разумее гэта. Няхай не заўсёды можа ён пераадолець моўную стыхію, але часцей і часцей знаходзіць выйсце трывога—яго трывожны роздум аб лёсе зямлі і чалавека на зямлі.

Адказнасць за слова, адказнасць перад сваім талентам, няхай павольна, але ад кнігі да кнігі расце. Аўтар разумее: радок верша павінен быць прыроўнены да хлеба. Занадта гучна? Можа, і занадта. Ды пісаць трэба адно з такім адчуваннем, інакш пісаць не варта.

І ўсё ж цікава—чаму першая кніга, выдадзеная многімі яшчэ ў студэнцкія гады, ці адразу па заканчэнні універсітэта, надоўга застаецца лепшай? Кажам пра тое, што адказнасць за слова расце, а росту паэта — відавочнага росту! — нібыта і няма? Рост, безумоўна, ёсць. Толькі ў многіх выпадках — гэта рост душэўны, ад якога адстае, і даволі далёка, рост паэтычнага майстэрства.

Прыкладам магла б служыць, напэўна, творчасць любога з нас. Ёсць гэты грэх і ў Генадзя. Калі ў першай кнізе кожны верш—закончанае цэлае, адзін трапяткі арганізм, яму ўласцівы і сцятасць, і ўзрушанасць, і напружанасць руху, у дзвюх іншых нярэдка сустракаюцца вершы яўна зацягнутыя, шматслоўныя, лагічна не завершаныя — ставіцца кропка, а фіналу няма. Можна выбраць, адасобіць асобныя—значна мацнейшыя, чым раней — радкі, строфы, а цалкам узяць верш як узор немагчыма. Раптам дзесьці ў сярэдзіне, у гушчары эпітэтаў губляецца нітачка — той трапяткі нерв, які трымае верш.

Паўтараю, гэтым грашыць не адзін Генадзь Пашкоў. Чытаючы і перачытваючы яго вершы, імкнучыся зразумець—за кошт чаго адбываецца рост, імкнуся зразумець і сябе. Ці не зарана адсоўваем мы ад сябе падручнікі, перастаём вучыцца? Ці не пачынаем абкрадваць сябе, давяраючы толькі свайму голасу, толькі свайму сэрцу? Ці не занадта шмат часу адводзім для пасталення?

Пытанняў многа. Пытанні няпростыя...

На зямлі я стаю.
У кургане урос.
Думку паліць жытнёвая воля:
як уткаць
у суровы зямлі маёй лёс
і маё
зарунелае поле?..

Цытую заключныя радкі з паэмы «Трывога» Генадзя Пашкова. І яму баліць пачуццё ўласнай недасканаласці.

Тры вершаваныя зборнікі. Пара вучнёўства засталася ззаду, вучыцца давядзецца на працягу ўсяго жыцця. Вучыцца, каб здолець зрабіць яшчэ і яшчэ крок наперад. Хутчэй за ўсё не кожны з гэтых крокаў рассуне, пашырыць далягляд — ніхто не застрахаваны ад творчай няўдачы, — але крок азначае рух. Значыць, і непакой.

Хацелася б колькі слоў сказаць пра паэмы Генадзя Пашкова. Іх пяць: «Трывога», «Дыстанцыя небяспекі», «Жураўіны ў шэрані», «На ласіных картах», «Дзяўчынка з блакітным мячыкам». Усе яны невялікія. Кожная нясе ў сабе цікавую задуму, у кожнай так або інакш увасоблены светапогляд аўтара, яго жаданне глыбей, больш шырока паказаць той ці іншы пласт жыцця, душэўнага перажывання. На маю думку, атрымалася толькі паэма «На ласіных картах». Паспрабую растлумачыць, чаму.

Апошнім часам — дзесяцігоддзе, два — паэма нібыта паступова страчвае сваю спрадвек эпічную скіраванасць, сваю завершанасць; пачуццё размывае, здавалася б, раней непарушныя берагі, межы, дыктуе свае рытмы. Перспектыўны гэты шлях ці не, гаварыць сёння рана, але ёсць ужо на гэтым шляху і пэўныя здабыткі. Выразна акрэслены сюжэт, паступовы, нетаропкі рух падзей, дэталёвая вымалёўка, уласцівыя эпічнай паэме, цяпер нярэдка саступаюць эмацыянальнасці, насычанасці часта далёкіх па асацыяцыі вобразаў, асэнсаванню нават не падзей, а тых глыбінных плыняў, якія выносяць падзеі на паверхню часу. Але ж гэта ў лепшых выпадках. Тады ж, калі рух думкі запаволены, калі ў творы ні сюжэту, ні колькі-небудзь значных падзей, паэма або распадаецца на асобныя вершы, або падаецца чытачу адным, непамерна расцягнутым вершам.

А якраз гэта і здарылася з большасцю паэм Генадзя Пашкова. Там жа («На ласіных картах»), дзе задума патрабавала асэнсавання адносін паміж чалавекам і прыродай, асэнсавання таго, як спалучаецца хуткаплыннасць кожнага жыццёвага імгнення з адвечнасцю, непарушнасцю прыроды, і было знойдзена аўтарам цікавае яе ўвасабленне (апавяданне ідзе нібыта па слядах лася, прыпыняючыся — то каб уваскрэсіць чароўныя вобразы пушчы, то каб ясней адчулася трывога яго за лёс неперспектыўнай вёсачкі, за лёс чалавека, адарванага ад прыроды, ад свайго мінулага), слова гучыць упэўнена, пераканаўча.

Вельмі цікава задумана апошняя па часе напісання паэма «Дзяўчынка з блакітным мячыкам». Быццам мацнее сіла прыцягнення зямлі — паэту пачынае балець не толькі тое, што блізка закранае яго, што тычыцца яго асабіста. Трывога, якой жыве цэлы свет, — трывога за будучыню чалавецтва становіцца ягонай трывогай. Ён спрабуе выказаць яе, спрабуе... Вось і сказана гэта слова: спрабуе. На жаль, Генадзь не змог пазбавіцца тут тых, уласцівых сёння не аднаму яму, хібаў, аб якіх гаварылася вышэй.

І яшчэ адно, што вельмі хочацца сказаць адносна непажаданага ў яго паэзіі: нельга захапляцца апісаннем усё новых і новых краявідаў, уключаючы ў іх кола краявіды ўсіх мясцін, дзе паспеў пабываць. Гэта ж толькі замалёўкі, эцюды. Яны, мажліва, і патрэбны ў штодзённай рабоце над словам, але згадаем: ці многа эцюдаў мы бачым на вялікіх персанальных выстаўках мастакоў у экспазіцыі? А ў іх жа замалёвак, эцюдаў — сотні, тысячы. Што ж паэты? Ніжэйшы ўзровень патрабавальнасці да сябе, да сваёй творчасці?

З даволі вялікай колькасці вершаў падобнага плана ў Генадзя вылучаецца адно чатырохрадкоўе — «Дарогі Еўропы»:

Дарогаў Еўропы напятыя ніці.
Навокал імгліцца
зялёная замець,
і толькі трывожна
ў шурпатым граніце
сусветнага пекла
вуглеецца памяць.

Відаць, з такой ашчаднасцю да яўных і ўяўных прыкмет вобразнасці, да самога слова і трэба пісаць.

Няспешна, няроўна ідзе рост паэта, шлях яго пакуль што — толькі вузкая, пакручастая сцяжына. Але гэту сцяжыну пракладае ён сам, пракладвае настойліва, з уласцівай маладосці ўпартасцю — больш відавочнымі з дня ў дзень становяцца не адно страты, абумоўленыя так званымі хваробамі росту, але і набыткі. Хай жа набыткаў становіцца ўсё болей і болей! Хай хутчэй выходзіць Генадзь Пашкоў на бальшак — у вялікую паэзію.

Таіса БОНДАР.

КРЫТЫКА, БІБЛІЯГРАФІЯ

СТАРОНКІ З ДЗЁННІКА ДУШЫ

КРАІНА жоўтага д'ябла, прыстанішча наркаманаў... Самая багатая дзяржава свету. І, як гэта ні дзіўна, самая бедная. Па духоўнай спустошанасці народа, па адсутнасці якіх бы там ні было ідэалаў.

Усе гэтыя азначэнні адносна Злучаных Штатаў Амерыкі будуць правільнымі, гэтаксама як і тое, што сённяшняя Амерыка — буйнейшая мілітарызаваная дзяржава, што прагне панавання над усім светам, стварае пагрозу знішчэння чалавецтва. Чаго-небудзь невядомага, нечаканага адносна ладу і ўкладу жыцця Амерыкі, бадай, ці можна і знайсці. Дык чаму ж тады з такой цікавасцю перачытваеш «Лісты з Амерыкі» Анатоля Кудраўца?

А ўсё, мабыць, таму, што перад табой не проста пісьменніцкая справаздача аб паездцы, не проста ўражанні аб убачаным, зведаным. «Лісты з Амерыкі» А. Кудраўца перш за ўсё — споведзь сэрца чалавека, які вымушаны быў пэўны час адчуваць боль расстання з Радзімай, з блізкімі і знаёмымі яму людзьмі. Гэта маналог савецкага грамадзяніна, які, апынуўшыся ў «капіталістычным раі», адчуў тую бездань, што падзяляе наш савецкі лад жыцця і знешне сытае, бескланотнае існаванне самазадаволенай Амерыкі.

Зрэшты, сам А. Кудравец у пачатку «Лістоў...» так вызначае жанр іх: «Напісанае тут не з'яўляецца прэтэзіяй на нейкі ўсебаковы нарыс жыцця сённяшніх Штатаў. Аўтар не ставіў — ды, па абмежаванасці часу знаходжання там, і не мог ставіць — перад сабой такой мэты. Даволі ўмоўна напісанае можна назваць **старонкамі з дзённіка душы** (выдзелена мною. — **А. М.**), закінутай (хоць і па яе добрай волі) на другі край зямлі, у атмасферу чужога побыту». І пачынае падаваць своеасаблівае «выбранае з гэтага перажытага».

Неяк адразу настройваешся на расказ А. Кудраўца — нетаропкі, магчыма, нават запаволены. І паступова адчуваеш, што чытанае табой раней не паслабляе цікавасці да гэтых нататкаў.

Як сталася, што дзяржава, якая і ў мінулым, і ў пачатку цяперашняга стагоддзя ў развіцці сваім узяла такі імклівы размах, ператварылася ў «сур'ёзную небяспеку для спакою зямлі»? Чаму яна, Амерыка, «як толькі ўвабралася ў сілу, стала нахабнай, стала агрэсіўнай»? Чаму, нарэшце, «свае інтарэсы» амерыканцы бачаць ледзь не ў кожнай краіне? Гэтыя і іншыя пытанні раз-пораз узнікаюць перад табой, калі знаёмішся з «Лістамі...» А. Кудраўца.

«Амерыка любіць толькі сябе. І ўсё, што яна робіць — і дома, і за межамі свайго дома,— робіць з пазіцый гэтай самалюбові, аснову якой урэшце складаюць грошы і выгада. А грошы, як і карты, радні не прызнаюць» — праўдзіва і крыху з іроніяй заўважае пісьменнік. У іншым месцы знаходзім яшчэ больш трапнае абагульненне: «Сапраўды, Амерыка жалезная, Амерыка стальная... Тут цудоўныя дарогі, прыгожыя масты, магутная тэхніка... Але Амерыка згубіла сваю ідэю. Правільней, не згубіла, а яе ідэя — маленне на залатога цялка — прывяла да таго, што цэніцца толькі матэрыяльнасць, і чым болей яе, тым вышэй цана».

Так аб'ектыўна і так выкрывальна піша А. Кудравец. Не, ён не спрабуе ўсё там ганіць агулам (успомнім, з якім хваляваннем расказвае пісьменнік пра знаёмства з творамі славутага Радэна, з амерыканскай літаратурай), але як прыкра робіцца яму на сэрцы, калі ўспамінае пра тых, хто гаступленні: «Сасніў Мінск, сям'ю. Сон адразу забыўся, але засталося нешта вельмі прыемнае, быццам паглядзеў родную кінахроніку», ці — «на сцяне насупраць майго акна няма ўжо ніводнага лісточка. Усе — нават самыя малюсенькія— асыпаліся. Віной, мусіць, замаразкі, ды і пара ўжо — снежань месяц. Набліжаецца і мая пара».

Дарэчы, і наступны нарыс А. Кудраўца, які таксама ўвайшоў у кнігу «За чужымі далямі», і сціпла названы «Замалёўкі з выстаўкі», вызначаецца гэткай жа самай аўтарскай даверлівасцю, непасрэднасцю і адначасова ўважлівасцю да чытача. Ён не прэтэндуе на шырокі, падрабязны расказ пра сённяшнюю Федэратыўную Рэспубліку Германіі, а дзеліцца толькі ўражаннямі, якія ўзніклі падчас знаходжання на савецкай гандлёва-прамысловай выстаўцы, што праходзіла ў Дзюсельдорфе — сталіцы зямлі Паўночны Рэйн-Вестфалія ў 1973 годзе. Тады гэта была самая буйная прамысловая выстаўка Савецкай краіны ў капіталістычнай дзяржаве і першая ў ФРГ.

Але выстаўка выстаўкай, а асноўнае для А. Кудраўца паспрабаваць убачыць ФРГ «зблізку», адчуць настрой грамадзян гэтай краіны. А зрабіць гэта было асабліва цікава — правядзенне выстаўкі супала з пачаткам паляпшэння адносін ФРГ з Савецкім Саюзам.

А. Кудравец расказвае пра сустрэчы, што адбываліся на выстаўцы — і з немцамі, і з былымі нашымі суайчыннікамі, якія па розных прычынах аказаліся далёка ад Радзімы, прыводзіць шмат вытрымак з мясцовых газет. Пачынаеш пераконвацца, наколькі вялікі поспех мела гэтая выстаўка, як цікавіліся ёй сумленныя людзі. Але пісьменнік не абыходзіць увагай і «вострых» момантаў, што давалі аб сабе знаць. Мінулае ж не забываецца. А ў мінулым— смерць, гора савецкіх людзей. І злачынства рабілі не толькі тыя, хто быў адурманены фашысцкай прапагандай, а і «ідэйна загартаваныя» забойцы, узрошчаныя на тэорыі, што арыйская раса — лепшая раса на зямлі.

Некаторыя з гэтых недабіткаў таксама прыходзілі на выстаўку. Адны маўчалі, другія з задавальненнем паказвалі на савецкай карце гарады, дзе забівалі людзей. І, ціха ўсміхаючыся, даставалі з кішэні здымкі сваёй сям'і. Зразумелы гнеў аўтара, калі ён піша: «Мне робіцца холадна ў гэтым душным змрачнаватым павільёне. Гэтакае ж фота, відаць, ён насіў з сабой і там, у нас...».

І «Лісты з Амерыкі», і «Замалёўкі з выстаўкі» — не проста дакументальныя нататкі, а высокая публіцыстыка, што хвалюе сваёй змястоўнасцю, значнасцю ўзнятых праблем, асэнсаваннем пытанняў надзённых і актуальных, абуджае думку, актывізуе ў душы чытача патрыятычныя матывы, вучыць яго непрымірымасці да буржуазнай ідэалогіі, да спроб усіх «добразычліўцаў», з-за мяжы згладзіць вострыя класавыя супярэчнасці ў капіталістычных краінах, падаць жыццё там ледзь не раем.

Побач жа — «Мангольскія штрыхі», па-сяброўску шчырае і светлае слова пра наведванне пісьменнікам братняй Манголіі, пра людзей гэтага цудоўнага краю. Гэта таксама своеасаблівыя старонкі «з біяграфіі душы», але старонкі, якія прасякнуты любасцю да сціплых, працалюбівых людзей, да іх радзімы.

...«За чужымі далямі» — кніга, якая засведчыла, што А. Кудравец, якога мы ўсе дагэтуль ведалі як прызнанага майстра слова ў прозе, валодае і вострым майстэрствам публіцыста.

Алесь МАРЦІНОВІЧ.

А. Кудравец. За чужымі далямі. Падарожныя нарысы. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1981.

ПАЭЗІЯ

Уладзімір НЯКЛЯЕЎ

Мне трыццаць. Час настаў такі,
Калі — ні ў вучні, ні ў настаўнікі.

Яшчэ шкалярскі доўг плачу
Купалу,
Танку,
Куляшову,
А ўжо з Глыбоччыны хлапчук
Прысуднага
чакае слова.

Мой родны!..
Бог табе суддзя.
Суды
сабе падобных лепяць.
Якая песня ў лебедзя?
Як лебедзь.

Ах, лебедзяў прыгожа б'юць!
Як выжыць — я магу параіць,
А вершы пішуць — як жывуць.
Як дыхаюць. Як паміраюць...

Хлапчук маланкі тушыць вейкамі,
Яму здаецца — ён паэт!—
Што я хаваю тайну нейкую,
Што ёсць
паэзіі сакрэт!
Ён невідушча йдзе па вуліцы,
Ён казку ўспамінае вусцішна:
«Пад дубам куфар ёсць, там
вуціца,
Не лебедзь — вуціца, а ў той
Яйцо з іголкай залатой...»

Галосіць дуб пустымі дупламі!
Хлапчук ледзь пераводзіць дух.
«Пра што і як пісаць?»—ён думае.
...Лягчэй, што думаем удвух.

СЛОВА ЧЫТАЧА

ПРЫЙСЦІ НА СВОЙ БЕРАГ

У рамане «Між крутых берагоў», матэрыялам для якога Барысу Стральцову паслужылі калізіі і падзеі пасляваеннага часу, пісьменнік прыглядаецца да працэсу фарміравання новага пакалення рабочага класа з вясковых хлопцаў і дзяўчат і, па сутнасці, закранае маральна-этычныя праблемы, якія не страцілі сваёй актуальнасці і сёння.

У рэспубліцы аднаўлялася зруйнаваная вайной гаспадарка, пачыналася велізарная будоўля. Моладзь ехала ў горад, ламаўся звыклы ўклад жыцця, перастройвалася псіхалогія многіх і многіх маладых людзей. Усё гэта давялося перажыць галоўнаму герою рамана Валянціну Гардзею, які зведаў вайну і яшчэ ў хлапечым узросце са зброяй у руках змагаўся супраць фашыстаў.

Здавалася б, загартаваны баец, моцны хлопец, ён павінен упэўнена ісці ў новае, мірнае жыццё. Аднак яно вельмі крута абышлося з ім, і не ў малой ступені таму, што, як вынікае з логікі развіцця падзей у творы, жыццё, заснаванае на прынцыпах савецкай этыкі і маралі, не даруе бесхарактарнасці, хістанняў, учынкаў насуперак свайму сумленню. Паддаўшыся на хітрыкі махляроў і прайдзісветаў, Валянцін перажывае самае страшнае — страту павагі і даверу таварышаў, нават самага дарагога і блізкага яму чалавека — Жэні Лагуцінай.

Побач з вобразам Валянціна Гардзея праходзіць у рамане цікавы, выпісаны з адкрытай аўтарскай сімпатыяй таксама драматычны, але глыбока чалавечны вобраз Жэні Лагуцінай. Сіла характару дзяўчыны, яе чалавечая абаяльнасць — у дабрыні і працавітасці, спагадлівасці да іншых і маральнай стойкасці. Нават здрада каханага не зламала Жэню, наадварот, яшчэ больш загартавала. Жэня становіцца своеасаблівай крыніцай ачышчэння Валянцінавага сумлення, звароту хлопца на цвёрдую дарогу жыцця. Менавіта дзякуючы Жэнінай веры ў перамогу справядлівасці і чалавечнасці Валянцін прыйдзе да свайго берагу сумлення, хоць і праз немалыя маральныя страты.

У рамане дзейнічае шмат персанажаў, праўда, выпісаных не заўсёды пластычна і ўведзеных у сюжэт часам не вельмі матывавана, хаця гэта той неабходны жыццёвы фон, асяроддзе, у якім жывуць і дзейнічаюць галоўныя героі. Гэта пераважна таварышы Валянціна, некаторыя прадстаўнікі старэйшага пакалення, якія выступаюць эпізадычна, «падсвечваючы» вобразы галоўных герояў.

Пісьменнік «засяліў» свой раман у асноўным моладдзю, і ў гэтым ёсць свой сэнс. Праз маральныя турботы і жыццёвыя справы пасляваеннай моладзі аўтар паказвае старонкі адраджэння нашай радзімы пасля выгнання гітлераўскіх захопнікаў, а разам з тым даводзіць сённяшняй моладзі, як трэба берагчы чэсць змоладу і дастойна працягваць справу бацькоў. Сваёй праблематыкай, асабліва адмаўленнем, выкрыццём ваяўнічага мяшчанства раман сугучны сённяшняму дню. Кожны малады чалавек павінен прыйсці на свой бераг, гэта значыць, знайсці сваё месца ў жыцці, прыйсці з чыстым сумленнем і працавітымі рукамі, усведамленнем сваёй адказнасці перад грамадствам.

У гэтым, бадай, галоўны сэнс і галоўная вартасць рамана «Між крутых берагоў».

А. СЛУКА.

Б. Стральцоў. Між крутых берагоў. Раман. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1980.

Акын

Сядзеў панура,
Згорблена,
І раптам — песня з горла.

Скакаў табун, таптаў палын,
Шакалы вылі следам.
Ніхто не ведаў,
Што акын.
Ды ён і сам не ведаў.

Свістала і хрыпела
Жалоба і нуда,
Як з крана з'іржавелага
Свабодная вада.

Нібы замоваю лячыў,
Спяваў,
Пра ўсё. Нічога.
Была
За песняй
Далячынь.
Пустэча.
Стэп.
Дарога.

Турысты пырскалі:
— Выццё...
— Саліст ансамбля «Пенсія».

Адна дамбра. Адно жыццё.
І смерць адна. І песня.

Арменія

У жар-траве сунічны бор
Прымроіўся...
А над Арменіяй
Сусветнае
Знішчэнне
Зор...
А зор не менее.

Закон
Ахоўвае матэрыю.
А кроў
святла
на спад
лавінаю,
Як перарэзалі артэрыі
Над Араратцкаю далінаю.

У коп'ях неба
І ў мячах —
Пектаграфічны запіс эпасу.

Пад пацінаю
на шчытах
Арэс і Эрас.

Не вынішчаецца любоў...
Зноў небасхіл, як выраб Палеха.

І слоў не менее
Ад слоў,
У горне ночы ў попел спаленых.
Як доказ іх магічнай сілы,
З-за Крабавіднае туманнасці
Глядзяць на люлькі і магілы
Густыя вочы Туманяна.

Тураў

Дзе храм калісьці быў — цяпер
піўная...
Цыган вясёлы скача і спявае,
Удала ўкраў каня — удала збыў
І грэх запіў!

Правінцыя!
Люблю твае кантрасты!
Люблю твой люд скуласты і
гарласты,
Прастор, прапахлы небам і
зямлёй!
Але нашто, скажы мне калі ласка
ты,
Крышыць муры гісторыі сваёй?..

Цыган шалее! Млеюць мужыкі.
Гісторыя мая. Палешукі.
Нальюць па шклянцы — сціснуць
кулакі.
Як піларамы, ходзяць жаўлакі.

— Ты, можа, расстараўся б, га,
Сымонка?
За першай і гамонка не гамонка.

Сымон не зломак —
За другой,
За трэцяй
Пайшла размова пра жыццё на
свеце.

— А што жыццё? Ідзе, якое ёсць.
Мы госці ўсе — і ты таксама
госць.
Адзін швейцар вунь, як у горле
косць.
Дурны мужык. Давай, яму на
злосць.

Швейцар цікуе—вокам не міргне,
Ён знае сам, што ісціна ў віне,
Але на службе прэ з яго натура
Барацьбіта за сервіс і культуру.

Панас! Давай да нас, швейцарскі
цар!..
Усмешкай, як маланкай, блісне
твар
З той цемры, дзе схаваны ад
людзей
Сузор'і і галактыкі надзей.

Рагоча жартаўнік — аж стогнуць
міскі.
Да Гомля — го!..
Яшчэ далей да Мінска...

Цыган
танцор і праўда не благі!
— Чаго сядзіш? Устаў не з той
нагі?..
Правінцыя!

Пранізлівасць тугі,
Глухія каля Турава снягі,
А некалі... Але было даўно,
Правінцыя! Прагорклае віно,
Правінцыя! Маленства сон
чароўны,
Я толькі тут сабе самому роўны,
Правінцыя! Як быць мне, як мне
жыць —
Не выказаць, што на душы
ляжыць...

Смяецца дзеўка, поўная грудзей,
У круг яе! Да люду! Да надзей!
Эх, мама, тары-бары-растабары!..

— Ты што таварыш?..
— Захмялеў таварыш...
— Ну, не чапайце, хай сабе
паспіць...

Правінцыя! Як соладка баліць!
Качаю па стале змакрэлы мякіш:
Ёсць, дзякуй богу, Тураў, Зэльва,
Мядзель!..

Цыган крычыць: «Ты не гароцься,
госць!
Не прападзём! Яшчэ, брат, коні
ёсць!»

Апошні верш

Хай будзе жыццё! Гэта ноша па
мне!
Па мне гэта доля сустрэч і
расстанняў...
Я ведаю: займецца хутка ў акне
Апошні світанак майго існавання.
Ну што ж, гэта ноша таксама па
мне...
Спакойна змяняю я
долю на волю —
І толькі хіснуся, як цень на сцяне,
І толькі на момант хаду
запаволю...

Сустрэча

...Як зрэз на дрэве, набрынялы
сокам
Цяжкім, што кроў...

Мой ясны сокал!
Мой высокі сокал!

А галубы ляцелі з рукавоў,
І зіхацелі пацалункі ў дзюбах,
Пярсцёнкі залатыя вуснаў любых.

Накормлены —
брывом не зварухнуць!—
На спіны галубятнікі валіліся...
А я не мог бязбоязна дыхнуць
Паветрам тым, што ля цябе
свяцілася.

Той дождж, што пырскаў у тваю
далонь,
Я піў набожна, як ваду святую,
І, як паганцы верылі ў агонь,
Паверыў цёмна ў навальніцу тую,
Калі з-за хмар, бы ў меднае
вядро
Грамы шпурлялі за ядром ядро,
І мы ўдваіх лавілі ўратавана
Маланкі асляпляльнае пяро,
Бліскучы меч Ізольды і Трыстана!

— ...Дык што ж той меч?
— Ступеў ва ўжытку хатнім...
— А галубы?..
Жывуць на галубятні.

●

Над Вяллёю кружу падранкам,
Дзе арэхавыя кусты
Так пустыя, як пад фіранкай
Вокны выбітыя пустыя,

Дзе звяліся сляды ласіныя,
Дзе ў лагчынах — дакуль відаць—
Павукамі дымы на асінах,
Як на шыбеніцах вісяць,

Дзе на чорны дыван сунічніка,
Што ад копаці спарахнеў,
Сядзе зморана сініца —
І ўжо лапкай не зварухне.

КУТОЧАК СВЕТЛЫ, ЗАПАВЕТНЫ

Маляўнічыя ваколіцы старажытнага Лагойска ўсё больш прыцягваюць да сябе ўвагу турыстаў. Кожны, хто хоць раз пабывае ў гэтым кутку Беларусі, ніколі не забудзе ўзгоркавыя прасторы, бязмежныя бары, духмяныя заліўныя лугі, блакітныя рэчкі і азёры.

На Лагойшчыне амаль не знойдзеш чалавека, у свядомасці якога родныя краявіды не звязваліся б з важнымі падзеямі, з жыццём і дзейнасцю многіх дзеячаў беларускай культуры. Тут жылі і тварылі народны паэт Беларусі Янка Купала, яго сябра па пяру Змітрок Бядуля, адзін з пачынальнікаў беларускай прозы Ядвігін Ш., паэт, драматург, белетрыст і палітычны дзеяч Леапольд Іванавіч Родзевіч (1895—1937); пісьменнік, выдавец і перакладчык на польскую мову Байрана, а таксама старажытных грэчаскіх і рымскіх аўтараў Ігнат Іосіфавіч Шыдлоўскі (1793—1846). Тут нарадзіліся заснавальнікі беларускай навуковай археалогіі — браты Канстанцін і Яўстах Тышкевічы, пачынальнік беларускай, рускай, украінскай і польскай археалогіі, фалькларыстыкі, этнаграфіі славяназнавец З. Д. Даленга-Хадакоўскі (Адам Чарноцкі) і інш.

У Лагойску пэўны час жыў і працаваў Мялецій Сматрыцкі (1572 — 1630)— адзін з адукаванейшых людзей свайго часу, які дасканала валодаў грэчаскай, польскай і нямецкай мовамі, чытаў вольныя навукі — філасофію, рыторыку на лацінскай мове, вучыў грэчаскай, лацінскай і стараславянскай мовам. Вынікам педагагічнай дзейнасці была «Грамматики словенския правильная синтагма» (1618), якую М. В. Ламаносаў разам з «Арыфметыкай» Л. Ф. Магніцкага называў «вратами своей учености.»

Ляцкі Яўген Аляксандравіч — прафесар, гісторык рускай літаратуры, этнограф, нарадзіўся ў 1868 г. у засценку Альхавец Гайненскай воласці Барысаўскага павета. Памёр у Празе ў 1942 годзе. Паэт і даследчык беларускага фальклору Ніл Гілевіч у кнізе «З клопатам пра песні народа» паведамляе, што ў 1904 годзе Ляцкі апублікаваў каля 200 беларускіх песень, запісаных у Гайна-Слабадской воласці.

Аўтар першых беларускіх чытанак для першакласнікаў Яўгенія Ігнатаўна Смоліч, якая ў 1907 годзе жыла ў Селішчы, прыгадвала, што Яўген Аляксандравіч Ляцкі паходзіў з сям'і дробнага шляхціца, у якой было 24 дзіцяці. Вучыўся ў Мінскай гімназіі, потым у Маскве, дзе ў 1893 годзе закончыў гісторыка-філалагічны факультэт універсітэта. Студэнтам прыязджаў на канікулы да бацькоў, дзе збіраў і запісваў фальклор, тады ж і сам пачаў пісаць вершы. Нейкі час працаваў у Пецярбурзе, у рэдакцыі часопіса «Вестник Европы». Асабістым сакратаром у 1906—1908 гг. у яго быў Карней Чукоўскі. Ляцкі быў блізка знаёмы з Максімам Горкім, які запрасіў яго наведаць востраў Капры ў Італіі. Вядома, што жонкай Ляцкага была Вера Аляксандраўна — дачка акадэміка А. Н. Пыпіна, стрыечнага брата Чарнышэўскага.

Асабліва ж ганарыцца Лагойшчына тым, што на іх зямлі пісаў Янка Купала свае неўміручыя творы.

Янка Шарахоўскі зазначае, што 1913 год, калі паэт жыў і працаваў на Лагойшчыне, быў у яго творчасці нечым падобны да болдзінскай восені ў творчасці А. С. Пушкіна. У гэты год Я. Купала напісаў эпічныя і драматычныя творы «Магіла льва», «Бандароўна», «Яна і я», многія вершы, славутую камедыю «Паўлінка».

Як вядома, на Лагойшчыне Янка Купала пазнаёміўся з пісьменнікам-сатырыкам і гумарыстам Ядвігіным Ш., які жыў у невялікім фальварку Карпілаўка, што побач з Селішчам.

Янка Купала называе Ядвігіна Ш. у ліку тых пісьменнікаў, што ў пачатку літаратурнага шляху заахвочвалі яго да мастацкай творчасці. У адным з пісьмаў ён успамінае: «У перыяд 1904—1906 гг. ...я пазнаёміўся з Ядвігіным Ш, (жылі мы па суседству). Гэта была для меня вялікая падзея, бо ўпершыню сутыкнуўся з чалавекам, які не толькі пісьменнік, якога друкуюць, але і піша па-беларуску. З Ядвігіным Ш. я вельмі зблізіўся. Ён шмат расказаў пра незнаёмыя мне да таго часу пісьменніцкія справы і г. д. Чалавек ён быў з вышэйшай адукацыяй (праўда, універсітэта з-за рэвалюцыйных спраў не скончыў), прытым вельмі цікавы і даступны субяседнік».

Рэвалюцыйныя будні, штодзённая барацьба працоўных становяцца асноўнай тэмай і яшчэ аднаго паэта, драматурга і белетрыста, таксама выхадца з Лагойшчыны, Леапольда Іванавіча Родзевіча. Нарадзіўся ён у фальварку Кур'янаўшчына, што ў двух кіламетрах на поўнач ад вёскі Хадакі, цяпер цэнтральнай сядзібы калгаса імя Будзённага. Яго вершы «Вайна вайне», «Песня паўстанца», «Гне галіны вецер» і іншыя сталі рэвалюцыйнымі песнямі.

У савецкі час ураджайная на таленты зямля Лагойшчыны нарадзіла шмат дзеячаў літаратуры і культуры. Сярод іх — вядомы паэт і вучоны Ніл Гілевіч, яго паэтычнае слова добра вядома шырокаму чытачу. Любоў да роднага краю і яго духоўных багацццяў, чыстыя і светлыя пачуцці маладых сучаснікаў, роздум над сённяшнім і заўтрашнім днём — галоўныя матывы паэзіі Н. Гілевіча.

З вёскі Задроздзе паходзіць адзін з вядомых беларускіх празаікаў Іван Пташнікаў. Яго пяру належаць раман «Чакай у далёкіх Грынях», аповесці «Лонва», «Тартак» і шэраг апавяданняў, якія прыйшліся па сэрцу чытачу. Пташнікаў — сапраўдны майстар, ён адчувае ўсе шэпты і шолахі маці-прыроды, і не толькі адчувае, але і ўмее перадаць іх, стварыць адпаведны настрой.

Шчодрая на таленты Лагойская зямля. Сапраўды, як сказаў паэт, Лагойшчына — гэта куточак запаветны, дзе здаўна, нібы грыбы, растуць паэты.

С. АКУЛІЧ.

ПРОЗА

ВІКТАР ГАРДЗЕЙ

Гром над сцяргай саломы

АПАВЯДАННЕ

НА СВАЮ ГАНЬБУ і сорам, яна даўно бачыла звычайны сялянскі воз. Стары, пашарпаны воз, даганяючы, ужо блізка пазвоньваў атосамі, рыпеў восямі, і ёй вельмі захацелася пад'ехаць. Нылі стомленыя ногі, у правай руцэ важка адчуваўся ёмісты сакваяж. Саступіўшы на абочыну дарогі, у густую лебяду і касцярогу, яна пачала чакаць фурманку.

У аглоблях быў немалады ўжо конік — марудлівы і хітры, з доўгаю, да самых персяў, грывай. Праходзячы міма, ён нават не скасавурыў вока на абочыну, бо няма дурных браць на воз абы-каго, ды яшчэ з такою цяжкай паклажай. Але жанчына не пакрыўдзілася на рыжага коніка. Яна з радасцю і шчасцем глядзела, як сухі пясок, выхаплены з каляіны гузаватым вобадам, струменьчыкам ацякае назад па жалезнай бліскучай шыне. Кола зачаравала яе ўсяго толькі на імгненне, і яна падняла шэрыя і вялікія вочы на фурмана.

— Гэта ты — Сяргей? Божа мой, няўжо гэта ты?

— Зінка!

Павольны конік зусім непрыстойна чмыхнуў у ноздры, але, адчуўшы знаёмы рух лейцаў, спыніўся паслухмяна і адразу пацягнуўся мордай да зялёнай травы. Пры дарозе паміж касцярогай і лебядой грыўкамі выбілася дзікая канюшынка з белымі і ружовымі кветкамі. Конік выскуб немалое каліва канюшынкі і, падняўшы голаў, ужо раўнадушна каштаваў белыя і ружовыя кветкі. Па вопыце даўгагрывы хітрун ведаў, што яго часцей спыняюць тады, калі ў дарозе сустракаюцца добра знаёмыя людзі.

— Не думала, што першага цябе ўбачу, — сказала, радуючыся, Зінка.

— І я не думаў. Пазнаваў здалёк: ты ці не ты?

— Чаму ж не запрашаеш на сваё таксі?

— Сядай во тут. — Сяргей падварушыў побач з сабой жмак сена, узбіў, як падушку. — Сакваяж давай.

— Ой, асцярожна! Торт у мяне там. На гасцінец маме вязу.

Якраз над возам, у сонечным і спякотным небе, трапечучы крылцамі, вісеў малады і вельмі цікаўны жаўрук. З блакітнай і мройнай вышыні ён бачыў, як жанчына ў расшпіленай зялёнай кофце лезла на воз, і, калі яна, шчасліва засмяяўшыся, асунулася цераз біла Сяргею на рукі, жаўрук мацней затрапятаў крылцамі, зазвінеў галасней і пяшчотней. Нябесны кандуктар падаваў знак рыжаму коніку: усё, можна ехаць. І даўгагрывы зразумеў, што на возе ўсталяваўся поўны парадак. Паматваючы галавой, конік марудна, няспешна пацягнуў воз, а цікаўны жаўрук, абвясціўшы свету, што жанчына ўдала знайшла палёгку сваім нагам, прапаў, кудысьці знік — паляцеў, мусіць, шукаць іншых, такіх жа, як і сам, шчаслівых людзей.

— Хораша тут у вас. Прыволле якое, — азіраючыся вакол, сказала Зінка. Я даўно і забылася, як пяюць жаўранкі.

— А што ім? Маладыя, толькі вывеліся.

Зінка ўжо добра асвойталася на шапаткім сене: скінула туфлі, паварушыла набраклымі пальцамі, проста і шчыра ўсміхнулася Сяргею, зялёнаму полю, спякотнаму і душнаму небу. Тут, на возе, асабліва адчулася, што ногі змарыліся ісці пешкі, а рукі пякуць і смыляць пасля цяжкай ношы. Цяпер Зінцы было прыемна — адпачывалі ногі і рукі, адпачывала стомленае маладое цела, і яна з удзячнасцю паглядзела на рыжага коніка, потым зазірнула ў твар Сяргею. Зблізку ў вочы адразу кінулася, што за гэтыя гады Сяргей пасталеў, узмужнеў, крутыя плечы наліліся неверагоднай мужчынскаю сілай.

— То расказвай, Сяргей, як жывеш? — адводзячы дапытлівы позірк убок, папрасіла Зінка. — Ты ж, здаецца, раней на машыне ездзіў.

— Чаму раней? Я і зараз шафёрам раблю.

— Але ж ты на возе едзеш?

Сяргей быў збянтэжаны, што Зінка ўбачыла яго з вераўчанымі лейцамі і доўгім дубцом у вялікіх парэпаных руках.

— Гэта я пляменніцу сваю на шашу падвозіў,—як быццам апраўдваючыся, растлумачыў ён. — Да нас па гэтай дарозе цяпер ні машыны, ні аўтобусы не ходзяць. Яшчэ ўвесну на бродзе размыла мост, ды толькі канём і льга праехаць.

— Я, мусіць, не перайшла б цераз той брод? — спалохалася Зінка.

— Перайшла б! Вады там па калена. Зняла б туфлі і перайшла б.

— Калі вады не шмат, то, канечне, перайшла б, — супакоілася Зінка.

Рыжы конік, забыты фурманам, цягнуў воз як хацеў — ківаў галавой, марудна ступаў клышаватымі нагамі. Абапал дарогі праплываў зялёны абшар. Цвіла малінавым цветам бульба, у разорах сям-там жаўцела свірэпка, цацачнымі елачкамі стаяў хвошч. Блізка каля бульбоўніка, у лагчыне, зарослай трыпутнікам і бадзяком, хадзіў белы бусел і нешта шукаў там, апусціўшы чырвоную дзюбу. Зінка любавалася каляровым абшарам, але ранейшай радасці ў вачах ужо не было. У яе вачах можна было заўважыць дрэнна прытоены боль і смутак.

— У госці, мабыць, прыехала? — спытаў Сяргей і кіўнуў на сакваяж, які стаяў у перадку воза. — Цяпер, летам, да нас многія з'язджаюцца.

— Якія госці? Назусім вярнулася. Во абрадую маму.

— А дзе ж Валодзя? — здзіўлена ўскінуў бровы Сяргей. — Вы ж такія неразлучныя былі.

— У Іркуцку застаўся. Разышліся мы. Купіла білет, здала рэчы ў багаж і, можна лічыць, ужо дома.

— Чаго ж вы не падзялілі? — спытаў Сяргей і тут жа спалохаўся, што не трэба было малоць такое глупства. — Зрэшты, якая розніца.

— Валодзя, сам ведаеш, гарачы, што кіпень, а я — шалапутная. Во і не паладзілі.

— Муж і жана — адна сатана.

Цыбаты бусел, відаць, ужо знайшоў тое, што шукаў на абмежку поля, паміж кусцікаў бадзяку, трыпутніку і конскага шчаўя, радасна заклекатаў, рэзка падскочыў, як апёкся аб крапіву, і з подбегу лёгка падняўся ў неба. Ляцеў плаўна і спаважна, шырока распластаўшы белыя, з чорнай каймою, крылы і ледзь-ледзь варушачы імі. Бусел, мабыць, ведаў сабе цану, разумеў, што на зямлі ён менш прыгожы, чым у небе, помніў, што людзі заўсёды любуюцца яго палётам, і таму ён павярнуў назад, зусім нізка праляцеў над скрыпучым возам, над пыльнай селавой дарогай.

— Ці праўда, што буслы дзяцей укідаюць у каміны хат? — з журбой у голасе спытала Зінка і доўга глядзела на мройнае неба. — А нас з Валодзяй буслы абмінулі. З-за дзяцей і развод узялі.

— Прыкра вельмі выйшла.

— Хай ўжо будзе, як ёсць. — Зінка скінула з сябе кофту, бо прыпарваць пачало мацней, падставіла грудзі слабаму ветрыку і раптам з цікаўнасцю зазірнула Сяргею ў глыбокія, з густымі вейкамі вочы: — А ў цябе дзеці ёсць?

— Поўная печ.

— Не смейся. Праўду скажы.

— Не, і да мяне не прылятаў бусел.

— Жанаты хоць?

— Адзін жыву, — неахвотна, скрозь зубы выцісну Сяргей. — Маму яшчэ тым летам пахавалі.

Яму, канечне, балела, яму было горка і пакутліва жыць старым халасцяком. Сяргей да дваццаці пяці год не ажаніўся сам, да трыццаці — не ажанілі людзі, а цяпер, мусіць, ужо і чэрці не ажэняць.

— Калісьці ты здорава дзяўчат баяўся, — згадала Зінка. — Але і мы добранькія былі. Смяяліся, кпілі з бедака.

— Не ўспамінай леташні снег!

— Што праўда, то праўда: ціхоняў мы не любілі.

Дарога ўперадзе прыкметна пагоршала. Цераз поле бегла звычайная селавая дарога, і яшчэ з вясны на ёй адціснулі свае глыбокія сляды трактары і машыны, прычэпы і сеялкі. У каляінах пачала трапляцца зялёная, забраснявелая вада, колы да самых восей хаваюцца ў рытвінах і калюжынах. Цягнуць воз стала цяжэй, і конік мацней натужваўся, аж выпроставаўся ў аглоблях.

Дарога спускалася ў лагчыну.

— Хутка брод будзе, — паказаў дубцом Сяргей.

— Вунь за тым алешнікам.

— Ці ж хоць пераедзем?

— Пераедзем, не турбуйся.

Калі алешнік расступіўся, вачам адкрылася шырокая і гразкая ўпадзіна, залітая вадой. Насып дарогі ўперадзе быў размыты, зеўраў глыбокай прамоінай. На тым беразе бязладна скінуты шэрыя бетонныя кадаўбы — з іх будуць рабіць новы мост. Над бродам крылялі ластаўкі, яны звонка шчабяталі, безупынку чыркалі белымі грудкамі аб ваду і зноў, як бы чаго спалохаўшыся, узвіваліся ў блакітнае неба.

Ластаўкі заўсёды купаюцца перад дажджом.

Убачыўшы падводу, яны зашчабяталі галасней, замітусіліся. Рыжы конік мог скаламуціць чысты брод, а такая распуста ластаўкам не падабалася. Але воз, гонячы жоўтыя хвалі, ужо ехаў па вадзе, з-пад капытоў у бакі разляцеліся пырскі. Вада пад коламі ўзбурылася, забурліла — дзве каламутныя дарожкі працягнуліся цераз брод.

Конік пачаў узбірацца на верх насыпа, воз пахіліўся, ледзь што не лёг бокам.

— Падаем! Трымай, Сяргей! — крыкнула Зінка.

Воз усё хіліўся і хіліўся, але Сяргей не спалохаўся, не пабялеў з твару. Яшчэ ж і як добра, што насып такі круты, што воз хіліцца і хіліцца! Зінка страціла раўнавагу, зляцела са свайго месца і з усяго маху ўткнулася ў Сяргея. Незразумела, дзіўна і хораша запахла духамі. Сяргей не хацеў, каб Зінка першай упала ў ваду, і локцем, бо рукі былі заняты, прытрымаў яе, прытуліў да сябе. Якое шчасце, што воз падае разам з гэтым баязлівым і стройным целам, з дзіўным і п'янлівым водарам духоў! Але шчасце, на жаль, было кароткім. У самы небяспечны момант, калі воз ужо ледзь ліпеў на двух колах, Сяргей ачомаўся, зразумеў, што п'янлівы пах не прынясе дабра і моцна тузануў правую ляйчыну. Бедны конік напружыўся з апошняй сілы, не даў упасці Зінцы — адным духам выкаціў воз на грэбень насыпа, проста на здзіўленне выбавіўшы Зінку і Сяргея з вялікай бяды, з гразкага, пахучага і каламутнага броду.

— Ой, сэрца ў пяткі зайшлося! — весела і радасна прашаптала Зінка і не адсунулася на ранейшае месца.

— Маглі б і выкупацца, — сказаў Сяргей і не захацеў разлучацца з п'янлівым і дзіўным пахам духоў.

За бродам дарога была раўнейшай, без глыбокіх каляін і рытвін. Намучаны конік тут пайшоў лягчэй, зарыпелі гужы і драўляныя восі. За бродам было другое поле. Абапал дарогі тут цвіў лён — вялікае блакітнае возера. Прыгледзеўшыся, можна было заўважыць, што запыленыя кветкі пакурчыліся, завялі на санцапёку. Зямля смягла, знемагала ад гарачыні.

— Прыпарвае, аж млосна, — выціраючы потны, чырвоны твар, паскардзілася Зінка.

— Пэўна, дождж будзе.

Сяргей азірнуўся і зразумеў, што стаў цудатворцам, бо, сам таго не ведаючы, сказаў праўду. Фурманку даганяла вялізная ліловая хмара. Ціхая, маўклівая і чамусьці страшная, яна імкліва плыла з-за далягляду, увачавідкі расла, набракала, займаючы ўсё большы абшар неба. Яшчэ не жахалі маланкі, яшчэ не буркатаў гром, але адчувалася, што навальніца будзе лютая і грозная. Ужо і Зінка наструнілася, затурбавалася, улавіўшы нейкія перамены ў прыродзе. Зінка азірнулася ўслед за Сяргеем і здзіўлена прашаптала:

— Хмара, ці што?

— Хмара! І адкуль толькі ўзялася?

— Паганяй, Сяргей. Можа, яшчэ дахаты паспеем.

— Не паспеем.

На ўсялякі выпадак Сяргей тузануў лейцы, у руцэ свіснуў дубец, і конік пабег спарней — зазвінелі атосы, дробна залескацелі лёсткі ў драбінах. Але і хмара не жадала, каб яе абхітрылі, і праз колькі хвілін яна пастаралася засмуціць сваіх ашуканцаў. Схавалася сонца, вакол пацямнела, падзьмуў парывісты вецер. У нізкім паклоне на полі схіліўся лён, па ім з краю ў край пабеглі блакітныя хвалі. Над самымі галовамі сляпуча бліснула маланка, заракатаў гром, і на дарогу, адразу тонучы ў плыўкім, сухім пяску, упалі белыя гарошыны граду.

— Я ж казаў, што не паспеем,— без жалю і крыўды апраўдаўся Сяргей.

— Гузакоў град наб'е,— весела засмяялася Зінка.

Але іх выратаванне было побач. Уперадзе, каля самай дарогі, чарнела сцірта гнілой, яшчэ леташняй саломы — доўгая і ўвагнутая, як старая абора. Паўз бакі тут не раз, відаць, шараваліся каровы, людзі выскубвалі салому, і сцірта была вузейшая знізу, а ўверсе заканчвалася спаховай стрэшкай. Лепшай сховані ад граду і дажджу нельга было прыдумаць, і Сяргей скіраваў каня да шэрай сцірты. Саскочыў з воза, выграб у прэлай саломе кубло, схаваў туды Зінку, а потым зашыўся ў нару сам. Над сціртой ятрылася навальніца, шумеў дождж, ільняное поле было поўнае грому і маланак. Праз адтуліну ў саломе быў відзён бедны конік. Прыгнуўшы голаў, ён стаяў побач, і па доўгай грыве цурком сцякала вада.

— Як уцячэ, тады пешкі пойдзем,— сказала Зінка з прытворным жахам.

— Не ўцячэ, я лейцы сабе да нагі прывязаў,— супакоіў Сяргей.— Калі што-якое, то адразу пачую.

У нары было цёмна, нара пахла цвіллю, мышамі і прэснай саломай, але ніякі пах не мог перабіць тонкага водару жаночых духоў. Зінка, прыціхшы, дыхала побач, і Сяргей, напэўна, быў бы дзіваком, калі б не помніў пра гэта. Яшчэ ў дарозе ён не траціў марна часу і ўпотай выглядзеў, што ў Зінкі стройнае, тугое цела, што ў яе шэрых вачах шмат выкліку і пакоры. Цяпер у яго было менш розных клопатаў, яго хваляванне даўно выспела ў ім. Ён не помніў, як усё гэта зрабілася, а зрабілася гэта само сабой, і Сяргей адчуў пякучы агонь падатлівых губ. Трэба быць шчырым: ён не дужа ўмеў цалавацца і саромеўся сваіх няўмелых, грубых пацалункаў. І Зінка гэта бачыла, разумела, але яна не смяялася, яна не раздымала рук... Божа мой, які ж ён няўдалы і сарамлівы!

Сцірта ўся — ад нізу да верху — прапахла навальніцай і духамі, на свеце быў адзін толькі гэты дзіўны пах. Над сціртай шумела рака вады, недзе, блізка зусім, стрэліў пярун, і Зінка яшчэ мацней прытулілася да Сяргея... Яна адразу не паверыла, потым здзівілася, потым пакрыўдзілася, што Сяргей раптам пачаў знікаць, прападаць у саломе. Яна не пускала яго, учапіўшыся за шыю, але ён упарта ўцякаў ад яе. Знікаў Сяргей неяк дзіўна — паўзком, нагамі назад, хапаючыся рукамі за сцірту. Зінка ўслед за ім выцерабілася з нары, яна хацела вярнуць, хацела спыніць Сяргея.

Яна спачатку знямела, аслупянела, пасля зарагатала. Сяргей усё яшчэ ўцякаў ад яе. Ён поўз па мокрай зямлі, па льнянішчы, шырока распластаўшы рукі, брыкаючыся адной нагой. За другую нагу былі прывязаны лейцы, і Сяргей, як сноп, цягнуўся за возам, не могучы падняцца. Рыжы конік, спудзіўшыся грому, трохі ачухаўся, пашкадаваў таптаць высокі лён і адным махам вымчаў Сяргея на дарогу, у яшчэ большую гразь і макрэчу, у белыя гарошыны граду. Зінка даўно прамокла навылёт, на ёй ужо не было сухога рубца, але яна не зважала на гэта. Яе душыў смех.

— Сяргей, а куды ж ты?

Смех прыдаў Сяргею сілы і злосці. Ён усё ж падхапіўся на ногі, падабраў лейцы. Жоўтая кашуля на ім зрабілася чорнай, на каленях грудамі вісела гразь. На ходу, не атрэпваючыся, Сяргей ускочыў на воз, хапіў з сена дубец і сперазаў коніка па мокрых клубах. Сяргей цяпер па-сапраўднаму наважыўся ўцякаць. Зінка адразу здагадалася, што Сяргей будзе ўцякаць, і кінулася цераз поле. Спатыкаючыся, яна бегла за возам, пакуль Сяргей не зжаліўся, не пашкадаваў яе.

— Ладна! Лезь ужо на воз,— дазволіў ён і паглядзеў на Зінку.

Градавая хмара ўжо мінула льняное поле, чорную сцірту леташняй саломы. Не так сляпуча бліскалі маланкі, усё слабей, аддаляючыся, пагрымліваў гром. Вецер аціхаў. Лівень нарабіў людзям клопату. Лапікамі лён зблытаўся, палёг. Зінка глянула сабе пад ногі і ўбачыла, што дождж выгнюсіў яе зялёную кофту, наліў вады ў чорныя лакавыя туфлі. На рытвінах сакваяж расшпіліўся. У каробцы замест торта на дне ляжала мокрае, раскіслае цеста.

— Вось і прывезла маме гасцінец.

І быццам ад гэтага шалапутная, бесталковая Зінка заплакала, шчыра і горка, наўсхліп, уткнулася ў Сяргеева плячо. І яе раптоўны плач спалохаў, збянтэжыў Сяргея.

— Ты чаго, Зінка? — здзівіўся і разгубіўся ён.

Адной рукой Сяргей трымаў лейцы, кіраваў возам, другой суцяшаў Зінку, гладзіў яе па мокрых валасах, а над полем зноў бралася за пагоду, узбоч дарогі зіхацеў расой паклычаны ,зблытаны лён.

ПАЭЗІЯ

Станіслаў ШУШКЕВІЧ

Голас званоў Хатыні

Роберту Сапчэсу ФЕРЭРУ, кубінскаму кампазітару, аўтару вакальна-сімфанічнай паэмы «Хатынь».

Хіба ж сатрэцца,
Змоўкне, ці згіне
Голас жалобны
Званоў Хатыні?!

Рокатам грому
І навальніцы
Жальба людская
Ляціць праз граніцы.

Голас праклёну,
Роспачы, смерці
Вылюдкам-катам
Ніколі не сцерці.

Боль невыносны
Вялікае згубы
Людзі пачулі
З далёкае Кубы.

Праз акіяны,
Горы, пустыні
Чуецца голас
Мінорны Хатыні.

Свет не забудзе
Гукаў магільных,
Кожны з нас, людзі,
Павінен быць пільным.

Хай жа больш сонца
Ніколі не свеціць
Майстрам вайны
І аматарам смерці.

Хай жа лунае
Над кожнай краінай
Песня братэрства
І дружбы няспыннай.

Юрый Гагарын

Сачыў за ластаўкай
імклівай,
Бывала, часта ён вясной,
З усмешкай радаснай,
шчаслівай,
Заўжды ў марах плыў за ёй.

Калі ад гулу самалётаў
Ўсё прачыналася наўкруг,
Пляскаў далонямі да поту,
Наўскач ляцеў на поле, луг,
Ён падымаў у неба рукі,
Глядзеў, як самалёт знікаў,
З вялікай просьбаю і мукай
Ён наўздагон крычаў, гукаў:
«Мой мілы таварыш, мой
лётчык,
Вазьмі ты з сабою мяне!
Я — ведай — вялікі ўжо
хлопчык,
І ўмею ўжо лётаць у сне»...

Збыліся мары. Наш Гагарын
На караблі ляціць «Усход».
Свет чуе, як грымяць
фанфары,
Яго віншуе ўвесь народ.
Навечна ў космасе
бязмежным
Яго застаўся смелы след.
Яго вітаў, ім ганарыўся,
І вечна помніць будзе свет.

Я жыў паэзіяй цудоўных кніг

Памяці пісьменніка
Уладзіміра ЛІДЗІНА

Над Юрмалаю дожджык
церушыў,
Шумелі Райнісавы сосны
каля мора.
І тут жа побач, у лясной
глушы,
Чуваць быў хваляў
неспакойны шорах.
Глядзеў на плюшч. Ён клён
стары абвіў.
Ля ног цвіла наўкола
медуніца.
Цябе пабачыўшы, адчуў я,
што ў крыві
Далёкай прыязні цяпло
яшчэ бруіцца.
Я жыў паэзіяй тваіх
чароўных кніг,
Гатовы прозу быў на музыку
пакласці.
Сустрэчы момант, толькі
гэты міг,
Быў для мяне і радасцю
і шчасцем.
Ты нам калісьці, бойкім
хлапчукам,
Жадаў да мэты светлай
смела крочыць.
Да праўды і дабра вучыў нас
шлях шукаць,
Як чараўнік умеў
прадбачыць і прарочыць.
Над Юрмалаю дожджык
церушыў,
Ля сосен Райніса былі у нас
сустрэчы,
Застаўся ў сэрцы, у маёй
душы
Твой светлы позірк чысты,
чалавечы.

Бабчына лета

На разорыне свежай
Зацвілі дзьмухаўцы
з васількамі,
На развіліне сцежак
Палыскуецца камень:
Надыходзіць бабчына лета.
Неба цёплае і празрыстае.

Радуецца старая кабета,
Нібы якой урачыстасці.
Гладзіць кляновы лісцік,
Абірае з кусціка павуцінне.
Прыгадала, хадзіла калісьці
На дарогу, гасцінец.
Чакала, што сын яе
вернецца,
Многія ж папрыходзілі...
Аж дагэтуль ёй верыцца,
Што ён у паходзе...
Але ж ліст прыляцеў з-пад
Берліна...
Вербы цвілі вясною.
Кароткая вестка пра сына
Не дае з той часіны спакою.
Не канчаецца бабчына лета.
Неба чыстае, сіняе, светлае.
На разорыне чорнай многа
кветак,
Паглядаюць яны прыветліва.

Выйду я ў дуброву

Я душу лячыў
Тваёю дабратою,
Словам ласкавым,
Тваёй усмешкай,
У сям'і людской
Не быў я сіратою
І не быў былінкай
На паўмежку.
Ка́ня просіць піць,
Лятае ля азёраў,
Кліча дождж.
Хіба вады ёй мала?
Драч у травах
Голасна рыпіць,
Сёння і яму
Чагось не стала.
Крылаў для палёту
Нестае,
Я і не збіраюся
Ляцець далёка.
Салаўі лясныя,
Любыя мае,
Вы ж тут ля мяне —
І я не адзінокі.
Калі мала ласкі,
Кволай дабраты,
Калі ў дзень вясенні
Хтось мяне не чуе,
Выйду я ў дуброву,
Дзе хадзіла ты,
Дзе цябе сустрэў
Калісьці, дарагую.

Мая спадчына

Будаваў людзям дамы,
палацы,
Не стагнаў і не ўмеў хістацца.
Рукі зацвярдзелі з мазалямі,
А мяне ж інтэлігентам
называлі.

Ну якую ж спадчыну пакіну
Ўнуку роднаму, дачцы ці
сыну?..
Калі раптам сплюшчацца
павекі,
Песню хай маю бяруць
навекі.

●

Іншы раз у верш прыходзіць
рыфма
Звонкая, і светлая,
і маладая,
Нібы з лесу казачная Німфа
З'явіцца, з усмешкай
паглядае.

Ты чакаў яе, марнеў і думаў.
Хіба лёгкая ў паэта праца?
Не для ўсіх бывае шчасце
кумам,
І задумам не заўжды
збывацца.

Калі наўпрасткі ў цябе
дарога,
І да мэты смела, мужна
крочыш,
Нечакана прыйдзе перамога
І здабудзеш тое, чаго хочаш.

ТЭАТРАЛЬНЫЯ ДАЛЯГЛЯДЫ

«ВЫЙДЗІ З СЭРЦАМ, ЯК З ПАХОДНЯЙ!»

Да беларускай літаратурнай класікі гэтыя маладыя людзі звярнуліся не таму, што іх абавязваў рэпертуарны план ці падштурхоўвалі кан'юнктурныя меркаванні. Іх самастойныя, у вольны ад «службы» час, заняткі мастацтвам не залежалі ад планаў тэатра, а пра святкаванне стагоддзя Купалы яшчэ на той час ніхто не думаў, не рыхтаваўся. Што ж тады, калі не ўласная цікаўнасць, каштоўная творчая дапытлівасць, вымушала іх звяртацца на прэстыжныя сярод маладых гараджан літаратурныя імёны і ўводзіць у свет сваіх захапленняў хрэстаматыйны аўтарытэт — Янку Купалу!?

Вершы «Мужык», «Спадчына», «А хто там ідзе?», «Арлянятам», «Хлопчык і лётчык», паэмы «Бандароўна», «Курган». ...Вось, без малога, «купалаўскі актыў» часу іх школьнай навукі — гэта ж не сакрэт. Пазней, калі ўжо мінулася студэнцтва і на дарозе мастацтва і жыцця з'явіліся адзнакі іх уласнага вопыту, маладыя энтузіясты самі прыйшлі да паэта. Знаёміліся з ім грунтоўна. Адкрывалі глыбіню, свежасць, жыццёвасць паэтавага голасу, угадвалі біццё яго палкага і чулага, бунтоўнага і відушчага сэрца.

Яны, маладыя творчыя людзі, зачытваліся лірыкай маладога Янкі Купалы. І ўрэшце вылучылі нізку вершаў, на аснове якіх падрыхтавалі своеасаблівы паэтыка-драматычны, прасякнуты музыкай спектакль «Выйдзі з сэрцам, як з паходняй!»

Хаця дагэтуль мы карысталіся надакучліва-няпэўным займеннікам «яны», лімаўскі чытач, мусіць, ужо расшыфраваў, пра чыю работу ідзе гаворка. Артысты мінскіх тэатраў В. Шушкевіч, А. Жук, А. Кармунін, В. Саладзілаў, В. Філатаў, кампазітар А. Залётнеў, мастак-дэкаратар «Беларусьфільма» У. Матросаў. Радаслоўная іх супольнай творчасці пачынаецца з колішніх аматарскіх спектакляў тэатральнай студыі «Юнацтва» клуба беларускіх чыгуначнікаў імя Ільіча. Жыццёвыя дарогі развялі іх па розных калектывах, розная ў іх «служба», ды па-ранейшаму гэтыя захопленыя мастацтвам аднадумцы «аб'ядноўваюць» свой вольны час для самастойнай сумеснай творчасці. Гэта і адпачынак і незнарочысты прафесійны трэнаж, і спакушальная магчымасць пачынаць з нуля, працаваць над зусім новым матэрыялам, усё рабіць сваімі рукамі — ад інсцэніроўкі да светлавога афармлення, ад рэмарак у сцэнарыі да арганізацыі мізансцэны, ад гукавога суправаджэння да рэжысуры ролі...

Зрэшты, нам ужо даводзілася сёе-тое паведамляць пра гэты тэатр па-за тэатрам, сярод арыгінальных работ якога — «Велімір Хлебнікаў», «Лісткі паэтычнага календара» (паводле вершаў і дзённікавых запісаў М. Танка), «З выпадку мокрага снегу...» (паводле твораў Ф. Дастаеўскага), паказаныя ў Рэспубліканскім Доме работнікаў мастацтваў, у Доме літаратара, у клубах прадпрыемстваў і ўстаноў.

Ёсць у артыстаў задума: яны вывучаюць матэрыялы У. Вярнадскага, К. Цыялкоўскага, А. Чыжэўскага — мяркуюць пра спектакль на касмічную тэму. Аднак цяпер яны з асаблівым пачуццём вяртаюцца да кампазіцыі «Выйдзі з сэрцам...», пільна вывяраюць усе штрыхі, акцэнты ў яе партытуры: напярэдадні купалаўскага юбілею яна мусіць напоўніцца новым дыханнем. Сёлета ўжо адбыўся паказ у клубе вытворча-тэхнічнага аб'яднання імя У. І. Леніна.

Аналагічна таму, як нельга перадаць словамі вобразны змест музычнага твора, так амаль немагчыма «пераказаць» увасобленую кампазіцыю, дзе, як у партытуры, распісаны «па галасах» Купалавы вершы і гучанне гэтых галасоў адценена сродкамі тэатра.

Здаецца, каб не ведаў, што гэтыя вершы раскіданы па розных тамах збору Купалавых твораў, успрыняў бы ўсю кампазіцыю як своеасаблівую драматычную кантату — уражанне зусім цэласнага твора. І нібы дзіўная, відочная поліфанія поўніць тут лірычнае «я» Паэта: дыялогі-спрэчкі і дыялогі-сумненні, дыялог-роздум, назіранні, замалёўкі, настроі («Памяці С. Палуяна», «Разлад», «Прыстаў я жыць...» і г. д.)... На скрыжаванні акцёрскіх рэплік, вымаўленых сакавіта, з адчуваннем смаку жывога слова, — каларытнае гучанне цымбалаў, гармоніка, скрыпкі, цеплыня акапэльнага спеву (беларускія песні выконваў В. Саладзілаў, у фальклорнай карціне «На Купалле» ўдзельнічалі выкладчыкі дзіцячых музычных школ, партыя фартэпіяна — аўтар музыкі А. Залётнеў).

Самабытны драматургічны малюнак спектакля ўтвораны некалькімі лініямі: «вечны голад кветкі-шчасця» («У купальскую ноч»), усведамленне паэтавай долі («Я не паэта»), абуджэнне нацыянальнай і сацыяльнай самасвядомасці, ушанаванне бацькоўскага слова, што зжылося з намі, «як бы корань з дрэвам, як бы з небам сонца» («Роднае слова»), канфлікт сумленнага мастака з «тутэйшым» абывацелем, які жыве па прынцыпе: «па колькі ж нам дасі чырвонцаў, калі мы пойдзем за табой?» («Парок»), заклік да новай вясны і вера ў «хлопцаў непакорных» («Дзе вы?») ...І жаляцца «грайкія струны», чуецца «розгалас песні забытай», «за думкаю думка снуецца». Блізкім робіцца сэрца жар «добрай доляй пасланага паэта» і зразумелым — кліч яго: «Не гасіце веры».

«Метраномныя» рытмы першага верша («Так... не...») перагукаюцца з паэтычным роздумам пра час у заключных радках кампазіцыі («За годам год»). Мы лічым гадзіны; мы прад'яўляем рахунак часу, а час — нам...

Вядома, многія прафесійныя і самадзейныя тэатры ў рэспубліцы звярталіся, звяртаюцца ды звернуцца яшчэ не раз да «Паўлінкі», «Раскіданага гнязда», «Прымакоў» ці прапануюць свае сцэнічныя версіі купалаўскіх паэтычных твораў. Пра Купалу і сённяшні тэатр напісана шмат і будзе яшчэ напісана. І добра, калі ў летапісе нашага тэатральнага жыцця застанецца сціплы, але вельмі дарагі для памяці пра паэта радок. Радок пра бескарыслівую справу невялікага творчага калектыву, пра моладзь, якая «чыстым сэрцам, вольнай думкай», прыняла святло паэтавай паходні і служыць мастацтву.

Іх выступленні перад рознай аўдыторыяй былі б больш стабільнымі, калі б не арганізацыйныя праблемы. Творчая праца на самадзейных асновах залежыць не толькі ад вольнага часу артыстаў, але і ад пастановачных умоў: ад пазычанага рэквізіту, ад забяспечанасці памяшканнем для рэпетыцый і сцэнічнай пляцоўкай. І, вядома, ад запрашэнняў выступіць.



Сёлетняе выступленне ў клубе ВТА імя У. І. Леніна.
Фота А. ДЗМІТРЫЕВА.

На прадпрыемствах, у многіх установах ёсць клубы, дамы, палацы культуры для тых, хто аддае свой вольны час мастацкай творчасці. Для паказу самастойных работ акцёраў, «прапісаных» у розных тэатрах, ніякай клубнай сцэны не прадугледжана. На залу Рэспубліканскага Дома работнікаў мастацтваў ці, скажам, Дома літаратара яны не маюць фармальнага права.

Можа, Беларускае тэатральнае аб'яднанне, Бюро прапаганды літаратуры СП БССР звернуць увагу на гэтую цікавую творчую групу і дзейсна дапамогуць ёй у вырашэнні арганізацыйных пытанняў?

С. БЕРАСЦЕНЬ.

ЗРАЗУМЕЛА БЕЗ ПЕРАКЛАДУ

«Украіна ўзрушана мастацтвам сяброў... Украінскі глядач захапляецца... Беларускім артыстам апладзіруюць Харкаў і Марыупаль», — пад такімі назвамі паведамлялі газеты пра вялікае летняе падарожжа Першага БДТ (Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы) пяцьдзесят гадоў назад. У 1931 г. калектыў на чале з Еўсцігнеем Міровічам выправіўся на гастролі з лепшымі спектаклямі свайго рэпертуару, якія былі паказаны ў Кіеве, Харкаве, Адэсе і Марыупалі. Грамадзянасць Савецкай Украіны адзначала ідэйна-творчую сталасць і мастацкую адметнасць гасцей з Беларусі. Асабліва вялікі поспех мелі спектаклі па п'есах, напісаных аўтарамі менавіта для Першага БДТ: «Мост» Я. Рамановіча, «Гута» Р. Кобеца і «Міжбур'е» Д. Курдзіна. Дарэчы, у тым жа 1931 г. у перакладзе на ўкраінскую мову «Гуту» паказаў Дзяржаўны ўкраінскі драматычны тэатр імя М. Занькавецкай, а «Мост» — Рабочы тэатр у Кіеве. Гледачы і крытыка тады вылучалі таленты У. Крыловіча, У. Уладамірскага, Б. Платонава, Л. Ржэцкай, В. Галіны, Г. Грыгоніса, М. Зорава.

Пасля гастроляў Першага БДТ 1931 года абмены калектывамі паміж Украінай і Беларуссю сталі традыцыйнымі. Як незабыўныя падзеі прыгадваюцца тэатраламі выступленні ў Мінску, Віцебску, Гомелі вядучых артыстычных сузор'яў з тэатраў Кіева, Харкава, Львова, Адэсы, дзе так шчодра праменілі натхненнем і майстэрствам А. Бучма і М. Крушальніцкі, Н. Ужвій і Г. Юра, Б. Раманіцкі і В. Чысцякова, А. Сярдзюк і І. Мар'яненка. Садружнасць дзеячаў сцэны братніх рэспублік спрыяе пашырэнню рэпертуарных далягляданў. Дастаткова прыгадаць хоць бы такі факт: на беларускай мове былі сыграны ўсе п'есы Аляксандра Карнейчука, Купалаўцы і коласаўцы звяртаюцца да твораў М. Стэльмаха і В. Міньки, Я. Яноўскага і М. Ірчана, а іх украінскія калегі ставяць камедыі і драмы К. Крапівы, А. Макаёнка, І. Шамякіна, А. Петрашкевіча, А. Махнача, Я. Шабана...

І сёлета ідзе ажыўлены абмен паміж тэатральнымі калектывамі. У Севастопалі, Цярнопалі, Івана-Франкоўску, Прылуках, Хмяльніцкім гледачы пазнаёміліся і будуць знаёміцца з лепшымі работамі сезона, якія там паказваюць пасланцы Гомеля, Гродна, Магілёва, Бабруйска, Брэста. Афішы гасцей з Беларусі запрашаюць на спектаклі, прысвечаныя змаганню чалавека за лепшую будучыню, на творы розных жанраў сучаснай і класічнай драматургіі.

К. ТУР.

ДОЎГІ ШЛЯХ ДА СЯБЕ

Толькі што скончылася рэпетыцыя канцэрта харэаграфічнага вучылішча. Будучыя артысты, разгарачаныя, узбуджаныя выступленнем, з азартам абмяркоўвалі ўдалыя і не вельмі ўдалыя нумары сяброў. Да Таццяны Яршовай падышла Натэла Дадзішкіліяні. Праз некалькі дзён, ужо ў канцэрце, Натэла мелася танцаваць партыю галоўнай гераіні з балета «Пахіта», першую вялікую партыю ў сваім жыцці. Асобныя рухі-«звязкі» ў яе не атрымліваліся належным чынам. Таццяна паказала, растлумачыла (яны добра разумелі адна адну на мове жэстаў і рухаў) і міжволі прыгадала сваю першую ролю на сцэне, і тое хваляванне дэбютанткі, і няўпэўненасць, і нават жах. У канцы першага сезона ёй, артыстцы Рыжскага тэатра оперы і балета, «зялёнаму» пачаткоўцу, прапанавалі рыхтаваць партыю Машы ў «Шчаўкунчыку». Яна разгубілася. Вядома, і яе аднакурснікі, і яна сама яшчэ ў вучылішчы ведалі «тэксты» ўсіх класічных балетаў, бо кожны вольны вечар праводзілі ў глядзельнай зале тэатра. Але вядучая партыя?..

Прызванне, шчырае захапленне, адзінае, на ўсё жыццё... Яно пачынаецца, калі тое, што існавала неяк па-за межамі твайго быцця, адкрывае свой патаемны, загадкавы і такі прывабны свет. Ёй, пяцігадовай дзяўчынцы, свет танца адкрыўся на спектаклі Рыжскага тэатра оперы і балета. Хто мог тады сказаць, што праз дзесяць гадоў у гэтым самым спектаклі адбудзецца яе дэбют на прафесійнай сцэне? А пакуль што, вярнуўшыся дадому, Таня пазбірала ўсе шалікі і газавыя хусткі, якія меліся ў хаце. І змайстравала сабе «ўсходні касцюм», на манер толькі што ўбачанага.

Сарамлівая, ціхая дзяўчынка, якая звычайна хавалася за спіны іншых, а тут адкуль што бралася! — адчувала сябе вольна і ўпэўнена, пачаўшы танцаваць. А колькі імправізацый было! І гэтак яна дакучала ўсім сваімі танцамі, што ў бацькоў выйсця іншага не было, як аддаць Таццяну ў харэаграфічнае вучылішча.

...Мы размаўляем у яе грымёрнай. На сцяне, нібы велізарны казачны матыль, прымацаваўся балетны пачак. Побач здымкі: камера зафіксавала танцораў у імгненні палёту; партрэт вядомага савецкага танцоўшчыка Аляксея Ермалаева. На століках артыстычнага пакоя люстэркі, мноства пар туфлікаў, загадзя падрыхтаваных да спектакля.

Кволая танклявая постаць, цёмныя выразныя вочы на хударлявым твары, цёмныя гладкія валасы. Таццяна Яршова, адна з вядучых салістак Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР, лаўрэат міжнародных конкурсаў артыстаў балета ў Варне і Маскве. Мы размаўляем пра яе ролі, апошнія прэм'еры тэатра, колішнія конкурсныя ўражанні, пра яе вольны час, любімыя кнігі. І наша гутарка міжволі вяртаецца да адной тэмы: тэатр, балет.

— Магчыма, вам здасца гэта дзіўным, але звычайна не проста чытаю, каб цікава правесці вольную хвіліну ці адпачыць. Вельмі часта шукаю матэрыял для вобраза сваёй гераіні. Так было, напрыклад, калі, рыхтуючыся да ўдзелу ў спектаклі «Рамэа і Джульета», я перачыт-

ГАЛАСЫ І ФАРБЫ РОДНАГА КРАЮ

Віцебшчына ганарыцца, што бацька беларускага тэатра Ігнат Буйніцкі — яе сын. Тут, у полацкім куце, нарадзіўся ён і душой адкрыў хараство і драматызм рэальнага жыцця, непаўторную прыгажосць чалавека і чалавечых памкненняў, прыгажосць блакітных азёр і зялёных гоняў... Кажуць, калі Ігната Цярэнцьевіча пыталі, адкуль ён родам, у адказ чулася трапяткое і ганарлівае: «З-пад Полацка!» Мабыць, вымаўляючы гэты своеасаблівы пароль, ён у думках пераносіўся ў родны фальварак Палівачы (тады Празароцкай воласці). І калыханка была для яго — калыханка, якую спяваюць тамтэйшыя мацяркі. І вясельныя песні — тыя, «з-пад Полацка». І рэкруцкія, і каляндарныя, і жартоўныя...

На пачатку самастойнай працоўнай дзейнасці І. Буйніцкі, маючы за плячамі землямернае вучылішча ў Рызе, быў каморнікам і аб'ездзіў (ды і выхадзіў) не адну сотню вёрст па Віцебшчыне і Вілейшчыне. І дагэтуль яшчэ ад старых можна, бывае, пачуць ці то легенду, ці то нагалоску аб тым, як на вячорках заслухваўся з зажмуранымі ад асалоды вачамі «пан Буйніцкі», калі жаночыя галасы выводзілі журботную песню сэрца... Ёсць звесткі пра цікавасць маладога каморніка да тэатральнай справы, у прыватнасці, кожны візіт у Вільню вёў яго на спектаклі артыстаў — прафесіяналаў і аматараў. Вядома, што ён наведваў заняткі Віленскай студыі драматычнага мастацтва, якая мела дзіўнаватую назву «студыі вольнага мастака Казіміра». І яшчэ дайшло да нас, што ніколі не разлучаўся І. Буйніцкі са скураным сшыткам, куды нешта запісваў і запісваў. Дапытлівасць і спрыяла яго смелым эксперыментам. Калі наладжваліся першыя рэпетыцыі і выступленні хору і танцавальнай трупы І. Буйніцкага, то ў аснове ўсіх нумароў былі музычныя рэдакцыі і аранжыроўкі, вядомыя па жыццёвым іх бытаванні на Віцебшчыне, «пад Полацкам».

Вядома, сам энтузіяст тэатральнай справы быў апантаным прапагандыстам нацыянальнага мастацтва, здатнага абуджаць чалавечую годнасць і свядомасць у тыя змрочныя гады. Толькі не абмяжоўваўся ён этнаграфічнымі задачамі. Па праграмах тых вечароў, што наладжваліся з самага пачатку дзейнасці паплечнікамі І. Буйніцкага, бачыш зусім ясную грамадска-сацыяльную скіраванасць яго выканаўчай творчасці.

Пафас усёй дзейнасці Ігната Буйніцкага — гэта намаганне абудзіць у беларускіх працоўных чалавечую годнасць. Сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне — вось ідэал гэтага чалавека, які «выламаўся» са свайго класавага асяроддзя і прысвяціў сябе справе народа. Тым ён і заслужыў павагу Цёткі (А. Пашкевіч), Янкі Купалы, многіх перадавых дзеячаў беларускай культуры свайго часу. Пецярбург і Вільня, прымаючы калектыў І. Буйніцкага, заўсёды выказвалі захапленне этнаграфічнай адметнасцю яго рэпертуару, творчай сталасцю інтэрпрэтатараў і пастаноўшчыкаў, майстэрствам выканаўцаў. Запісы і апрацоўкі І. Буйніцкім беларускіх народных песень і танцаў, калекцыя арнаментаў і нацыянальнай вопраткі, аб'яднанне вакол хору, харэаграфічнай трупы і тэатра здольных маладых людзей, якіх ён згуртаваў і выхоўваў на гуманізме і рэвалюцыйна-дэмакратычных ідэалах, нястомныя вандраванні-падарожжы па родным краі, па ўсёй Беларусі, — заслуга перад сучаснікамі і нашчадкамі вялікая. Калі ж да гэтага дадаць вялікае маральнае напружанне, з якім Ігнату Цярэнцьевічу даводзілася пераадольваць цэнзурныя перашкоды, пагарду чыноўнікаў, матэрыяльныя цяжкасці, то яго подзвіг робіцца яшчэ больш велічным. Нават тады, калі тэатр Буйніцкага быў вымушаны спыніць сваю дзейнасць, ён сам не апусціў рукі, а далей збіраў сілы для новага — другога — тэатра, якому замінала разгарнуцца першая сусветная вайна.

Дзякуючы яго нястомнай працы (штодзённай і самаахвярнай!) наша сцэна наблізілася да таго ўзроўню, калі стварэнне прафесійнага тэатра стала відавочнай неабходнасцю, гістарычнай заканамернасцю. Ігнат Цярэнцьевіч паспеў і тут перадаць эстафету творчай няўрымслівасці тым, хто закладаў у 1917 годзе Першае таварыства беларускай драмы і камедыі, паспеў запаліць сэрцы маладых дзеячаў, захапіць сваёй верай і сваім працалюбствам паслядоўнікаў.

Вядома, перадача традыцый ад пакалення да пакалення — працэс дыялектычны. Тут прасталінейнасць не заўсёды прыдатная пры аналізе і высновах, і усё ж у купалаўскай «Паўлінцы» (дарэчы, камедыю Я. Купала напісаў пад уплывам сяброўства з Буйніцкім), якая так доўга жыве на сцэне ў Мінску, у нашай пастаноўцы «Несцеркі» або ў цяперашнім «Сымоне-музыку» паводле паэмы Я. Коласа, у самой паэтыцы такіх сцэнічных работ пільнае вока тэатрала заўважае плынь той крыніцы, якую называюць тэатрам Ігната Буйніцкага. І ў драматургічных пошуках жанравай адметнасці А. Макаёнка, у прыватнасці, ў «Трыбунале», ёсць штосьці няўлоўнае ад таго, чым славуты тэатр Ігната Буйніцкага. І наперадзе яшчэ старанное вывучэнне і выкарыстанне гэтага нашага нацыянальнага багацця.

Нізкі паклон табе, Ігнат Буйніцкі «з-пад Полацка»!

Л. БАЗАН,
навуковы супрацоўнік краязнаўчага музея.
Віцебск.

вала Шэкспіра... Або шукаеш патрэбны настрой, лад думак і пачуццяў, нейкую сугучнасць будучаму спектаклю. Ведаеце, заўважыла цікавую рэч: калі адчуваеш, што кніга табе зараз замінае, перашкаджае цалкам сканцэнтравацца на тым, чым ты заняты як артыст, як выканаўца, дык губляеш цікавасць да яе, якой бы займальнай яна ні была. І рашуча адкладваеш убок.

— Што ж дапамагае «ўвайсці» ў ролю? — пытаюся я.

— Гэта справа вельмі індывідуальная. Некаторыя артысты шукаюць рысы характару свайго героя ў час рэпетыцый. Іншыя.. Вось стаіць чалавек за кулісамі, чакае свайго выхаду. Святло, сцэнічнае адзенне, «наэлектрызаваная» глядзельная зала, музыка ягонай варыяцыі — вось патрэбнае яму паветра для таго, каб імгненна, «спантанна» ўключыцца ў волю. Я ж галоўную частку работы над вобразам імкнуся зрабіць дома, сам-насам з музыкай, з пласцінкай, і без выкананага «хатняга задання», не падрыхтаваўшыся менавіта да сённяшняй рэпетыцыі ў тэатр ніколі не прыходжу.

Што датычыць непасрэдна пераўвасаблення... Мне здаецца, што гэта, па сутнасці, псіхалагічная настройка на спектакль, якая доўжыцца некалькі дзён. У дзень выступлення, апрача штодзённага «ўрока», у рэпетыцыях ты не заняты, адпачываеш. Але гэта не значыць, што можна пайсці ў кіно ці завітаць да знаёмых. Калі твая ўвага цалкам канцэнтруецца на спектаклі, на тваёй ролі, дык ёсць гарантыя, што ўсё пройдзе няблага. Вось чаму так цяжка танцаваць спектакль, калі ты замяняеш захварэўшага таварыша (разам з Сашам Мартынавым нам даволі часта даводзіцца гэта рабіць).

Любімыя партыі артыста, ролі, аб якіх ён марыць — магчыма, не новыя пытанні, але гэта заўсёды цікава, бо акрэслівае накірунак пошукаў творчай асобы.

— У мяне ніколі не было так, каб я думала: як было б цудоўна, каб мне далі гэтую ролю, або не!.. Лепш тую. Мяне заўсёды непакоіла думка, быццам я нешта недарабіла, недапрацавала ў папярэдніх ролях. Калі мы заканчвалі вучылішча, дык не будавалі паветраных замкаў, не цешылі сябе думкай, што адразу будзем танцаваць галоўныя партыі. «Амуры», «кветкі»? Добра. Невялічкая варыяцыя — таксама добра. Так настройвалі, так арыентавалі нас педагогі. Мне здаецца, ёсць у гэтым педагагічная мудрасць: у маладога артыста не ўзнікае тады пераацэнкі сваіх магчымасцей, а потым расчаравання, калі шлях да вялікіх партый аказваецца не такім лёгкім і пераможным, як здавалася спачатку.

Я слухаю і прыгадваю даўняе ўражанне. Пяць гадоў назад, у час І Усесаюзнага фестывалю творчай моладзі тэатраў оперы і балета, які праходзіў у Мінску, Таццяна Яршова і яе партнёр Аляксандр Мартынаў выконвалі галоўныя партыі ў «Лебядзіным возеры». Мінскага гледача ўразіла ўпэўненасць і свабода, з якой артысты трымаліся на сцэне, наяўнасць выдатнай школы, бездакорная чысціня і элегантнасць выканаўчай манеры. Праз нейкі час Яршова і Мартынаў сталі салістамі беларускага тэатра. Гэта быў прынцыпова важны момант творчай біяграфіі кожнага з іх. Яны тады казалі ў інтэрв'ю, ды і зараз прытрымліваюцца той думкі, што, вядома, у рыжскім тэатры, дзе пачынаўся іх самастойны шлях, у іх быў даволі багаты рэпертуар: «Капелія», «Карсар», «Бахчысарайскі фантан», «Полымя Парыжа», але востра сучасных балетаў — нечаканых, смелых, арыгінальных, якія яны ўбачылі ў час фестывалю ў выкананні беларускіх артыстаў, — не было.

Першыя партыі, у якіх мінскі глядач пабачыў Таццяну Яршову (Адэта-Адылія, прынцэса Аўрора ў «Спячай красуні», Жызэль у аднайменным балеце, Кітры ў «Дон Кіхоце», Джульета), здаваліся ўвасабленнем хараства, жаноцкасці, вытанчанай зграбнасці. Выкананне іх было адзначана акадэмізмам, густам, строгасцю стылю. Старанна адшліфаваныя, яны асацыіраваліся з ювелірнай работай. У агульным хоры талентаў балетнай трупы тэатра загучаў адметны голас.

Выканаўчай манеры Т. Яршовай чужая самамэтная эмацыянальнасць, адкрыты тэмперамент, вонкавая кідкасць, імкненне да «завышанай» экспрэсіі, якая магла б парушыць агульную цэласнасць пластычнага малюнка. Яна заўсёды застаецца ў рэчышчы танца класічнага. Калі меркаваць па шматлікіх спектаклях, ёй цікавы не асобныя пластычныя знаходкі, а дакладнасць, чысціня танца ўвогуле. Змякчаючы рэзкасць, дысанансы пластычнай мовы, яна звычайна надае абліччу сваёй гераіні высакароднасць, гарманічнасць, суразмернасць.

Гераіні Т. Яршовай — са спектакляў розных часоў, розных харэаграфічных стыляў, яны размаўляюць на рознай харэаграфічнай мове. Але ўсім ім уласціва жыццярадаснае, аптымістычнае светаадчуванне. Унутрана спакойнае, «ураўнаважанае» мастацтва Т. Яршовай імкнецца да гармоніі, суладдзя з навакольным светам. Яе гераіні — лірычныя, пяшчотныя — поўныя непахіснай веры ў перамогу светлых пачаткаў жыцця.

І ўсё ж чагосьці не хапала тым першым яе ролям — нейкага «чарцяняці», ці што... Чагосьці нечаканага і разам з тым унутрана апраўданага, заканамернага. Здавалася часам, што не ролі гэта, а канцэртныя нумары — калі за скульптурнасцю рухаў, дакладнасцю малюнка гублялася жывое дыханне вобраза, непасрэднасць думак і пачуццяў, якія нарадзіліся тут, на сцэне. Традыцыйны тэкст роляў не быў афарбаваны арыгінальнасцю інтэрпрэтацыі, непаўторнасцю ўласнага бачання. Індывідуальнасць балерыны здавалася «рэччу ў сабе».

Вось такое — крыху дваістае ўражанне засталося ад першых яе спектакляў: было прыемна, што ў трупе з'явілася тэхнічна моцная, падрыхтаваная артыстка (пра тое, што многія нашы балерыны вучацца ў Яршовай, арыентуюцца на яе, пераймаюць яе вопыт, даводзілася чуць неаднойчы), і ўсё ж непакоіла пытанне пра яе далейшае творчае развіццё.

Неяк, амаль выпадкова, трапіла я на балет «Ліза і Кален» Л. Герольда, пастаўлены ў Мінску А. Вінаградавым, — жыццярадасны, камедыйны, дасціпны. Партыю сялянскай дзяўчыны Лізы, адну з лепшых у балетным рэпертуары, выконвала Таццяна Яршова. Я глядзела і... не магла паверыць: няўжо гэта яна? Дзе ж ранейшая халаднаватая строгасць, стрыманасць? Адкуль свабода адчування сябе не толькі ў танцы, але і ў пантаміме? Вобраз зіхацеў мноствам фарбаў: жвавасць і гарэзлівасць, непасрэднасць, здатнасць на ўсялякія жарты і хітрыкі. Гэтая Ліза марыла пра свайго каханага Калена, «слухала» вымову маці, «гутарыла» з сяброўкамі, займалася гаспадаркай і прала кудзелю, і ўсюды была натуральнай. Танец, які спалучыўся з яркай мімікай, жэстам, выразнай драматычнай ігрой артысткі, стварыў абаяльны і прывабны вобраз. Камедыйны жанр аказаўся Т. Яршовай вельмі «да твару».

Потым я паглядзела яе Нэле ў «Цілі Уленшпігелі», Кармэн у «Кармэн-сюіце» і пераканалася, што спектаклі сучаснай харэаграфіі ў поўным сэнсе слова адкрылі беларускаму гледачу новую, іншую Таццяну Яршову.

Што гэта: адбылася адаптацыя артысткі? Вальней адчула яна сябе ў калектыве, а таму і на сцэне? А можа, «растанцавалася»? Так. Але яшчэ, мабыць, плённым аказаўся напрамак пошукаў сучаснай харэаграфіі, яе ўплыў на мастацкае аблічча выканаўцы. (Зазначу мімаходзь, што сучасныя спектаклі адкрылі новыя грані таленту ўжо вядомых беларускіх балерын і танцоўшчыкаў: Уладзіміра Іванова, Вольгі Лапо, Людмілы Цярэнцевай). Вольная «мова» сучаснай харэаграфіі не засмуціла класічна чыстага і яснага светаўспрымання гераінь Яршовай, але дапамагла балерыне больш арганічна адчуць сябе ў пластычных маналогах, развіла ўменне напоўніць кожны рух псіхалагічна апраўданым зместам. Кажуць, што калі мастак, акцёр, рэжысёр здолеў зрушыцца хаця б на некалькі сантыметраў уперад у параўнанні са сваімі папярэднікамі, з сабой учарашнім, дык такі чалавек можа лічыць сябе шчаслівым і спадзявацца, што ён працуе не дарэмна. Чамусьці я думаю, што такім шчаслівым чалавекам можа сябе лічыць і Таццяна Яршова.

Т. МУШЫНСКАЯ.

На здымку: Таццяна Яршова і Аляксандр Мартынаў у вялікім класічным па з балета «Пахіта».
Фота А. ДЗМІТРЫЕВА.

МАСТАК І ЖЫЦЦЁ

У дрэва песняй адгукнецца

Штрыхі да партрэтаў магілёўскіх разьбяроў па дрэве Георгія ДАНІЛОВІЧА і Уладзіміра ІСАЧАНКІ

КАЛІ ДА ДРЭВА дакранецца разец таленавітага майстра, яно пачынае другое жыццё, значна даўжэйшае за звычайнае. Дрэва — самы распаўсюджаны будаўнічы, архітэктурны і мастацкі матэрыял, які падаравала нам прырода. Яно можа быць ледзь не снежнай белізны і амаль чорным, падатлівым і цвёрдым, лёгкім і важкім, але заўжды — высакародным, прыгожым, чуйным і жывым.

Менавіта гэтыя якасці дрэва вабяць народных майстроў, натхняюць думку і фантазію прафесійных разьбяроў.

У апошнія гады ў мастацкай апрацоўцы дрэва, як і ў шэрагу сумежных галін дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, адбываецца складаны працэс якасна новага пераасэнсавання спадчыны. Разьба па дрэве ўзбагачаецца новымі жанрамі, стылістычнымі і тэхналагічнымі знаходкамі і, галоўнае, самабытнымі таленавітымі творамі.

Пачынаючы з рэспубліканскай выстаўкі 1976 года «Слава працы», мы штогод сустракаемся ў экспазіцыях з работамі магілёўскіх разьбяроў Георгія Даніловіча і Уладзіміра Ісачанкі.

Георгій Даніловіч да прыезду ў Магілёў закончыў Мінскае мастацкае вучылішча, працаваў у рэспубліканскім Доме народнай творчасці, займаўся афарміцельскай дзейнасцю. Увесь гэты час у духоўным жыцці мастака ішоў пошук сябе як творчай асобы. Знайсці свой напрамак у мастацтве дапамаглі, на першы позірк, выпадковыя акалічнасці. Перш за ўсё — гэта паездкі з сябрамі па рэспубліцы ў пошуках фальклорнага матэрыялу і знаёмства з работамі народных майстроў. Уражанні, гутаркі, замалёўкі навялі на думку перадаць праз прызму прымавак і прыказак выяўленчымі сродкамі шматгранны і багаты характар беларусаў. Па-другое, якраз у гэты час адбылася сустрэча Даніловіча з выкладчыкам студыі выяўленчага мастацтва Палаца піянераў Валодзем Ісачанкам. У яго асобе Даніловіч знайшоў не толькі талевітага разьбяра з прафесійнай вывучкай (Уладзімір закончыў Бабруйскае мастацкае вучылішча), але і мастака-аднадумца. Пытанне аб канчатковым выбары матэрыялу для здзяйснення задуманага больш не існавала. Дрэва было абрана аднойчы і назаўжды.

Сумесная праца пачалася з невялікай, але шматабяцаючай замалёўкі «Не святыя гаршкі лепяць», якая вырасла праз некалькі год у цікавую серыю «Мудрыя дарадцы».

Сёння творчы багаж мастакоў даволі важкі: створана больш за паўсотні драўляных пано рознага тэматычнага зместу і дэкаратыўнага рашэння. Частка з іх была прадстаўлена на васьмі рэспубліканскіх выстаўках мінулага пяцігоддзя.

Першае выставачнае пано «Вяселле» вылучылася з ліку іншых дэкаратыўных работ высокім узроўнем майстэрства, свежасцю і арыгінальнасцю інтэрпрэтацыі старажытнага абраду, шчырасцю і цеплынёй сапраўды народных персанажаў. Пры значнай прасторавай актыўнасці кампазіцыя «Вяселле» вельмі лаканічная: пяць самастойных рэльефаў трапна і выразна перадаюць атмасферу беларускага вясельнага застолля.

Камічнае, па-народнаму сакавітае аблічча знайшлі мастакі для сваіх герояў і ў наступнай рабоце «Калі робіш у купе, не баліць у пупе». Характэрна, што ў гэтых творах аўтары ў першую чаргу выкарыстоўваюць магчымасці матэрыялу, яго «ўнутраны патэнцыял». Разьбяры аддаюць перавагу добра адшліфаванаму, нефарбаванаму дрэву, арсенал выяўленчых сродкаў якога складаецца з прыгажосці натуральнага колеру і фактуры, спалучэння адценняў разных і гладкіх паверхняў, ужывання накладных частак.

Адразу відавочна, што творчы почырк, які акрэсліваўся ўжо ў папярэдніх работах, прынцыпова адрозніваўся ад вядомых стыляў і тэхнік прыбалтыйскіх і ўкраінскіх майстроў. Сёння, калі ён набыў рысы трываласці і самабытнасці, можна больш паглыблена прааналізаваць яго своеасаблівасці і адшукаць вытокі ўзнікнення.

Перш за ўсё трэба адзначыць глыбокае вывучэнне і пераасэнсаванне мастакамі набытага за стагоддзі прафесійнага вопыту разьбы па дрэве. Літаратурныя крыніцы данеслі звесткі аб разьбяных царскіх варотах з выявай полацкага архіепіскапа XIV стагоддзя, аб работах пінскага разьбяра Ананія і аршанскага майстра Андрэя XV стагоддзя. Яркую старонку ў гісторыю мастацкай апрацоўкі дрэва ўпісала XVII стагоддзе, якое называюць «залатым стагоддзем беларускай рэзі». Драўляныя іканастасы, алтары, вароты Ільінскай царквы ў Віцебску, Мікалаеўскай у Магілёве, храмаў і палацаў Маскоўскага Крамля, якія аздаблялі беларусы Міхайлаў, Акулаў, старцы Арсеній і Іпаліт, назаўсёды ўвайшлі ў скарбонку шэдэўраў айчыннага мастацтва. Ці могуць гэтыя цудоўныя ўзоры не крануць душу чалавека, а тым больш душу мастака, улюбёнага ў дрэва?

Чуласць да разнастайных праяў жыцця — бадай што самая адметная рыса творчага аблічча маладых разьбяроў. Пачынаючы працаваць у народных традыцыях, Даніловіч і Ісачанка заявілі аб сабе між тым як мастакі з абвостраным пачуццём сучаснасці.

Трыпціх «Песня хлебу», створаны да 60-годдзя Савецкай улады, сведчыць аб звароце да вобразнага асэнсавання сённяшняй рэчаіснасці. У гэтым, грамадзянскім па гучанні, творы аўтары праз прымаўку «Найсмачнейшы хлеб ад сваёй працы» звязваюць дзень сённяшні з днём мінулым.

У адухоўленых рухах трох постацяў — жанчыны-Беларусі, мудрага гусляра і юнака-музыкі — ёсць адчуванне сувязі лёсу асобнага чалавека з лёсам цэлага народа, з яго бытам, культурай, мастацтвам.

Да 60-годдзя Савецкай Арміі Даніловіч і Ісачанка падрыхтавалі трыпціх «Песні грамадзянскай вайны».

Стварэнне гэтага трыпціха трэба разглядаць як ступень творчага пошуку, якая звязана з працэсам станкавізацыі дэкаратыўнага мастацтва, з імкненнем паставіць разьбу па дрэве ў адзін рад з іншымі выяўленчымі мастацтвамі. Такая заява мастакоў мае рацыю, бо свае творы яны насычаюць глыбокім ідэйным сэнсам і моцным эмацыянальным зарадам.

Цікавасць да выяўлення магчымасцей дрэва навяла мастакоў на думку паказаць адну са сцэн народнага гуляння ў стылізаванай сялянскай хаце. Так з'явіўся ў 1979 годзе складаны і арыгінальны па кампазіцыйнай пабудове «Церамок» (першапачатковая назва «Без цымбалаў, без дуды ходзяць ногі не туды»). Ён сведчыў не толькі аб умелым выкарыстанні вядомых рамесных прыёмаў апрацоўкі матэрыялу, але і аб глыбокім выкарыстанні народнай творчасці ў цэлым.

Жыццё фальклору, па словах этнографа В. Гусева — няспынны працэс, у якім узнаўленне традыцый з'яўляецца пачаткам новага цыклу. Серыя з сямі твораў «Мудрыя дарадцы» — яркі прыклад такой з'явы ў беларускім фальклоры. Аснову яе складаюць народныя прыказкі і прымаўкі, якія, дзякуючы мастацкай інтуіцыі і майстэрству, атрымалі тактоўнае і паслядоўнае выяўленне.

Гэта своеасаблівая інтэрпрэтацыя ў прафесійным мастацтве простых і высокіх узораў народнай творчасці. Пры распрацоўцы гэтай тэмы Георгій Даніловіч улічваў не толькі выяўленчую форму народнага мастацтва, але спалучаў яе з уяўленнямі, атрыманымі на аснове вывучэння вуснай народнай творчасці. Мастак лічыць, што казкі, загадкі, прымаўкі павінны служыць разам з дэкаратыўнымі традыцыямі невычарпальнай крыніцай творчасці прыкладнікоў. Каму не вядомы прымаўкі «Беражы граніцы, як вачэй зяніцы», «Дзе пасееш густа, там не будзе пуста», «Кожны чалавек свайго шчасця каваль», «Няма лепшай хаткі, як у роднай маткі», «Ад гарэлкі будзе розум мелкі», «Чым багаты, тым і рады, а што маем, тым прымаем»?! Кола гэтых знаёмых народных сюжэтаў абрана таму, што ў іх з асаблівай чысцінёй і сілай праяўляюцца канкрэтнае пачуццё, жывая эмоцыя, неабходныя для паўнагучнага мастацкага вобраза.

Майстры карыстаюцца выяўленчымі сродкамі, набліжанымі да народных, але ў кожным творы адчуваецца паглыблены сэнс, удумлівая развага і сур'ёзны погляд на жыццё. Сам дух, каларыт «Мудрых дарадцаў» наладжвае асацыятыўную сувязь мастакоў з народнымі разьбярамі.

Умоўная стылізацыя, парушэнне прапорцый фігур — паўмысна абраная форма выяўлення нацыянальнага тыпажу. Шчырасць і добразычлівасць персанажаў узмацняюцца мяккасцю рэльефаў, авальнай распрацоўкай фонаў і подпісаў.

Пластычныя і дэкаратыўныя магчымасці дрэва ў спалучэнні з багатай фантазіяй, лёгкасцю і свабодай выканання, прыродным пачуццём гумару і высокім майстэрствам уяўляюць арганічны сплаў, які дае жыццё непаўторным і таленавітым творам Георгія Даніловіча і Уладзіміра Ісачанкі.

Пяцігадовая творчая дзейнасць магілёўскіх разьбяроў пацвярджае, што абраны імі шлях — плённы і цікавы. Наватарскі падыход да аднаго толькі віду дэкаратыўнай разьбы — пласкаснога рэльефнага выяўлення — дае магчымасць знаходзіць усё новыя сродкі для стварэння цікавых і глыбокіх твораў, значна пашыраць гарызонт творчага дыяпазону.

Якасна новы этап у творчасці мастакоў пачынае партрэт паэта-новалацініста Міколы Гусоўскага, які адкрывае новую серыю «Слаўныя грамадзяне Магілёўшчыны». У ім удала спалучаецца рэльефная пластыка са станковымі законамі будавання перспектывы на плоскасці. Новая пластычная структура выклікала высакародную, стрыманую манеру выканання. У будучым своеасаблівая драўляная галерэя землякоў папоўніцца вобразамі гравёраў Максіма і Васіля Вашчанак, першадрукара Пятра Мсціслаўца, дойлідаў Феські і Іпація, асветніка-гуманіста Георгія Каніскага і іншых дзеячаў старажытнай асветы і культуры.

Сёння творчы пошук мастакоў ідзе ўглыб. А гэта — абяцанне новых твораў і сведчанне духоўнай і мастацкай сталасці.

Г. СЦЯПАНАВА,
мастацтвазнавец.

Фота П. КРУХТАНАВА.



Рэльеф з пано «Вяселле».

Работы з серыі «Мудрыя дарадцы».

НА АБСЯГАХ КУЛЬТУРЫ

ЭНТУЗІЯЗМ ПЛЮС ДАСВЕДЧАНАСЦЬ

Музей на грамадскіх пачатках у нашы дні — з'ява настолькі распаўсюджаная, што, на першы погляд, не патрабуе ніякіх тлумачэнняў і каментарыяў. Усе згодны з тым, што стварэнне такіх музеяў — справа надзвычай карысная, і чым больш іх — тым лепш. Праўда, сярод прафесійных музейных супрацоўнікаў усё часцей чуюцца галасы, якія папярэджваюць пра непажаданасць стыхійнага росту грамадскіх музеяў, росту, не абумоўленага сапраўднай патрэбнасцю ў стварэнні музея.

Менавіта з-за таго, што стварэнне музеяў іншы раз тлумачыцца модай, і ўзнікаюць такія сітуацыі, калі музеі адкрываюць без належнай падрыхтоўкі, у непрыстасаваных памяшканнях, а іх экспазіцыі носяць выпадковы характар і запаўняюцца матэрыяламі, якія не маюць адносін да дадзенага раёна або края.

Якім жа ўсё-такі павінен быць музей на грамадскіх пачатках?

...У вёсцы Чарэшля Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці ўжо 6 гадоў працуе ваенна-гістарычны музей партызанскай славы. Узнік ён не выпадкова і не на пустым месцы. У час Вялікай Айчыннай вайны ў раёне вёскі Чарэшля дыслацыраваліся чатыры партызанскія брыгады. Праз 30 гадоў пасля вайны, адзначаючы дзень Перамогі, былыя партызаны сустрэліся на ўрачыстым вечары з моладдзю. На гэтай сустрэчы і было вырашана стварыць музей у памяць пра тыя баі з фашыстамі, якія вялі партызаны раёна. Арганізатарам работы па стварэнні музея стала настаўніца Чарэшлянскай школы Г. Табанюхава. Дзякуючы энтузіязму і невычэрпнай энергіі Ганны Рыгораўны і яе добраахвотных памочнікаў за паўгода работы было сабрана 900 прадметаў музейнага значэння, якія і сталі асновай музея. Вялікую дапамогу стваральнікам музея аказаў райком партыі і мясцовыя органы ўлады.

Цяпер у фондах музея партызанскай славы ў вёсцы Чарэшля больш за дзве тысячы экспанатаў, але пошукавая работа працягваецца. Тых 50 квадратных метраў, на якіх упачатку размясцілася экспазіцыя, цяпер ужо не хапае. У музеі сур'ёзна думаюць пра тое, як паставіць на навуковую аснову ўлік і апісанне сабраных матэрыялаў. Музей стаў сапраўдным культурным і асветніцкім цэнтрам раёна.

Аналізуючы дзейнасць музея ў Чарэшлі, мы можам сфармуляваць асноўныя крытэрыі, якімі вызначаецца работа грамадскага музея. Гэта музей, які мае перспектывы развіцця, звязаны з мясцовай гісторыяй, базіруецца на салідных фондах і створаны сапраўды зацікаўленымі людзьмі, такімі як Г. Табанюхава.

Добры грамадскі музей не можа ўзнікнуць на пустым месцы, падпарадкоўваючыся спушчанай зверху дырэктыве. Ён абавязкова павінен быць звязаны з гісторыяй роднага краю, блізкай тым людзям, якія гэты музей ствараюць. Не выпадкова менавіта на базе такіх грамадскіх музеяў узнікаюць пасля дзяржаўныя музеі, як гэта адбылося ў вёсцы Іканы Барысаўскага раёна, дзе асновай музея народнай славы паслужыў школьны музей, або ў Клецку, дзе школьны музей быў пераўтвораны ў дзяржаўны гісторыка-этнаграфічны. У першым з іх асновай школьнага музея народнай славы сталі матэрыялы, звязаныя з партызанскім рухам на Барысаўшчыне, а стваральнікам музея стаў настаўнік гісторыі, цяпер — дырэктар музея В. Ігнатовіч, які ў гады вайны хлапчукам-падлеткам ваяваў у партызанскім атрадзе. У Клецку музей узнік дзякуючы энтузіязму і страснай захопленасці мясцовай гісторыяй настаўніка Д. Чорнага.

Вялікая частка грамадскіх музеяў нашай рэспублікі — ваенна-гістарычныя; у асноўным гэта школьныя музеі, дзе збіраюцца і захоўваюцца матэрыялы па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Арыентацыя грамадскіх музеяў на гісторыю Айчыннай вайны, асабліва на гісторыю партызанскага руху, даволі правамерная і абгрунтаваная ва ўмовах нашай рэспублікі. Асноўная вартасць гэтых музеяў — іх канкрэтнасць, прывязанасць да пэўнага, часцей за ўсё да мясцовага матэрыялу. Такія музеі дазваляюць весці вялікую даследчую работу, вынікам якой з'яўляецца пабудаваная на сапраўдных матэрыялах экспазіцыя. Менавіта ў выніку такой работы ў сярэдняй школе № 100 г. Мінска створаны музей, прысвечаны гісторыі 8-ай партызанскай брыгады; у школе № 12 г. Баранавічы — мемарыяльны музей Героя Савецкага Саюза І. Кабушкіна і многія іншыя.

Яшчэ адна вялікая група музеяў на грамадскіх пачатках у нашай рэспубліцы — гэта музеі па гісторыі прадпрыемства, установы, калгаса, школы. Стварэнне музеяў на прадпрыемствах, у калгасах, школах дазваляе праводзіць вялікую пошукавую работу, якая ўключае ў сябе пошук у архівах, збор матэрыялаў музейнага значэння ў людзей, камплектаванне матэрыялаў па сучаснасці. Такія музеі заслугоўваюць толькі адабрэння, паколькі яны ствараюцца на сапраўдных матэрыялах і маюць усе перадумовы як для камплектавання фондаў, так і для правядзення навукова-даследчай і масава-асветніцкай работы. Многія з іх досыць вядомыя, маюць вялікі вопыт работы. Сярод іх — музей баявой і працоўнай славы завода «Гомсельмаш», музей баявой і працоўнай славы дзяржплемзавода «Індустрыя» ў вёсцы Блонь Пухавіцкага раёна. У вёсцы Пяршаі Валожынскага раёна створаны музей школы, якой ужо больш за 200 гадоў. Адзін з самых цікавых музеяў па гісторыі прадпрыемства ў нашай рэспубліцы адкрыты на станкабудаўнічым заводзе імя С. М. Кірава ў Мінску.

Беларусь здаўна багата традыцыямі самых разнастайных рамёстваў і промыслаў, вывучэнню якіх у апошнія гады надаецца ўсё большая ўвага. Не здзіўляе таму, што ў рэспубліцы ўзнікаюць музеі, якія базіруюцца на калекцыях народнай творчасці. Такія, напрыклад, як этнаграфічныя музеі ў вёсцы Верцяліўшкі на Гродзеншчыне і ў вёсцы Крыўляны Брэсцкай вобласці. Цікавыя па матэрыялах некаторыя мемарыяльныя музеі рэспублікі: музей Аляксандра Блока ў вёсцы Лапаціна Пінскага раёна і музей Кузьмы Чорнага ў вёсцы Цімкавічы Капыльскага раёна. Усё больш цікавымі становяцца музеі рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы.

Аднак да гэтага часу ў рэспубліцы яшчэ ёсць і ствараюцца музеі так званага «шырокага профілю», прысвечаныя гісторыі Беларусі. Просты аналіз работы такіх музеяў паказвае, што, як правіла, такія музеі з'яўляюцца толькі слабай копіяй дзяржаўных музеяў. У якасці прыкладу можна прывесці музей СШ № 130 г. Мінска. Ён, прысвечаны гісторыі БССР, зусім не з'яўляецца горшым музеем падобнага роду. Яго экспазіцыя пабудавана ў строгай адпаведнасці з тэматыка-экспазіцыйным планам на аснове фотакопійных матэрыялаў з фондаў Дзяржмузея БССР, яна нядрэнна афармлена, але... гэта выдатны матэрыял для афармлення кабінета гісторыі, але не музей, паколькі тут адсутнічае галоўнае — кроўная сувязь з гісторыяй. Тыя нямногія сапраўдныя прадметы этнаграфіі, якія ёсць у музеі, губляюцца ў масе копійнага матэрыялу.

У рэспубліцы амаль няма мастацкіх і літаратурных музеяў. На наш погляд, гэта з'яўляецца сур'ёзным упушчэннем, асабліва цяпер, калі эстэтычнаму выхаванню моладзі надаецца такая вялікая ўвага.

Неабходным кампанентам у рабоце музея на грамадскіх пачатках з'яўляецца іх сувязь з дзяржаўнымі музеямі. Гэта сувязь асабліва важная тады, калі справа датычыць уліку і захавання музейных фондаў — найбольш слабага месца ў рабоце грамадскіх музеяў.

Супрацоўнікі дзяржаўных музеяў пастаянна аказваюць музеям на грамадскіх пачатках вялікую метадычную дапамогу: праводзяць семінары, практычныя заняткі, вучаць, якім чынам трэба захоўваць музейныя прадметы як у фондах, так і ў экспазіцыі. Аднак цяпер стала даволі відавочным, што для зберажэння найбольш каштоўных матэрыялаў, якія маюцца ў грамадскіх музеях, адной метадычнай дапамогі недастаткова. Энтузіясты музейнай справы мяняюць месца работы, хварэюць, ідуць на пенсію, стамляюцца нарэшце. А справа, пачатая імі, не заўсёды трапляе ў такія ж клапатлівыя рукі — і патухае.

Асабліва бяда ў такіх выпадках пагражае музейным прадметам. У сувязі з гэтым Дзяржаўны музей Беларускай ССР распрацаваў спецыяльную дакументацыю, на падставе якой усе найбольш каштоўныя матэрыялы, якія захоўваюцца ў музеях на грамадскіх пачатках, будуць узяты на ўлік дзяржаўнымі музеямі.

Стварэнне музеяў на грамадскіх пачатках — справа вельмі важная, яна патрабуе ўдумлівасці, энтузіязму, глыбокага вывучэння як мясцовай гісторыі, так і гісторыі СССР, умення не толькі сабраць, але і захаваць каштоўныя гістарычныя рэліквіі.

Ф. КАПЛАН,
старшы навуковы супрацоўнік;
І. ЗВАРЫКА,
навуковы супрацоўнік Дзяржаўнага музея БССР.

ПРЫРОДА І МЫ

Працягваем гаворку па праблемах аховы прыроды, пачатую артыкулам В. Карамазава «А твары... як у людзей» («ЛіМ» ад 15 мая г. г.).

УСЁ ПАЧЫНАЕЦЦА З ДЗЯЦІНСТВА

ШТО ФАУНА Беларусі бяднее з кожным годам, гэта, я думаю, усім відавочна. Шмат каму вядомы і тыя прычыны, з-за якіх яна збядняецца. Гэта актыўная гаспадарчая дзейнасць чалавека, часам добра не прадуманая і не ўзважаная да драбніц. Немалую шкоду жывой прыродзе прыносіць і браканьерства. Дарэчы, браканьеры — гэта людзі часам і з паляўнічым білетам у кішэні.

Не ўсё добра ў паляўнічых таварыствах. Нярэдка іх узначальваюць людзі выпадковыя, няздольныя вырашаць задачы, якія ставіць перад імі жыццё і час. Такія кіраўнікі часам самі браканьерствам займаюцца. А як сцвярджае народная прымаўка: лес крадзе — поле бачыць, поле крадзе — лес бачыць. Хутка гэта становіцца ўсім вядомым. Вось і паспрабуй пасля гэтага такому «прыродаахоўніку» весці з насельніцтвам нейкую выхаваўчую работу.

Сучасны паляўнічы павінен быць сумленным чалавекам, добра ведаць жывёльны свет, яго заканамернасці і ўзаемаадносіны, сачыць за апошнімі дадзенымі біялагічнай і прыродаахоўнай навук. А бываюць жа паляўнічыя, якія ідуць у лес з адной адзінай мэтай — здабыць мяса, і як мага болей. А калі не здабыць, то хоць бы выпіць ды па пустых бутэльках пастраляць. Дзіўна, але многія паляўнічыя, пры бліжэйшым знаёмстве, аказваюцца людзьмі надзвычай неэмацыянальнымі, глухімі да прыгажосці, а значыць, і да прыроды, бо прырода — гэта яшчэ і высокая паэзія. А «без пачуцця паэзіі, без адчування казачнасці прыроды няма ні паляўнічага, ні паляванння»,— пісаў вядомы рускі пісьменнік Я. Пярміцін.

Чаму многія людзі так элементарна, прагматычна ставяцца да прыроды? Таму, што яны так выхаваны, выхаваны з дзяцінства.

Празарлівым у гэтых адносінах быў выдатны педагог і вучоны У. Сухамлінскі. Вялікія надзеі ён ускладаў на выхаванне любові да роднай зямлі, да прыроды. Менавіта з раскрыцця перад дзецьмі прыгажосці непрыкметнай кветкі, жучка, усходу сонейка і ранішняга туману над соннай рачулкай ён пачынаў у сваёй школе выхаванне і навучанне дзяцей. Мы ж, выхавацелі, настаўнікі бібліятэкары, прадстаўнікі культуры і ўсе іншыя, хто непасрэдна заняты выхаваннем моладзі, чаго грахі таіць, яшчэ далёка не поўнасцю выкарыстоўваем гэтыя магчымасці.

У выхаваўчых планах настаўнікаў строга ўстаноўлена паслядоўнасць тэм. І паспрабуй парушыць іх, а тым болей апусціць нешта, то зможаш за гэта, як кажуць, і на арэхі атрымаць. Што датычыць тэмы прыродазнаўча-ахоўнай, дык яна не ўваходзіць, так сказаць, у афіцыйны пералік абавязковых тэм. Будзеш з ёй знаёміць падлеткаў — добра, не будзеш — таксама ніхто не папракне. Таму трэба ўсім нам да гэтай справы тварам павярнуцца. А магчымасці зараз у школах: дзіцячых садах і іншых дзіцячых установах як ніколі вялікія. У школах існуюць і паўсюдна адкрываюцца падрыхтоўчыя групы, групы падоўжанага дня, аздараўленчыя пляцоўкі, лагеры працы і адпачынку. А што часам там назіраецца? Нярэдка педагогі не ведаюць, як ім заняць дзяцей у гэтых групах. Нудзяць іх гадзінамі ў памяшканнях, выдумляюць розныя непатрэбныя конкурсы, спаборніцтвы, агляды, замест таго, каб павесці дзяцей на луг ці поле і пазнаёміць там іх з той жа кветкай, жучком, птушкай, расказаць аб іх карысці.

Не так даўно ў нашай краіне, у тым ліку і ў нас у рэспубліцы, складзены «Чырвоныя кнігі», дзе пералічаны рэдкія расліны і жывёлы, якія патрабуюць асаблівай увагі і аховы. Думаецца, што гэтым кнігам трэба надаць большую публічнасць. Не лішнім было б, каб такую кнігу мела кожная школа, кожная дзіцячая ўстанова. Сродкаў на гэта шкадаваць не трэба. Усё гэта з цягам часу акупіцца з лішкам. Тады б больш пісьменна, а гэта значыць, і дзейсна вялося б прыродаахоўнае выхаванне. А то, глядзіш, павяла настаўніца дзяцей на экскурсію ў лес і замест таго, каб пазнаёміць дзяцей з ранневеснавымі кветкамі, расказаць, што яны знаходзяцца пад аховай дзяржавы, гэта значыць, нельга іх без патрэбы знішчаць, рве разам з дзецьмі па вялізным ахапку і нясе яго ў школу. Альбо другі выпадак. На такой жа экскурсіі дзеці заўважылі гняздо на дрэве. Высветлілася, што вароніна. «А, гэта тыя, што летам куранят хапаюць», — захвалявалася ўжо немаладая настаўніца. Дастаткова дзецям было пачуць гэта, каб яны адразу ж разбурылі гняздо. І такіх прыкладаў можна прыводзіць шмат.

Цудоўны рускі пісьменнік М. Прышвін пісаў: «Ахоўваць прыроду — значыць ахоўваць Радзіму». А гэта высакародная якасць, як вядома, сама да чалавека не прыходзіць. Яе трэба выхоўваць, прытым з дзяцінства.

Рыгор ІГНАЦЕНКА,
настаўнік.

(Працяг на стар. 14).

З ДАЛЁКІХ І БЛІЗКІХ ДАРОГ

«Ё САРАНЧЭТ»

— Заўтра твой дзень, — сказаў мне пасля вячэры Мітрафанаў. — Прызнайся чэсна: радуешся будучай сустрэчы?

Вядома ж, вельмі хацелася пабачыць кааператыў у венгерскай вёсцы. Няцяжка было зразумець Мітрафанава — карэннага масквіча, Турсунава — сталічнага жыхара сонечнай Кіргізіі: для іх вёска паняцце хоць і не за сямю, як кажуць, пячацямі, але ўсё-такі далёкае. Іншая справа ў мяне. Зусім іншая. Памяць пра маю калгасную вёсачку Негаціна, дзе нарадзіўся і вырас, настолькі свежая, што часам напраўду здаецца: толькі заўчора, а не трыццаць пяць гадоў назад давялося з ёй развітацца. Хочацца да канца быць шчырым: ноччу яна тройчы прыходзіла да мяне ў сне ў сапраўды шыкоўным грандатэлі «Тэрмаль». І ўсякі раз пасля гэтага на душы станавілася радасна і трошкі журботна. Радасна таму, што яна ёсць на белым свеце, і журботна, — што вельмі далёка адсюль, што даўно не быў там.

...Машына спынілася каля невялікага аднапавярховага будынка.

— Гэта праўленне кааператыва, — растлумачыла Пэтра.— «Ё саранчэт» у даслоўным перакладзе азначае «Добрага шчасця».

З веснічак, проста да машыны выбегла трое людзей.

— Дзень добры, таварышы! Шчыра запрашаем!

Ах, гэта венгерская гасцінасць! Хочаш не хочаш — сядай да стала. Прымусу не будзе, але ты — паважай гаспадароў! — хоць прыгубі шклянку, хоць пакаштуй што-небудзь з садавіны ці халоднай закусі.

Ласла Лайтальд, старшыня кааператыва, саджае ўсіх на мяккія крэслы вакол нізенькага прадаўгаватага століка і толькі тады прысаджваецца сам. Побач з ім сядае сакратар парткома Феранц Горняк. Па тым, як бясшумна заходзілі ў старшынёўскі кабінет прыветлівыя супрацоўніцы праўлення з падносамі ў руках, як падавалі чорную каву, адказвалі на знаёмае ім рускае «спасибо», лёгка можна было здагадацца, што гасцей тут прымаюць часта. Старшыня так і сказаў:

— Госці ў нас бываюць амаль што кожны тыдзень. Але вось савецкіх журналістаў прымаем упершыню. Так што прабачце, калі што не так...

Малайчына ўсё-такі наш Джаныбек Джумаліевіч, усё разумее з паўабароту. Заўважыў у маіх руках блакнот, адразу ж гаворку ўзяў на сябе. І яна пацякла лёгка і натуральна, як у старых добрых сяброў.

Углядаюся ў твары старшыні кааператыва, сакратара парткома. Колькі на сваім вяку мне давялося пабачыць нашых старшынь калгасаў і сакратароў парткомаў! А цяпер вось упершыню бачу іх венгерскіх калег. Што ў іх агульнага? Чым яны адрозніваюцца адзін ад аднаго? Кааператыў «Ё саранчэт»— адзін з лепшых у Венгрыі. І таму ў думках імкнуся параўнаць старшыню і сакратара парткома з нашымі, таксама лепшымі — з двойчы Героем Сацыялістычнай Працы Уладзімірам Антонавічам Ралько, з Героем Сацыялістычнай Працы Уладзімірам Лявонавічам Бядулем. Не, знешне яны зусім не падобныя. Ласла Лайтальд значна вышэйшы за іх ростам, чарнявы, моцны, як барэц; у яго нават плечы трошкі апушчаныя, як у барца перад паядынкам. У свае няпоўныя сорак гадоў ён паспеў ужо многае зрабіць (аб гэтым гавораць поспехі кааператыва), стаў вядомым чалавекам у краіне — членам абласнога камітэта ВСРП, адзначаны трыма высокімі ўрадавымі ўзнагародамі. Феранц Горняк — зусім яшчэ юны, але не па гадах сур'ёзны; вочы ў яго шэрыя, вялікія, а валасы светлыя-светлыя, як у вясковых падлеткаў у нас на Віцебшчыне. Прыгожы хлопец! Наконт яго сур'ёзнасці Ласла добразычліва пажартаваў: «Будзеш сур'ёзны, калі пад тваёй апекай 110 камуністаў ды яшчэ 80 камсамольцаў».

Адказаць на свае ж пытанні — «што агульнага?», «чым адрозніваюцца?» — можна было значна пазней, ужо адвячоркам, калі бліжэй пазнаёміліся і з гэтымі людзьмі, і з кааператывам.

«Ё саранчэт» — гаспадарка шматгаліновая. У сваім распараджэнні яна мае пяць тысяч гектараў ворнай зямлі, тры з паловай тысячы пашы і паўтары тысячы гектараў пад лесам. Ураджайнасць — стабільная. Нават у неўраджайным 1979 годзе на круг тут сабралі па 46 цэнтнераў пшаніцы, па 60,5 цэнтнера кукурузы, больш шасці цэнтнераў ільновалакна. У кааператыве 500 кароў, сярэдні надой перавышае тры тысячы кілаграмаў. Маюцца свае фермы па гадоўлі свіней, авечак і птушкі. Штогод кааператыў пастаўляе на экспарт 5—6 тысяч свіней, да 16 тысяч галоў авечак, 100—120 вагонаў індычак (пастаўка птушкі чамусьці ўлічваецца ў вагонах). Ёсць таксама птушкаферма на 30 тысяч кур-нясушак, сярэдняя яйканоскасць — 265 яек у год.

Васіль ПРАСКУРАЎ

ВЯРТАННЕ Ў МАЛАДОСЦЬ

Выкарыстоўваюцца і падсобныя промыслы: льнозавод, ткацкая фабрыка (нам падарылі там па льняным настольніку), шэсць пясчаных і пяць каменных кар'ераў. Грашовы прыбытак за мінулы год перавысіў 240 мільёнаў форынтаў, што ў пераводзе на нашы грошы складае больш чым 15 мільёнаў рублёў.

Свежае вока ўсё схоплівае з ходу, учэпіста. Калі гаварыць коратка, дык асабліва запомнілася культура земляробства. Можна пазайздросціць, з якой гаспадарскай руплівасцю выкарыстоўваецца тут кожны кавалачак зямлі. І яшчэ запомнілася высокая культура вытворчасці на фермах і дысцыплінаванасць людзей.

У адной з кашар кінулася ў вочы, як нам падалося, незвычайная дэталь: усе авечкі, нягледзячы на скучанасць, былі снежна-белыя. «Мыюць іх, ці што?» — падумалася тады. Аказваецца, не — не мыюць. У кашары зроблена двайная падлога, прычым верхняя змайстравана з рэек з падоўжнымі адтулінамі, цераз якія ўсе нечыстоты падаюць уніз і змываюцца. Зручна, чыста, суха.

— Самі прыдумалі, — усміхаўся, тлумачыў старшыня, задаволены зробленым эфектам.

У свінарніку-матачніку мы затрымаліся даўжэй: вельмі ж хораша выглядалі тут парасяткі-сысункі, хацелася проста палюбавацца імі, такімі ружовенькімі, як на малюнках. Клеткі ў свінарніку не сказаць каб прасторныя, хутчэй наадварот. А вось паморку парасят няма. Над падлогай, уздоўж усіх чатырох сцен клеткі, на вышыні прыкладна 20 сантыметраў замацаваны жалезны прут. Як бы ні лажылася свінаматка, яна нідзе не прыцісне парасят да сценкі. А гіне прыплод якраз каля сценкі, таму што свінаматка ніколі не ляжа на парасят.

Пасля наведання ферм кааператыва (а гэтаму папярэднічала знаёмства з трыма вёскамі, палямі і машынна-трактарным паркам) Феранц Горняк пацікавіўся:

— Нам бы хацелася ведаць, што вам у нас спадабалася?

Мы шчыра адказвалі: людзі, вёскі, культура вытворчасці. Сказалі пахвальнае слова і пра кіраўнікоў кааператыва. Расчулены высокай адзнакай, Ласла Лайтальд тут жа выклаў сваю «самую вялікую», як ён сказаў, просьбу:

— У вас, канечне, будзе магчымасць, і мы вельмі просім перадаць савецкім калгаснікам, рабочым саўгасаў наша самае шчырае прывітанне. Скажыце так: мы ганарымся імі, мы вучымся ў іх, мы любім іх. — І тут жа дадаў: — Любім па-сялянску — проста, ад усёй душы.

Гэту ж просьбу ён паўтарыў і ў час абеду, нават папрасіў запісаць у блакнот — «каб не забылі». Наогул Ласла гаварыў няшмат, скупа, больш пытаўся, а калі ўжо і гаварыў, дык важка, слушна. І еў Ласла малавата для яго камплекцыі, усё больш частаваў і слухаў. Прычым слухаў так, як умеюць слухаць не ўсе людзі. Нельга было не прыкмеціць, як ён, што называецца, на хаду фільтруе ўсё пачутае, пакідаючы для сябе толькі тое, што патрэбна.

— Чаму вы мала гаворыце? — спытаў ён цераз перакладчыцу.

— У нас на Беларусі ёсць такая прымаўка: «Меней гавары — болей пачуеш».

— О! — задаволены выгукнуў Лайтольд. — Гэта трэба будзе запомніць.

Дзіва дый годзе! Акурат жа гэтак — слова ў слова — рэагуюць на цікавую думку ці слова Ралько і Бядуля: «Гэта трэба будзе запомніць».

Дык вось, аказваецца, што ў іх агульнага: прага на жыццёвы вопыт і мудрасць народную, уменне знаходзіць, збіраць іх залатыя крупінкі, каб нястомнай, натхнёнай працай спрасаваць у залатыя зліткі дабра-дастатку і шчасця калектыву, кожнага асобнага чалавека. Тут падабенства духоўнае, унутранае.

У Будапешт мы вярталіся позна вечарам. Усю дарогу Турсунаў, Мітрафанаў, Пэтра і Андраш ажыўлена абменьваліся ўражаннямі. Мне было не па сабе: забыўся спытаць у Ласла, чаму ў яго на правай руцэ няма вялікага пальца? Ды і думкі лезлі ў галаву зусім іншыя. «Што там у нас? Няўжо ўсё яшчэ няма дажджу? Масква перадае, што па Беларусі суха, бязветрана. Значыць, не будзе і другога ўкосу траў. Ды і што толку з атавы: сена з яе атрымліваецца жорсткае, як дрот. А можа, ўсё-такі пайшлі дажджы?..»

Усю ноч мне снілася маё роднае Негаціна. Не сама вёска, а наш зарэчны лужок, зялёненькі, з высокімі — па пояс — духмянымі травамі.

КАРАЙ БЕНКЭ

Яшчэ ў Маскве, у Саюзе журналістаў, нас не раз прасілі:

— Перадавайце прывітанне Караю Бенкэ.

— Нізкі паклон Караю Бенкэ.

«Хто такі? — думалася мне. — Ніколі не чуў пра яго».

І вось гэты чалавек перад намі: па абавязку сакратара Саюза Венгерскіх Журналістаў (у яго візітнай картцы гэтыя тры словы напісаны з вялікіх літар) ён прымае нашу дэлегацыю. Каржакаваты, у акулярах, у светлым парусінавым гарнітуры, не па гадах рухавы, ён шчыра радуецца, што яго памятаюць, не забылі ў Маскве, лагодна смяецца і запрашае да стала, на якім адразу ж з'яўляецца традыцыйная чорная кава.

— Ваша праграма мне добра знаёмая, — гаворыць Карай Бенкэ. — І я ўпэўнены, што нашы таварышы з Міністэрства замежных спраў не дадуць вам сумаваць. Што ж датычыць мяне, дык я проста хацеў бы з вамі пагаварыць пра журналісцкія справы. Калі вы не пярэчыце, канечне?..

Карай Бенкэ больш за дваццаць пяць гадоў працаваў рэдактарам абласной газеты, многія гады быў старшынёй сацыяльных камісій Саюза. Ён, як сам жа зазначыў, «у твар» ведае ўсіх журналістаў Венгрыі. А журналісцкі корпус ВНР не такі ўжо маленькі — 4700 чалавек. Зараз у рэспубліцы выдаецца 19 абласных і 11 гарадскіх газет. Каля дзвюх тысяч журналістаў працуюць у выдавецтвах, на радыё і тэлебачанні.

Наша гутарка сапраўды насіла прафесійны характар, шырокаму колу чытачоў яна, бадай, не цікавая. Але сёе-тое ўсё ж варта расказаць.

У ВНУ Венгрыі няма факультэтаў журналістыкі. Будучых супрацоўнікаў друку, радыё і тэлебачання тут вучыць Саюз журналістаў. Існуючая «школа» працуе даволі паспяхова. У гэту «школу» прыходзяць ужо дыпламаваныя спецыялісты, прычым спецыялісты самых разнастайных галін народнай гаспадаркі. Сваім абавязкам Саюз лічыць, па-першае, вызначыць прыгоднасць чалавека да газетнай працы — «знайсці ў яго божую іскру», па-другое, навучыць журналісцкаму майстэрству. Гавораць, такі пады-

Працяг. Пачатак у нумарах за 24 і 31 ліпеня.

ПРЫРОДА І МЫ

ШТО МЫ ПАКІНЕМ У СПАДЧЫНУ

Хоць і не першым, але важную праблему закрануў Віктар Карамазаў у сваім артыкуле «Твары... як у людзей».

Бацькі пакінулі нам у спадчыну шчодрыя палі, багатыя лясы, чыстае паветра, паўнаводныя рыбныя рэчкі і азёры. Мы, па залежных і незалежных ад нас прычынах, вельмі збяднілі тое, што дасталося нам у спадчыну. Не бяру на сябе права гаварыць у вялікім маштабе, а вось аб родным мне кутку Надняможня, скрозь слёзы, хочацца сказаць. Упэўнены, што гэта датычыць і іншых мясцін.

Навакольныя лясы, якія ля вёскі Беразіна Карэліцкага раёна, не так даўно былі багатыя на дзічыну, арэхі, ягады, а Нёман — на рыбу. Дзічыну знішчылі браканьеры, «легальныя» і «нелегальныя», ягады без пары і часу знішчаюцца насельніцтвам. Нёман, апеты народам, як кармілец, стаў плыткім, бязрыбным. Яшчэ горшы лёс выпаў Сервечы, якая з паўнаводнай ракі стала канаваю.

Легальныя браканьеры — гэта тыя, хто мае права атрымаць ліцэнзію. Як толькі пачынаецца паляўнічы сезон, некалькі машын з дзесяткам-другім «адпачываючых» з цямна прыязджаюць у Барштанскі лес. Пакуль кіраўнікі «перакусваюць», вопытныя мысліўцы аб'язджаюць лес і лясныя дарогі, знаходзяць сляды дзічыны. Потым абкружаюць той квартал, дзе затрымалася жывёла, і па следзе пускаюць сабак. Пачынаецца т. зв. «паляванне». На самай справе гэта не паляванне, а варварскае знішчэнне безабароннай жывёлы. І па нейкай там прамысловай і спартыўнай ліцэнзіях за восень амаль перабіваюць дзікоў, ласёў, коз, ліс, барсукоў, зайцоў.

Пытаюся ў мясцовага лесніка: чаму ты не выконваеш сваіх абавязкаў па ахове дзікіх звяроў у сваім абходзе?

— Я адзін раз хацеў выканаць свае абавязкі, дык ведаеце, што мне сказалі: «Калі хочаш есці хлеб і дагадаваць сваіх дзяцей, дык не лезь, куды цябе не просяць». А што я ім зраблю? Яны — усе на «волгах», «газіках», «нівах»! І са стрэльбамі!

Шкода роднай прыродзе ад гэтай катэгорыі браканьераў не толькі ў тым, што яны без нормы знішчаюць багацці нашых лясоў, а не ў меншай ступені і ў тым, што, гледзячы на іх, Іван кажа Пятру: «А мы што, лысыя? Хіба ж нашым дзецям кавалак мяса лішні?»

І вось дастаюць схаваныя паляўнічыя прылады і пайшлі гуляць нелегальныя браканьеры: ноччу, з запаленымі фарамі, грузавікі, газікі і матацыклы баразняць палі, лясныя паляны, пералескі, дарогі. У пачатку паляўнічага сезона зайца-шарака амаль не застаецца.

Не лепшыя, а нават горшыя справы з рыбнымі запасамі некалі багатага Нёмана. У наш час, час вялізных тэхнічных магчымасцей, Нёман абмялеў. Рыба, якая яшчэ засталася, пайшла ў ямы ці, як у нас кажуць, бухты. Там глыбей. А над гэтаю бухтаю сядзіць чалавек з вудаю, збоку стаяць «Жыгулі» і жонка грэецца на сонцы. А як толькі звечарэе, і на беразе ўжо няма «лішніх» вачэй, чалавек дастае з машыны запасны акумулятар і правады. Ціхі трэск замыкання, і крыху ні-

ход цалкам апраўдвае сябе.

І яшчэ пра адно. Саюз журналістаў — вельмі папулярная ў краіне арганізацыя. Да паслуг супрацоўнікаў друку і іх сем'яў — спецыяльныя дамы адпачынку, бальніцы, ім без абмежавання выдаюцца крэдыты для набыцця аўтамашын, на індывідуальнае будаўніцтва. Увогуле працаўнікі друку, як мы пераканаліся, і ў гарадах, і ў вёсках самыя паважаныя людзі.

— Журналіст — гэта прарок! — усхвалявана даводзіў Карай Бенкэ. — Калі ён, канечне, сапраўдны журналіст, партыйны. Цяпер шмат гавораць і пішуць пра партыйнасць. На жаль, часам глядзяць на праблему па-рознаму, са сваёй, як у вас кажуць, званіцы. У мяне наконт гэтага таксама свая думка, абраная аднойчы і назаўжды: партыйнасць — гэта, перш за ўсё, цвёрдасць, прынцыповасць і прыстойнасць.

Не менш цікавай была і другая палова нашай гутаркі — так сказаць, для разрадкі. Расказаныя Караем Бенкэ трошкі анекдатычныя сітуацыі павесялілі ўсіх мала што не да слёз.

— Смех смехам, а вось да самага галоўнага я не дайшоў, — схамянуўся Карай. —Як вам тут жывецца? Камандзіроўка ёсць камандзіроўка. Можа, дапамога якая патрэбна? На ўсякі выпадак запішыце мой адрас: Нэпкезтаршашаг, 101. Запішыце яшчэ і мой тэлефончык: 225-833.

Нікому з нас не давялося скарыстаць празрысты намёк. Аднак запіс застаўся ў блакноце. І цяпер, праглядваючы яго, лаўлю сябе на думцы: «Як бы гэта даведацца, хто ў хуткім часе паедзе ў Венгрыю? Трэба было б перадаць прывітанне Караю Бенкэ». Больш чым упэўнены: ні аднаго з нас ён не запомніў — штогод Венгрыю наведвае ў сярэднім 340 журналістаў з розных краін. Вядома ж, не запомніў. А вось перадаць прывітанне вельмі хочацца.

ПАДМУРАК НАДЗЕІ

Да вялізнага гмаху Дзяржплана Венгрыі мы пад'язджалі апоўдні.

Будучая сустрэча нас асабліва цікавіла: дзе больш, як не ў Дзяржплане, можна даведацца пра сённяшні і заўтрашні дзень цэлай краіны? Дзяржплан якраз і ёсць той «самы высокі паверх», з якога выразна бачацца і тэмпы эканамічнага развіцця, і шляхі інтэнсіўнага пашырэння гандлю, павышэння дабрабыту людзей.

У адным з кабінетаў на чацвёртым паверсе насустрач нам, вітаючы ўсіх па-руску, бадзёра падняўся паважаных гадоў мужчына з акуратна паголенай, як у Катоўскага, галавой.

— Золтан Водас, — рэкамендаваўся ён, — начальнік аддзела Дзяржплана. Вы нават не здагадваецеся, сябры, як радуюся я гэтай сустрэчы.

Таварыш Водас шэсць гадоў жыў у Маскве, працаваў у Савеце Эканамічнай Узаемадапамогі. Ён дасканала авалодаў рускай мовай, ведае нашу сталіцу не горш за Мікалая Мікалаевіча Мітрафанава, карэннага масквіча. Прычыну сваёй радасці Водас тут жа растлумачыў:

— Даўно збіраюся пабалакаць з прадстаўнікамі прэсы. Ад вас, журналістаў, вельмі многа залежыць. Вы павінны расказваць чытачам не толькі аб прыродзе нашых узаемаадносін, але і пра іх сутнасць. Не сакрэт, і ў нас, і ў вас бываюць цяжкасці: чагосьці нестае, у чымсьці перабоі. Даводзілася чуць, як недасведчаныя людзі ў такіх выпадках гавораць, што, маўляў, усё аддаём, а ўзамен атрымліваем... чорта лысага. А на самай жа справе гэта далёка не так, у корані не так. Наша супрацоўніцтва з краінамі-членамі СЭУ грунтуецца на роўнай аснове. Чым больш людзей аб гэтым будзе ведаць і ў нас, і ў вас, тым лепш для ўсіх нас. А вы тут можаце зрабіць многа, вельмі многа.

Золтан Водас з глыбокім веданнем жыцця, абставін, рэчаіснасці паказаў сапраўдны малюнак грамадска-эканамічнага развіцця Венгрыі, падмацаваў расказ неаспрэчнымі доказамі, фактамі.

Сыравінная база ВНР, і асабліва для металургічнай прамысловасці, скажам шчыра, далёка не магутная. Амаль усе галоўныя віды сыравіны (апрача баксітаў, якіх штогод здабываецца ў межах трох з паловай мільёнаў тон) венгерцы вымушаны імпартаваць. Большую частку імпарту складаюць паўфабрыкаты, сыравіна, энерганосьбіты і дэталі. Ажыццяўленне праграмы інтэграцыі СЭУ дазволіла Венгрыі дабіцца параўнальна высокіх вынікаў у развіцці чорнай металургіі, паступова нарошчваць магутнасці машынабудаўнічай і хімічнай прамысловасці, узняць да сусветных стандартаў прадукцыю фармакалогіі і, нарэшце, на самы высокі ўзровень паставіць вытворчасць тэкстылю і паперы.

Што ж датычыць развіцця харчовай прамысловасці, дык у гэтых адносінах вопыт ВНР вельмі і вельмі павучальны. Да нядаўняга часу венгерскі «мясны цэх» славіўся хіба што вэнджанай кілбасой «саламі», лепшай у свеце. (Дарэчы, яе і цяпер штогод экспартуюць да 5000 тон). За апошнія гады асартымент кілбас, кансерваў і вэнджаных прадуктаў значна пашыраны і асабліва ў гарадах Папа, Капашвар, Кешкемет, Сегет і, вядома ж, у Будапешце. Выраб сыроў — гэта традыцыйная галіна малочнай прамысловасці. Поспехі яе далёка вядомы за межамі Венгрыі. Самі венгерцы, калі гаворка заходзіць пра асартымент прадукцыі, з гонарам падкрэсліваюць, што яны «маюць магчымасць кожны тыдзень набываць сыр іншага гатунку». І, нарэшце, — венгерскае віно. Яго смак, колер, водар гавораць самі за сябе. Пра такайскае віно, напрыклад, шмат вякоў запар сцвярджаюць, што яно «віно каралёў і кароль вінаў». Літаральна два словы пра венгерскіх садоўнікаў і агароднікаў: штогод яны толькі экспартуюць каля 450 тысяч тон свежай садавіны і гародніны і больш 100 тысяч тон кансерваў. Хочацца падкрэсліць: толькі экспартуюць.

Цяпер самы час згадаць пра гандаль — адну з важнейшых галін народнай гаспадаркі Венгрыі. Адно знешні гандаль прыносіць ёй каля 40 працэнтаў нацыянальнага даходу. Многа гэта ці мала, мяркуйце самі: у Венгрыі жыве крыху больш за 10 мільёнаў чалавек, гэта значыць, усяго толькі 0,3 працэнта насельніцтва зямнога шара. А вось доля яе ўдзелу ў сусветным гандлі складае 0,8 працэнта. Знешнегандлёвы абарот, у разліку на душу насельніцтва, тут намнога большы, чым у Злучаных Штатах Амерыкі, у Японіі і шэрагу краін Заходняй Еўропы.

У чым прычына, дзе вытокі такіх высокіх паказчыкаў? У Венгрыі маецца шэраг спецыфічных дэмаграфічных, эканамічных і эканоміка-геаграфічных фактараў, якія — калі краіна хоча дабіцца хуткага грамадска-эканамічнага развіцця — прымушаюць яе да экспансіўнага знешняга гандлю. Прасцей кажучы, трэба вучыцца гандляваць. І Венгрыя вядзе рэгулярны гандаль больш чым са 100 краінамі свету. Дзве трэці яе імпарту ідзе з краін-членаў СЭУ, ім жа накіроўваецца каля 70 працэнтаў венгерскага экспарту.

Наглядным прыкладам сапраўды брацкіх сувязей могуць служыць адносіны з Савецкім Саюзам, буйнейшым знешнегандлёвым партнёрам Венгрыі. На долю нашай краіны прыходзіцца каля 35 працэнтаў усяго венгерскага знешнегандлёвага абароту.

— Вы цікавіцеся галоўнай крыніцай поспехаў нашай эканомікі? — перапытаў Золтан Водас. — Яна, перш за ўсё, у навукова-тэхнічным супрацоўніцтве з сацыялістычнымі краінамі, у сумесным развіцці асобных галін, усё большай спецыялізацыі вытворчасці і пашыранай кааперацыі. Усё гэта і ёсць самы надзейны падмурак усебаковага развіцця ў наш час. А для Венгрыі гэта — падмурак надзеі.

Канечне ж, з ім нельга не згадзіцца.

(Заканчэнне будзе).

Міхаіл Рыгоравіч ЛАРЧАНКА

31 ліпеня 1981 года памёр пісьменнік, доктар філалагічных навук, прафесар Міхаіл Рыгоравіч Ларчанка. У яго асобе беларуская філалогія страціла выдатнага даследчыка і педагога.

Міхась (Міхаіл Рыгоравіч) Ларчанка нарадзіўся 14 лістапада 1907 года ў вёсцы Хварасцяны Слаўгарадскага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і селяніна. Вучыўся ў Княжыцкай школе сялянскай моладзі, у Магілёўскім педагагічным тэхнікуме. У 1929 годзе паступіў на літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта, які скончыў датэрмінова, у 1932 годзе. З 1935 года, пасля заканчэння аспірантуры, Міхаіл Рыгоравіч Ларчанка працуе ў Інстытуце літаратуры і мастацтва Акадэміі навук БССР.

Член КПСС з 1941 года, М. Р. Ларчанка з пачатку Вялікай Айчыннай вайны знаходзіўся ў дзеючай арміі, удзельнічаў у баях на Бранскім фронце, улетку 1942 года быў цяжка паранены.

Міхаіл Рыгоравіч Ларчанка прымаў актыўны ўдзел у аднаўленні работы Беларускага дзяржаўнага універсітэта, які знаходзіўся ў эвакуацыі. На працягу многіх гадоў быў загадчыкам кафедры беларускай літаратуры і дэканам філалагічнага факультэта БДУ. Ён выхаваў вялікую плеяду беларускіх вучоных-філолагаў. Многія яго вучні паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі.

Міхаіл Рыгоравіч Ларчанка — вядомы беларускі крытык і літаратуразнавец. Яго пяру належаць манаграфіі, прысвечаныя значным праблемам развіцця беларускай літаратуры, яе сувязям з літаратурамі іншых славянскіх народаў. Ён аўтар і навуковы рэдактар некалькіх падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для ВНУ і школ.

За заслугі перад Радзімай М. Р. Ларчанка ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені і медалямі. Ён быў удастоены ганаровага звання заслужанага дзеяча навукі БССР.

Светлы вобраз Міхаіла Рыгоравіча Ларчанкі, выдатнага вучонага-філолага, выхавальніка моладзі назаўсёды застанецца ў памяці ўсіх, хто яго ведаў і працаваў побач з ім.

Саюз пісьменнікаў Беларусі
Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР
Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна

НАСТАЎНІК

Мы развіваліся з прафесарам Міхасём Рыгоравічам Ларчанкам, нашым незабыўным другам і настаўнікам. Многія пакаленні сённяшніх педагогаў-філолагаў, журналістаў, партыйных, савецкіх работнікаў мелі сваім настаўнікам Міхася Рыгоравіча. Бадай, ці не ўсе сённяшнія беларускія вучоныя-літаратуразнаўцы ў той ці іншай меры абавязаны Ларчанку, бо ён або кіраваў іх навуковай работай, або вучыў ва універсітэце, або падтрымаў як апанент ці член вучонага савета пры абароне дысертацыі.

Філфак БДУ імя У. І. Леніна — наш беларускі літаратурны інстытут, кузня творчых літаратурных кадраў. Галоўным кавалём у гэтай кузні быў таксама ён, нашы Міхась Рыгоравіч Ларчанка.

Ён займаў адміністрацыйныя пасады — доўгі час быў дэканам філалагічнага факультэта, загадваў кафедрай беларускай літаратуры БДУ, але падначаленым было з ім лёгка, добра працаваць. Чалавечнасць, дабрата былі прыроджанымі якасцямі яго душы, ішлі як бы з глыбіні яго натуры. Ён быў добры да нас усіх, зычыў усім нам поспехаў на жыццёвых сцежках, ніколі нікога з нас не зняважыў, не пакрыўдзіў неасцярожным, несправядлівым словам.

Нямала зрабіў ён для беларускага савецкага літаратуразнаўства, нямала сіл, намаганняў прыклаў, каб аднавіць несправядліва забытыя імёны, старонкі гісторыі беларускай літаратуры.

Ён сам збудаваў сабе помнік яшчэ пры жыцці. Гэты помнік—яго кнігі, навуковыя працы, яго больш чым паўвекавое служэнне беларускай савецкай літаратуры, і, нарэшце, многія, многія з нас, літаратуразнаўцаў, усе, хто вылецеў з яго шырокага рукава.

Іван НАВУМЕНКА.

жэй плынь выносіць на паверхню вады забітую электратокам рыбу. Над Нёманам гучыць пяшчотны жаночы галасок:

— Жора! Вот еще одна, подхватывай сачком!

На ямах глушаць толам і ўзрыўнымі пакетамі. У выніку гіне не толькі вялікая рыба, а самае страшнае, мільёны малькоў.

Уверх па Нёмане, нейкі з кіламетр ад вёскі, ёсць яма, якую мясцовыя жыхары называюць Панскай бухтай. Яна вельмі глыбокая. Калі і як яна стварылася, гэтая глыбіня на старыцы, ніхто не помніць. Каштоўнасць яе ў тым, што яна раўчуком злучана з Нёманам. І вось усе віды рыбы, кожная ў свой час, ідзе туды на нераст. Гэтым карыстаюцца мясцовыя рыбакі і ў час нерасту многа той рыбы знішчаюць. У дадатак, за лета злачынцы яшчэ некалькі разоў падарвуць гэтую яму. Пасля такога дзікунства адкуль брацца рыбе?

Мінулы год быў ураджайны на арэхі. Аднойчы ў жніўні іду я ў грыбы, а ў канцы вёскі ў двары сваёй маткі адзін «мінчанін» ужо перабірае арэхі: сядзіць на прызбе, ля яго мяшок з арэхамі і кошык, у які ён кідае ачышчаныя. Шалупінне не адстае, таму што арэх не спелы, і ён адкалуплівае яго нажом.

— Чаму ж ты не даў ім даспець? — пытаюся. — А то столькі знішчыў дабра. Усё роўна выкінеш.

— А што, вам шкада? Пазней і такіх не будзе, — адказаў ён.

— У лесе, дзе я праходзіў, многія арэшыны былі зламаныя, некаторыя нахінуты да зямлі так, што ім ніколі не ўзняцца.

Раней, гадоў дваццаць назад, усе жыхары вёскі забяспечвалі сябе на зіму журавінамі. Цяпер іх няма. Што, можа, прапалі? Не. Ёсць лес, ёсць журавінік. Але бяда ў тым, што вельмі «старанныя» жанчыны (свае і прыезджыя) выбіраюць іх да часу, яшчэ белымі, маўляў, — у пограбе дойдуць, а то не будзе. У склепе яны гніюць і добра, калі працэнтаў 10—15 іх, хоць не якасных, застанецца.

Чытач скажа: ды і мы падобнае ведаем, а якія ж твае прапановы, каб спыніць гэты рабунак прыроды? Каб па-сапраўднаму зберагчы прыроду, на маю думку, трэба, каб да гэтай справы больш эфектыўна падключылася міліцыя і каб браканьерства лічылася крымінальным злачынствам. У горадзе чалавек не там пяройдзе вуліцу — яго аштрафуюць, у лесе ж рабі што хочаш — ніхто, як правіла, слова не скажа.

Трэба заканадаўствам устанавіць па зонах навукова абгрунтаваныя сезоны збору ягад і арэхаў, а парушальнікаў прыцягваць да строгай адказнасці. Яшчэ. Інспектару, лесніку і дазорным з грамадскасці, усім, хто ўдзельнічаў у раскрыцці браканьерства, са спагнанай сумы штрафу выплочваць значны працэнт.

Далей. Праз кожныя 5—6 кіламетраў на рэках замацаваць месцы (ямы, старыцы), дзе забараніць лоўлю рыбы круглы год усімі відамі прылад. Назваць іх заказнікамі і ўзяць пад ахову дзяржавы.

Толькі цвёрдаю рукою на дзяржаўным узроўні пакуль яшчэ можна захаваць для нашчадкаў багацці нашай прыроды. Потым будзе позна.

Прыродныя багацці патрэбныя нам не толькі з матэрыяльнага пункту гледжання, але і для таго, каб выхоўваць у юнага пакалення любоў да роднага кута, каб усё жыццё помніў чалавек шырокія разлогі мурожных сенакосаў, усплёск бабра ля лазы, вячэрняе палыванне шчупакоў на плёсах, шчэбет ластавак, пералівы жаваранка ў небе, сустрэчу з палахлівым зайцам, цяністыя вербы на беразе і водар лясных бароў.

Усё гэта складае святое слова — Радзіма. Без гэтага разумення не можа быць сапраўднага грамадзяніна.

Я. КРАМКО,
пенсіянер.

Карэліцкі раён.

НАШЫ ГОСЦІ

НА ЭМАЦЫЯНАЛЬНАЙ ХВАЛІ

У САМЫЯ ГАРАЧЫЯ ДНІ, у перыяд летніх адпачынкаў, канцэртная зала Беларускай дзяржаўнай філармоніі прадаўжае напружана працаваць. З поспехам праходзяць канцэрты ў Культурным цэнтры, дзе вечарамі перад замежнымі гасцямі нашай сталіцы выступаюць Дзяржаўны ансамбль танца БССР, Дзяржаўны народны хор БССР, фальклорна-харэаграфічны ансамбль «Харошкі». Цікава прайшлі літаратурнай кіраўніком, чэхаславацкія музыканты з першых жа акордаў далі слухачам эмацыянальны зарад на ўвесь канцэрт. У п'есе «Пачынаем», напісанай вядучым трамбаністам аркестра М. Бартакам, уражліва і горача прагучалі імправізацыі Я. Гнілічкі (труба), Ф. Наўраціла (альтсаксафон), П. Крала (саксафон-тэнар), Й. Аўдэса (саксафон-барытон), М. Бартака (трамбон). Актыўна падтрымліваў салістаў увесь аркестр.

ныя канцэрты лаўрэата Усерасійскага конкурсу артыстаў-чытальнікаў В. Татарскага, які паказаў дзве праграмы — «Крах «Барбаросы» і «Я. Еўтушэнка. Выбранае». Аматары арганнай музыкі сустрэліся з Н. Аксентцян, дыпламантам Міжнароднага конкурсу В. Дзмітрэнка, а таксама з маладымі выканаўцамі — С. Суханавым і Л. Мельнікасам. Пабывалі ў нас нядаўна артысты з Чэхаславакіі — эстрадны аркестр пад кіраўніцтвам заслужанага дзеяча мастацтваў ЧССР Г. Брома і салісты Ц. Ленскі і Ф. Тарасіда-Андрэсічова.

Аркестр Густава Брома займае вядучае месца ў свеце джазавай музыкі і дастойна прадаўжае традыцыі лепшых біг-бэндаў, такіх, напрыклад, як аркестры Каунта Бэйзі, Ліанэля Хэмптана, Эрскіна Хокінса, Эрла Хайнса, Бэні Гудмэна, Бадзі Рыча, Дзюка Элінгтона, Вудзі Германа... Летась гэты калектыў адзначыў сваё 40-годдзе. Ён актыўна папулярызуе інструментальную музыку, захапляе аматараў джазавых і танцавальных твораў сваім высокапрафесійным выканаўчым майстэрствам і багаццем рэпертуару. У гэтым вялікая заслуга нязменнага мастацкага кіраўніка і дырыжора Густава Брома — таленавітага музыканта, чалавека, адданага сваёй справе.

...Патухла ў зале святло, успыхнулі пражэктары з каляровымі фільтрамі, і, зазіхацеўшы раструбамі саксафонаў, труб, трамбонаў, загучаў біг-бэнд. Магутным, экспрэсіўным гукам, вольным валоданнем верхнім рэгістрам здзіўляюць трубачы; чароўна гучаць гарманічныя педалі і сольныя пройгрышы групы саксафонаў; падкрэслена і сакавіта выконваюць кантрапункты трамбоны; энергічна вядуць за сабой увесь аркестр ударнікі. А на чале ўсіх — жыццярадасны, абаяльны і артыстычны Густаў Бром!

П'есай «Сігнал», напісанай ад музыканта залежыць поспех усіх. Асноўны «стымулятар» — ударнік, бо ён павінен увесь час падтрымліваць імправізуючых музыкантаў і ўвесь аркестр. І з гэтай задачай дастойна справіліся В. Ваўрда і В. Скала.

Джаз — калектыўная творчасць, дзе ад натхнення кожнага музыканта залежыць поспех усіх. Асноўны «стымулятар» — ударнік, бо ён павінен увесь час падтрымліваць імправізуючых музыкантаў і ўвесь аркестр. І з гэтай задачай дастойна справіліся В. Ваўрда і В. Скала.

Хачу адзначыць адметны штрых таленту музыкантаў аркестра — уменне рабіць цікавыя аранжыроўкі і ствараць свае кампазіцыі, разнастайныя па меладызме, багатыя па гарманічнай мове, з прыгожай фразіроўкай. Васьмёра кампазітараў аркестра, як правіла, самі выконваюць сольныя партыі ва ўласных творах. Зацікавіла слухачоў джазавая балада «Сон Томаса», напісаная Й. Аўдэсам. Ён прадэманстраваў дасканалае валоданне такім складаным інструментам, як саксафон-барытон. Многія выканаўцы на гэтым інструменце часам стараюцца абмінуць «нязручныя» месцы (вялікія фразы, віртуозныя імправізацыі, пасажы, якія вымагаюць ад музыканта вельмі вялікага расходу паветра). Для Й. Аўдэса, здавалася, не было ніякіх цяжкасцей у выкананні — мяккасць, гнуткасць гучання, добрая філіроўка гуку, пачатак фраз з невялікай адцяжкай ва ўступе, тонкая нюансіроўка ва ўсіх рэгістрах — усё гэта надавала хараставо яго кантыленне. А ў віртуознай кадэнцыі ўдала былі выкананы эфекты з актаўным клапанам. Запомнілася і танцавальная сюіта гітарыста І. Ваўрды «Квасар», эмацыянальнае сола ў якой выдатна выканаў П. Крал (саксафон-тэнар).

Цёпла прымалі мінчане выступленне выдатнага трубача, таленавітага кампазітара, цікавага аранжыроўшчыка Я. Гнілічкі. Яго сачыненне «У Татрах» было жывапіснай музычнай карцінай казачнай краіны скал, ледніковых азёр, стромкіх лясоў, дзе пануе дзівосная цішыня і толькі зрэдку грукочуць у гарах магутныя лавіны. Як бы «малюючы» такую велічную панараму прасторы і спакою, Я. Гнілічка лёгка выконваў кантыленнае сола на фоне цікага арпеджата электрапіяна і гітары.

Цікавае было і выступленне музыкантаў аркестра малым складам. Быццам спаборнічаючы ў майстэрстве імправізацыі, эмацыянальна і тэмпераментна выконвалі свае партыі ў блюзах і дыксілендах Й. Аўдэс (саксафон-барытон), Я. Гнілічка (труба), П. Крал (саксафон-тэнар), М. Бартак (трамбон), М. Відлак (электрапіяна, сінтэзатар). З вялікім натхненнем чэхаславацкія музыканты выконвалі джазавую класіку.

Свежай старонкай канцэрта былі выступленні з аркестрам спевакоў Ц. Ленскага і Ф. Тарасіда-Андрэсічовай.

— Прыемна, што наша чатырохмесячнае турнэ, у час якога мы паспяхова выступілі на Кубе, у Амерыцы, Новай Зеландыі, Аўстраліі, Сінгапуры, Канадзе, заканчваецца ў вашай краіне, — сказаў нам кіраўнік калектыву Густаў Бром. — Усюды мы сустракалі гасцінны прыём савецкіх людзей. У Мінску я са сваім аркестрам выступаю ўжо трэці раз — упершыню мы прыязджалі да вас у 1961 годзе, а затым у 1967-ым. І цяпер я пазнаў толькі плошчу імя Леніна, гасцініцу «Мінск», Ленінскі праспект. Горад значна вырас — мы з цікавасцю назіралі, як разгарнулася будаўніцтва Мінскага метро, як узводзяцца новыя высотныя будынкі — з'явіліся цэлыя сунасныя мікраёны. Але самае галоўнае — паўсюль нас сустракалі чулыя да музыкі і мастацтва, добрыя людзі. Сваімі канцэртамі ў Мінску мы таксама вельмі задаволены — на іх панавала поўнае ўзаемаразуменне і кантакт паміж артыстамі і слухачамі.

А. КАРАЦЕЕУ,
старшы рэдактар канцэртнай залы Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

На канцэрце аркестра Густава Брома ў Мінску. Фота Ул. КРУКА.

З дзевяці сонечных кругоў

Цыркавы сезон у Мінску сёлета адкрыла праграма «Рэйс «Дружба» 1981», якая знаёміць гледача з майстэрствам прадстаўнікоў дзевяці краін — Румыніі, Балгарыі, Венгрыі, Польшчы, Кубы, Чэхаславакіі, Манголіі, ГДР і Савецкага Саюза. Мінчане цёпла сустрэлі смелых, вынаходлівых, спрытных выканаўцаў нумароў розных цыркавых жанраў. Дасціпна знітоўваюць праграму клоўны Міхаіл Захараў і Ігар Паўлаў.

Дрэсіраваныя марскія львы Крысціны Левандоўскай (ПНР).

Дрэсіраваныя коні заслужанага артыста РСФСР А. Сакалова. Фота Ул. КРУКА.

На блакітным экране

ДРУГАЯ ПРАГРАМА

з 11 па 16 жніўня

11 жніўня, 19.20.

«ПІСЬМЕННІК І ПЯЦІГОДКА».

Выступае Уладзімір Ліпскі.

12 жніўня, 19.20.

«У ДОМСКАЙ КАНЦЭРТНАЙ ЗАЛЕ».

Праграма Латвійскага тэлебачання.

Прагучаць творы В. Моцарта, А. Разэці, латышскіх кампазітараў А. Калныня, М. Зарыня.

13 жніўня, 19.20.

«СЛОВА—ПАЭЗІІ».

Прагучаць новыя вершы Васіля Зуёнка.

14 жніўня, 19.20.

«СПЯВАЕ ЛЕАНІД ІВАШКОЎ».

У праграме канцэрта — песні і рамансы беларускіх кампазітараў.

14 жніўня, 22.40.

«СУСТРЭНЕМСЯ ПАСЛЯ АДЗІНАЦЦАЦІ».

У музычнай праграме выступяць папулярныя артысты эстрады А. Пугачова, Г. Бяседзіна і С. Тараненка, В. Лявонцьеў, вакальна-інструментальныя ансамблі «Сіняя птушка», «Арызонт», «Сябры», а таксама вакальны дуэт з ГДР — Моніка Хаўф і Дзітрых Хенклер.

15 жніўня, 11.00.

«СПЕКТР».

Тэлевізійны слайд-клуб.

15 жніўня, 12.35.

«ЛЕТАПІС НАРОДНАЙ СЛАВЫ».

Расказ пра гераічныя і працоўныя традыцыі працаўнікоў Ганцавіцкага раёна. Вядзе перадачу журналіст В. Праскураў.

15 жніўня, 19.25.

«ПРА МУЗЫКУ І МУЗЫКАНТАЎ».

Прагучыць «Струнны квартэт» І. Гайдна.

15 жніўня, 20.15.

«ПЕСНЯЙ ВІТАЮ».

Музычная праграма з удзелам калектываў мастацкай самадзейнасці Мінскага Палаца культуры чыгуначнікаў і калгаса «Новы быт» Мінскага раёна.

16 жніўня, 16.30.

«УСВЯЦКІЯ ШЛЕМАНОСЦЫ».

Спектакль Куйбышаўскага акадэмічнага тэатра драмы імя М. Горкага.

16 жніўня, 19.20.

«БЕЛАРУСКІЯ КАРЦІНКІ».

Іграе інструментальная група фальклорна-харэаграфічнага ансамбля «Харошкі».

16 жніўня, 20.15.

«ПА ВАШЫХ ПРОСЬБАХ».

Музычная праграма, прысвечаная Дню Паветранага Флоту СССР.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856
АТ 05934.

1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-19-85, аддзела грамадска-палітычнага жыцця — 33-19-65, аддзела прозы і паэзіі — 33-22-04, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-22-04, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 33-21-53, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33-22-04, аддзела культуры — 33-19-65, аддзела інфармацыі, пісем і масавай работы — 33-24-62, аддзела мастацкага афармлення і машынапіснага бюро — 33-44-04, фоталабараторыі — 33-24-62, выдавецтва — 23-52-85, бухгалтэрыі — 23-77-65, карэктарскай — 32-20-64.

Рэдакцыя прымае і разглядае празаічныя творы аб'ёмам не больш як друкаваны аркуш, артыкулы, нарысы—да 15 старонак, вершаваныя творы—не больш як 100 радкоў. Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Алесь ЖУК.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Ефрасіння БОНДАРАВА, Барыс БУР'ЯН, Мікола ГІЛЬ (намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Канстанцін ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Віктар КАВАЛЕНКА, Ігар ЛУЧАНОК, Уладзімір НЯФЁД, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Аляксей ПЫСІН, Міхаіл САВІЦКІ, Барыс САЧАНКА, Язэп СЕМЯЖОН, Юрый СЕМЯНЯКА.

Адказны сакратар Пятро СУШКО.